Жэтон на метро

Раман

Частка першая

НЕСПАКОЙНЫ ВЕЧАР

I

Бывае, тое, што здавалася вечным, прамільгне за адно чалавечае жыццё, а падзенне знічкі расцягнецца на тысячагоддзі; ад з'явы нібыта глабальнага маштабу з часам у гісторыі не застаецца і следу, і наадварот, якаясь драбяза, узніклая на пустым месцы, пакрысе пачынае павялічвацца, разрастацца, раскручвацца, уцягваючы ў сваю арбіту ўсё новых і новых людзей, заблытваючы іх,ператасоўваючы і прымушаючы рабіць самыя неверагодныя ўчынкі... Так думаў паэт Віктар Рак (псеўданім), які ў расшпіленай белай сарочцы, у шортах, з кубкам кавы ў адной руцэ і з тонкай цыгарэтай у другой стаяў на сваёй зашклёнай, шырокай і доўгай, амаль летні кабінет, лоджыі, каля расчыненай створкі вакна і пазіраў на нязвыкла ціхі дворык. Было тое сямнаццатага ліпеня дзве тысячы сямнаццатага года (амаль усе крымінальныя гісторыі пачынаюцца з пратакольнай даты, і гэтая не выключэнне), у пятніцу, у дзевяць вечара.

З вышыні шостага паверха відаць была лаўка каля пад'езда, рабіна з аранжавымі, рана паспелымі ягадамі, дзве дарослыя бярозы і дзве маленькія, падвязаныя да калкоў. Машын мала — людзі перад выхаднымі паз'язджалі ў вёскі і на дачы. На прастакутніку аўтастаянкі застыў у пакорлівым чаканні, на спушчаных колах, і яго, Рака,

старэнькі Volkswagen Passat, на якім ён даўно не ездзіў. Чорная дарожка асфальту коса перасякала зялёны газон, у канцы дзіцячай пляцоўкі, пустой цяпер, закручвалася правільнай дзявяткай, абгінаючы нерухомыя арэлі і пясочніцу з забытым ярка-чырвоным вядзерцам. Удзень быў дождж, пазбіваў з травы і з дрэў пылок, які цяпер жаўцеў уздоўж бардзюраў і каля ліўнёвак. Ад зямлі падымалася дрыготкая пара. Пахла вымытым лісцем і мокрай травой. Вечаровае сонца хоць і схавалася за суседні дом, але нават нябачнае — свяціла, і паветра было сіняватым, як лёгкі туман ці смуга.

У лоджыю ўляцеў ліпеньскі хрушчык і не мог знайсці расчыненую палавіну акна, біўся аб шкло, поўз угару і падаў зноў на падаконнік. Паэт лёгкімі пстрычкамі памог яму вылецець, прытушыў у бляшаначцы з вадой недакурак — ніколі ў жыцці нічога не выкінуў з балкона, нават скарыстанай запалкі, і, паціраючы рукі, прысеў за стол.

«А пара,— падумаў уголас,— даўно пара ўсур'ёз заняцца прозай!»

Усярэдзіне лоджыя была ўтульная, прасторная; пісьмовы стол, канапка, два крэслы — адно завалена кнігамі, у другое сеў паэт; на стале — лямпа, уключаны ноўтбук, з паўдзясятка гелевых рознакаляровых ручак і стос паперы— чыстай, беленькай, якая так і прасілася, каб хутчэй парушылі яе цноту. Паэт падняў над клавіятурай растапыраныя пальцы, як музыкант над клавішамі раяля...

Тут і ўдарыў ззаду з пакоя ў вушы званок. Стацыянарны тэлефон! Як ён на яго забыўся? Мабільны адключыў, а гэты — хто ім цяпер карыстаецца? Паэту захацелася заціснуць вушы. Як усе творчыя людзі, плюс адзінокія, ды ва ўросце (а было яму за сорак, лепш сказаць — пад пяцьдзясят, ці яшчэ больш дакладна — сорак восем), быў ён маладушны, меў слабыя нервы, да таго ж выдатна ведаў, што ад такіх званкоў — па стацыянарным, увечары перад выхаднымі — нічога добрага не бывае; менавіта такімі званкамі яму паведамлялі пра смерць маці, бацькі,

хроснай, пра хваробу стрыечнага брата,— гэта пры тым, што ў яго часта змяняліся нумары, і калі, напрыклад, трэба было паведаміць якую добрую навіну — ніхто не мог дазваніцца, але як толькі здаралася няшчасце, адразу знаходзіўся дабрадзей, ды не адзін, а некалькі, якія адшуквалі яго ў самых неверагодных месцах па любым тэлефоне, каб хутчэй выказаць спачуванне. Цяпер нібыта і не было адкуль чакаць непрыемнасцей — хоць бы таму, што ў яго больш нікога з блізкай радні не засталося, акрамя цёткі, што жыла дзесь каля Енакіева «на падкантрольнай Кіеву тэрыторыі», ды яшчэ больш далёкага сваяка, падпалкоўніка міліцыі ў адстаўцы, якога Рак не помніў нават па імені,— а ўмоўны рэфлекс застаўся.

Канечне, можна не браць трубку. Але потым стане сорамна. Цяжка будзе ўклініцца ў працэс. Пачнуцца ўпіканні самога сябе ў маладушшы.

А званок не сунімаўся! Рак асцярожна зірнуў на сіні экранчык. Нумар незнаёмы. Хутчэй за ўсё якісь нецярплівы аўтар. Трэба адказаць. Вырашыць усё ў пятніцу, бо такія дастануць з-пад зямлі, будуць званіць у суботу, у нядзелю, пакуль не сапсуюць выхадныя. Была яшчэ, праўда, надзея, што памыліліся нумарам. Ён падняў трубку.

— Слухаю вас,— сказаў строга, як у рэдакцыі адказваў аўтарам. Ледзь чутны, бы з таго свету, жаночы голас запытальна назваў яго імя і па бацьку. Ён не пазнаў голасу, але раптам захваляваўся.

— Так. Ён вас слухае.

— Гэта... Алена!

— Лена?

— Міхайлоўская!

Ён успомніў імгненна — далёкую вясну, выступленне ў нейкім паліграфічным каледжы, ці тады яшчэ тэхнікуме, цэлую актавую залу студэнтак-завочніц, і сярод іх адна, белая, поўненькая, з блізарукімі добрымі вачамі, не так прыгожая, як абаяльная, на якую ён увесь час любаваўся; ён і сам быў тады малады, адносна, канечне, трыццаць гадоў

роўна. Пасля выступлення падпісаў ёй кнігу, пазнаёміліся і пайшлі гуляць па вячэрнім, нагрэтым за дзень горадзе. Яна аказалася смяшлівай, без комплексаў, жартавала, што калі яны пажэняцца, яна возьме падвойнае прозвішча: як прыгожа будзе гучаць — Алена Рак-Міхайлоўская. А яму было не да жартаў. Ён крыху пабойваўся яе, такой маладой, а калі яна прызналася, што замужам («за чалавекам, якога не кахаю»,— хутка дадала яна), і не пражыла з мужам і года, першая думка была ўвогуле ад яе адвязацца. У той жа час ён разумеў, што надта спрыяльны момант, гэтая сустрэча, і каб пасля не давялося шкадаваць пра нявыкарыстаны шанц. А з іншага боку, яму не было куды яе весці. У трыццаць гадоў ён не меў кватэры, усё абяцалі, маўляў, дом на падыходзе, ды ўсё адкладвалі, і ён пакуль туліўся ў жанатага сябра. Між тым цямнела, загарэліся ліхтары, ён ліхаманкава думаў, як быць, але яна сама праявіла ініцыятыву — проста ўзяла яго за руку і павяла ў парк, дзе было на дзіва нешматлюдна, і там, у глухім кутку, куды не даставала святло ліхтара, яны адшукалі закрытую кустоўем лавачку, засыпаную чаромхавымі пялёсткамі (самога дрэва нідзе не было відаць), на якую прыселі, схаваліся, затаіліся, як школьнікі; як тады пахла чаромхай! якія цёплыя былі ў яе вусны! якое падатлівае, гарачае, маладое цела! — і неяк само сабой адбылося тое, што потым стала адным з самых светлых успамінаў у яго жыцці. Ён напісаў пра гэта верш, «Чаромхавы чад», паставіў у канцы дату, год, дзень, нават прыблізны час; верш неаднойчы перавыдаваўся ў зборніках, і кожны раз, праглядаючы яго, Рак згадваў сімпатычную Міхайлоўскую, усё чакаў, калі яна абзавецца (так яны дамовіліся — яна яго будзе шукаць, а не наадварот), чакаў пісьмаў і званкоў, а іх не было, яна знікла без следу і без знаку.

— Дык вы помніце мяне?

— Яшчэ як помню,— сказаў ён, зірнуўшы на кніжныя паліцы.— Дзе ж ты была столькі часу?

— А вы дзе былі? Як можна... мы правінцыялы ...куды нам... баялася парушыць... вы такі славуты...

— Дзе ты цяпер?

— Усё там! Жыву. Працую! — гучна гаварыла, амаль крычала Міхайлоўская. У трубцы нешта патрэсквала, папісквала.— Замуж вось выходжу!.. Дачка... амаль дарослая... клас!..

З-за кепскай сувязі яму пачулася не «клас», а ў «нас» — «дачка дарослая ў нас». Ён так усхваляваўся, што раптам стала горача вушам; і ўжо тым больш прапусціў пра замужжа. Не кожны дзень і не кожнаму мужчыну ў жыцці даводзіцца чуць падобнае.

— Колькі гадоў?

— Што?

— Колькі ёй гадоў? — закрычаў і ён.

— Сямнаццаць!

Ад хвалявання ў яго адбыўся нейкі збой у памяці. Ён падышоў да кніжнай паліцы (сонца сядала, апошні водбліск яго затрымаўся на шкле расчыненых балконных дзвярэй, і на імгненне Рак, як у люстэрку, убачыў там свой адбітак: падстрыжаная галава з кароткай чупрынкай, твар, знаёмы да кожнай зморшчынкі, кожнай радзімкі, зрэшты, даволі сімпатычны, калі б не вочы: пукатыя, як у рака, заўсёды здзіўленыя, а цяпер яшчэ і ўстрывожаныя). Кніжкі пасыпаліся долу. Ён пацягнуўся да верхняй паліцы, дзе стаялі некалькі новых зборнікаў з «Чаромхавым чадам» і дзе яшчэ вышэй, на самым ражку, вісеў на шаўковай нітцы, прадзетай у дзірачку, звычайны жэтон на метро цёмна-чырвонага колеру, прыцiснуў плячом трубку, каб вольнымі былі дзве рукі, выкалупнуў кніжку, адгарнуў старонку з вершам, паглядзеў на дату, дадаў дзевяць. І адразу на душы стала абыякава. Які танны шантаж. Навошта ж так.

— А павінна быць васямнаццаць,— глуха сказаў ён у трубку.

— Чаму?

— Калі, як ты сцвярджаеш, гэта наша дачка...

І прыкусіў язык. Толькі цяпер дайшло, што ён двойчы за хвіліну ўмудрыўся даць маху. Яна зразумела яго.

— Так,— сказала яна ціха.— Усё правільна. Нашай было б васямнаццаць... магло быць.

Ён ветліва-халодным, амаль афіцыйным тонам папрасіў прабачэння за кепскую сувязь і далей слухаў, не перабіваючы. Даведаўся ён, што яна па-ранейшаму працуе ў раёнцы тэхрэдам, была замужам, развялася, муж-раўнівец кінуў яе з малой, дачку гадавала адна, і вось яна вырасла, скончыла школу, ледзь хапіла балаў на журфак, але там яшчэ ўнутраныя экзамены і творчы конкурс у два этапы: сачыненне і «дэманстрацыя навыкаў рэдагавання тэксту», як выказалася Міхайлоўская.

— Ад гэтага будзе залежаць, на бюджэт ці на платнае. Або ўвогуле на філфак. І ну зусім няма каму памагчы!

«Вы толькі і ўспамінаеце, калі вам нешта трэба»,— падумаў Рак. Кепская сувязь, гэты то блізкі, то далёкі, то звонкі, то глухі, быццам з таго свету, голас, гэтыя яе амаль плаксівыя інтанацыі,— усё пачынала яго крыху раздражняць.

— Хоць парайце што-небудзь!

Моршчачыся, адводзячы трубку ад вуха, ён вяла паспрабаваў адхрысціцца:

— Дык у чым праблема? У крайнім выпадку хай платнае.

— Платнае для багатых. На платнае да трох тысяч. У год.

— Даляраў?! — ахнуў ён, на гэты раз хутка памножыўшы тры на чатыры.

— На філфак, канечне, менш...

— Дванаццаць тысяч! Але што я магу? Ды і хіба гэта робіцца так хутка? Дзе ж ты... вы раней былі?

— Баялася. Вы такая славутасць,— па другім крузе пайшла яна.— Можа, як-небудзь... мы ж не чужыя людзі...

— Я ніколі ў жыцці гэтым не займаўся.

— Хоць дайце надзею! А калі б гэта была наша дачка? Тады знайшлося б выйсце?

Ён сказаў:

— Паспрабую, але не абяцаю.

— Які вы добры! Я ведала, што вы паможаце!

— Ніякіх гарантый,— паўтарыў ён і, каб хутчэй скончыць: — Тады — да пабачэння?

— Не-не,— спахапілася яна, успомніўшы, што хоць з ветлівасці павінна і ім пацікавіцца.— А самі як? Усё адзін?

Настала яго чарга хоць коратка паспавядацца. Так, адзін, жаніцца не паспеў, доўга не было кватэры, а потым, калі яна з'явілася, не было з кім, больш не падыходзілі на выступленнях маладыя дзяўчаты, а пасля і сама жаніцьба стала нейкай не моднай,— наадварот, пачало лічыцца, што сапраўдны творца павінен быць заручаны толькі з Літаратурай, каб аддаваць усяго сябе творчасці,— словам, было позна.

— Так і жыву, працую ў рэдакцыі ў аддзеле паэзіі, зорак з неба не хапаю, але жыццём задаволены, цаню сваю творчую свабоду... Ну, да пабачэння?

Але Міхайлоўская ўсё адцягвала: «Дзякую, дзякую, што б я без вас рабіла, вы такі ж добры, як і быў!» Зноў ён сказаў: «Да пабачэння?» — і зноў яна: — «Дык, значыць, можна спадзявацца? Можна вам званіць?»

І так некалькі разоў. Калі нарэшце ў трубцы пачулася піканне, Рак з прыкрасцю паглядзеў на стос чыстай паперы, на ноўтбук, дзе даўно ўключыўся рэжым чакання і патух манітор. Засяроджана пасвістваючы, ён дацягнуўся да ражка паліцы, зняў жэтон, пакруціў на пальцы, павесіў назад, выйшаў на лоджыю. У двары ужо амаль сцямнела. Ён узіраўся ў сінаватыя прыцемкі і думаў: цікава, чаму ён і праўда як бы за нешта адчувае віну?

І тут зноў ударыў ззаду званок. Уся яго вінаватасць знікла без следу. Ён падумаў на Міхайлоўскую: вось людзі, дай палец, кусаюць па локаць! Да яго не адразу дайшло, што гэта не тэлефон, а звоняць у дзверы. Асцярожна, не ўключаючы святло, ён прабраўся ў калідор, заглянуў у «вочка» — і ўбачыў суседа, які жыў праз вуліцу, старога Самусенку, і пачуў яго гучны басавіты голас:

— Відчыняй, бісаў сын! Я цябе бачыў толькі што на лоджыі!

II

Некалі даўно гэты Самусенка, Анатоль Фядосавіч яго звалі, выкладаў у іх ва ўніверсітэце старажытную, класічную і сучасную беларускую літаратуру, быў ненамнога старэйшы за студэнтаў, сімпатычны, строгі, высокі ростам; пра яго ведалі, што жанаты, мае сына і дачушку, а таксама, што ён аўтар нейкай надзвычай смелай дысертацыі ці манаграфіі, якую, праўда, ніхто са студэнтаў не чытаў. У Рака засталося ў памяці, як Самусенка хутка заходзіць у аўдыторыю — ад паветранага струменя варушыліся старонкі канспектаў на першых партах, і адразу, яшчэ не дайшоўшы да кафедры, пачынае чытаць па памяці:

З-за рэчкі ціснуцца каровы.
Ідзе наперадзе Красуля,
за ёю Лысая, Рагуля
ды дзве пярэзімкі-цялушкі
ідуць у згодзе, як дзве дружкі;
а збоку чмыша бык Мікіта,
хвастом матаючы сярдзіта...

— І гэта ўсяго адна «бедная» беларуская сям'я! — казаў іранічна і чамусьці сярдзіта, як той бык, Самусенка.— Палічыце, і зразумееце, што гаротнасць нашага сялянства моцна перабольшана.

Аднак акрамя гэтай каронкі — цытаты з «Новай зямлі» — на яго занятках панаваў сум. Лекцыі былі сухія. Ад манатоннага, крыху ў нос, голасу ўсе ўпадалі ў санлівасць. Затое на семінарах і іспытах рэзаў ён бязбожна, рабіўся яршысты, уедлівы: не пытаў, а дапытваў; студэнты ад страху называлі яго і Фядос Анатольевіч, і Анатоль Самусеевіч, і нават Майсей Фядосавіч, але ён не папраўляў — каб толькі такія хібы былі ў студэнтаў.

І вось так атрымалася, што ім, былому студэнту і былому выкладчыку, выпала жыць у суседніх дамах.

— Свет цесны,— жартаваў Самусенка,— Беларусь удвая, а Мінск утрая.

Як часта бывае ў мегаполісе, жывучы побач, яны амаль не сустракаліся. Рак ведаў, што Самусенка даўно на пенсіі, дзеці выгадаваліся, дачка-журналістка выйшла замуж за француза і жыла ў Парыжы, затое сын Юра — бацькоўскае гора, шалапут, байкер з банданаю, нідзе не прыткнуты, і чамусьці з гэтым Юркам Рак перасякаўся куды часцей, чым з яго бацькам. Юра неаднойчы заходзіў да Рака і, апусціўшы вочы, прасіў пазычыць грошы. Інтэлігентны, далікатны, мяккі Рак не мог яму адмовіць; між тым байкер, асмялеўшы, рабіўся ўсё больш нахабным, пачаў не проста прасіць, а патрабаваць,— тады толькі паэт парваў з ім адносіны, а неўзабаве даведаўся, што Юра загінуў, разбіўся на матацыкле. Яшчэ праз год адышла ў лепшы свет Самусенкава жонка. Калі-нікалі здалёк Рак бачыў стулены прывід у франтаватым французскім паліто, а потым знік і ён. Ці то з'ехаў да дачкі ў Парыж, ці перабраўся на дачу, ці мо («грэшнай справаю», думаў Рак) проста памёр. Аж недзе з паўгода назад Самусенка аб'явіўся жывы-здаровы, больш за тое — раптам успомніў пра былога студэнта і панадзіўся хадзіць да яго ў госці.

Рак даўно не бачыў яго, і цяпер быў уражаны, наколькі гады могуць змяняць чалавека. Самусенка нават паменеў ростам, як бы стаптаўся ці як бы зверху ціснуў на яго горб; нос агурком, як у пажылога армяніна, адцягнутыя ўніз вочы-слівы, сівыя рэдкія валасы, мох на вушах, рабацінне на твары не толькі вясной, а ўжо заўсёды. Затое характарам змяніўся мала; у свае семдзесят энергічны, задзірысты, часам нават хамаваты, ён злоўжываў гасціннасцю былога студэнта, пазіраў на яго зверху ўніз, быў упэўнены, што менавіта ён, Самусенка, узгадаваў цэлую плеяду талентаў, у тым ліку і Рака, і што Рак яму да канца жыцця за гэта абавязаны.

Ён бесцырымонна ўвальваўся ва ўтульную кватэрку, якую ахайны гаспадар трымаў у ідэальным парадку;

ніколі не пытаючы дазволу, не цікавячыся, ці ёсць у гаспадара вольны час, настрой, жаданне, ён даставаў папку і пачынаў знаёміць Рака з новымі раздзеламі сваёй манаграфіі. Ён працаваў над другой яе часткай, і яму патрэбны былі слухачы. Акрамя жадання паслухаць заўвагі (у сэнсе, пахвальбу), ён меў і больш дальнія планы — спадзяваўся пры дапамозе Рака надрукавацца.

— Свая людына ў рэдакцыі! Мо паможаш,— з лёгкай шапялявасцю ад устаўных метала-керамічных зубоў казаў ён.

Манаграфія была нейкай бясконцай. Ветлівы, бязвольны, далікатны паэт вымушаны быў асалавела слухаць. У яго не хапала смеласці сказаць жваваму дзеду, што ён і без таго наядаецца рукапісамі ў рэдакцыі, стаміўся і проста хоча адпачыць. Калі-небудзь Самусенка, як ён тлумачыў — «для разрадкі», прыносіў шахматы або карты. У карты ён гуляў яшчэ сяк-так, у шахматы зусім няважна, кампенсуючы слабую гульню эмацыйнымі каментарамі. Ферзя называў каралеваю, слана — афіцэрам, ладдзю — турой або пушкай, замест ракіроўкі казаў — лакіроўка, замест шаха — шаховіч ці шахавенка. Іхнія дыялогі нагадвалі гогалеўскія.

— Дзе ты так у шахматы навучыўся, сам ці памагалі? — абавязкова ў пачатку пытаў Самусенка. А потым цягнуў: — Та-ак... т-э-кс... Шо він робліць, от нярускі... (Нярускімі ён называў усіх, хто не беларусы.)

Рак, ціха, пад нос:

— Канечне, не рускі, я беларускі.

— Шо він робліць, от нярускі...

— Канечне, не рускі, я беларускі. Ракіроўка праз бітае поле не робіцца... Добра, рабіце.

— Шо він, нярускі, робліць... Пачакай, я назад забяру ход... Дзе стаяла? тут? Я пастаўлю там...

Задумваючыся над ходам, Самусенка ссупліваў бровы — так, што выпіналі надброўныя дугі, і Рак, спадцішка на яго пазіркваючы, пачынаў верыць, што чалавек сапраўды пайшоў ад малпы.

— Што ж вы мне тут падрыхтавалі,— казаў ён,— якую пастку?

— Цэ мае сабачэ дзіло,— лагодна адказваў Самусенка. Жарты ў яго былі цяжкія; акрамя звычкі ўплятаць украінізмы, было ў яго яшчэ любімае, на ўсе выпадкі слоўка, якое асабліва раздражняла Рака,— гэта слова «памаглі». Дзе б што і з кім ні здаралася, ад побытавай непрыемнасці да глабальнага стыхійнага бедства, Самусенка, калі з намёкам, калі з хітрынкай і паніжаючы голас, але заўсёды ўпэўнена, канстатаваў: «Памаглі!»

«Самалёт разбіўся, чулі?»

«Не сам — памаглі».

«Цунамі ў Японіі...»

«Памаглі»,— адмахваўся Самусенка.

«Ну як ужо тут маглі памагчы?» — не вытрымліваў Рак.

«Экалагічны баланс парушылі».

Але яшчэ горш, чым карты, шахматы і чытанне манаграфіі было, калі Самусенка прыносіў пляшку самагонкі ці віскі, настройваўся на лірычны лад і хацеў, нават патрабаваў ад Рака шчырай бяседы. Тады для сціплага, сарамлівага, летуценнага паэта пачыналася проста кара егіпецкая. Па-першае, Самусенка быў пераборлівы ў плане закускі, любіў усё, як ён казаў, «вясковае, простае, сапраўднае», менавіта — сала з часнаком і цыбуляй, салёны гурок, яечню на шкварках,— акурат усё тое, чаго далікатны Рак цярпець не мог. «Я не апускаюся да таго, каб у кавярню хадзіць, мне хапае грошы на сваё, натуральнае,— казаў з гонарам Самусенка.— Я абы-чаго есці не буду. Ты мне па-простаму падсмаж пяльменяў з яечняй,— казаў ён,— а не амлет з беконам, ці як у той раз, памятаеш? — кітайскай локшыны з крэветкамі і мідыямі, прыдумаць жа такое!»

Калі-небудзь ён прыносіў загорнуты ў ліст А4 кавалачак белага ці прысыпанага чырвоным перцам вэнджанага сала, нюхаў і цмокаў языком: ах, які водар! на альховых дровах! сала з маёй малой радзімы, землякі з Ельска прывозяць, прадаюць каля Еўраопта,— прымушаў Рака

пакаштаваць, і калі той праз сілу з'ядаў скрылёк, пачынаў чапляцца: «Як можна мужчыну, беларусу, не любіць сала? Ці рэлігія не дазваляе?» Па-другое, варта было яму выпіць, як у яго зусім развязваўся язык і ён пачынаў даставаць Рака больш вытанчана.

— Узяць хоць бы мяне. Вялікая кватэра, была жонка, быў сын, ёсць дачка, і зяць, і ўнучка... А ты! Ні жук, ні рак — а так. Адзін, з музай у беднай спаднічцы... Зрэшты, у мяне падазрэнне, што ты... сам ведаеш. Не той арыентацыі. Усе вы такія — паэты, мастакі, візажысты, стылісты.

Рак панура маўчаў — супраць хамства няма зброі, і толькі зрэдку рабіў слабыя спробы абараніцца: стараючыся таксама гаварыць з іроніяй, казаў, што яго дзеці — у кожным горадзе, дзе ён бываў у камандзіроўках і на выступленнях. Самусенка дабрадушна пасмейваўся:

— Расказвай. Ведаем мы вас, нетрадыцыйных.

— Уявіце сабе...

— Гэта мы ўжо чулі. І спрытныя ж вы на такія штукі! Адкуль што бярэцца? Самі вучыцеся ці памагаюць?

— Не хачу больш з вамі мець...

— Добра, не крыўдуй, веру, веру.

Зрэшты, трэба аддаць яму належнае, ён усё ж неяк адчуваў мяжу і палку стараўся не перагінаць, змяняў тон, прасіў прабачэння, пачынаў хваліць паэта, чытаў на памяць яго вершы, абяцаў уключыць іх у сваю манаграфію,— і добры бяскрыўдны Рак адтайваў. Пасля заднім розумам пакутліва думаў, якую ж яму вынайсці абарону, успамінаў свае палюбоўныя раманы (усе яны былі нейкія несур'ёзныя), даставаў з шуфлядкі і гартаў стары нататнічак з тэлефоннымі нумарамі, якіх даўно не існавала, з жаночымі прозвішчамі, якія даўно былі заменены на мужавыя. Неяк вясной, у красавіку, Самусенка прыйшоў да яго з папкай, але замест манаграфіі дастаў з яе нейкія раздрукаваныя аркушы.

— Што ў мяне ёсць для цябе! — ён са змоўніцкім выглядам хіхікаў, паціраў рукі і нават, разгуляўшыся, даволі

балюча ўшчыкнуў Рака за бок.— Каб пасля не казаў, што твой стары выкладчык паганы. Нават не ведаю, чым ты мне аддзячыш.

— Што гэта?

— Падпрацоўка. Ты казаў, хочаш падзарабіць, дык вось табе — выпраўляй русізмы. Знайдзі такое цяпер. Лаві момант, а то жадаючых многа.

— Чыё гэта?

— Якая розніца. Адзін багаты чалавек.

— Ды хто, прозвішча можна сказаць?

— Якая розніца. Ну, Літаў. Так, рускі. Але я за аднаго такога рускага дванаццаць нашых не аддам. Я ў яго быў на віле... Які дом! Умеюць жыць людзі,— Самусенка зацмокаў языком і яшчэ больш стаў падобны на старога армяніна.— Дом, басейн, сад, прыслуга... Умеюць, умеюць жыць.

— Колькі яму гадоў?

— Якая розніца. Твайго веку.

— Пад пяцьдзясят? І толькі пачынае пісаць? Чаму я першы раз пра яго чую?

— Ён не так даўно піша,— махнуў рукой кудысь удалечыню Самусенка,— як толькі пераехаў у Беларусь, тры гады ўсяго.

Рак недаверліва ўзяў раздрукаваныя лісты. Адразу выскачыла, кінулася ў вочы: XII стагоддзе, XV стагоддзе... Ягайла-Скіргайла, Кейстут-Міндоўг...

— Гісторыя? — усклікнуў Рак. Ён нікому не прызнаваўся, але варта было яму ўбачыць рымскія лічбы стагоддзяў, назвы бітваў, імёны князёў і каралёў, як на яго находзіла нейкае здранцвенне. Ён прызнаваў толькі ролю літаратуры ў станаўленні і развіцці нацыі, а ўсе гэтыя тэксты, гэтак званую гісторыю (ды яшчэ беларускую гісторыю, у якой сам Саламон не разбярэцца), лічыў кампіляцыяй з іншых кампіляцый, перапісваннем рознымі аўтарамі аднаго і таго ж тэксту, які пры жаданні можна было адшукаць у самай элементарнай Вікіпедыі.

— Не,— сказаў ён.— Я не гісторык.

— Прычым тут гісторыя? Проста механічнае рэдагаванне, тут не трэба гісторыя.

— Вось што я вам скажу, яшчэ не чытаючы: графаманія! І не думайце, калі ласка, што гэта ўмоўнасць, гэта рэальная хвароба з усімі сімптомамі.

— Не гарачыся. Яшчэ не глянуў, а ўжо гарачышся.

— Я ведаю гэты тып дылетантаў-іншародцаў, для іх усё экзотыка, іх «адкрыцці» — што Якуб Колас і Янка Купала несапраўдныя імёны, або што гістарычная Літва і цяперашняя — дзве вялікія розніцы. Ды хто ён па прафесіі, кім працуе?

— Якая розніца. Нешта звязанае з лесам.

— Так я і ведаў.

— Ну, а калі б ён быў прафесійны гісторык, ты б узяўся? Ну, не хочаш яму, памажы мне. Мяне разгрузі.

— Вас?

— А я табе калі-небудзь памагу.

Пабачыўшы, што Рак завагаўся, Самусенка паднаціснуў, пачаў угаворваць, нарэшце, як апошні аргумент, хутка, нібы баючыся, каб Рак не перадумаў, напісаў зверху на паперчыне суму.

— За адзін аркуш, чатырнаццатым шрыфтам праз паўтара інтэрвалы, а ў кнізе такіх аркушаў мінімум дзесяць.

Рак не паверыў вачам, па мясцовых мерках сума была проста неверагодная. Гэтым не скончылася; Самусенка дастаў некалькі сініх купюр еўра, паклаў на стол і прыціснуў далонню.

— Лічы гэта як ганарар за тваю геніяльную паэзію.

Ведаў, што сказаць. За апошнія гады, а, калі шчыра, дык і за ўсё жыццё Рак не атрымаў ніводнай нармальнай грашовай прэміі (усе былі, як сам ён іранічна казаў, «безалкагольныя», што значыла — безграшовыя), ніводнага больш-менш прыстойнага ганарару, за які можна было б што-небудзь людскае набыць: машыну, кватэру, ці з'ездзіць у замежнае турнэ, ці нават проста ў адпачынак; ён толькі і быў некалі на возеры Рыца ў Абхазіі, ды яшчэ

адзін раз за мяжой, у Мадрыдзе, і то неафіцыйна, не па пісьменніцкай лініі, а па прыватным запрашэнні знаёмага ўкраінца, які там працаваў і жыў.

— Хіба глянуць. Нічога не абяцаю.

Ён, загадзя пераадольваючы непрыязь да гэтага Літава, узяўся за тэкст. Там быў намешаны боб з гарохам і божы дар з яечняю. Усё сабрана са свету па нітцы, дзе садрана з інтэрнэта, дзе са школьнага падручніка, з наіўнымі тлумачэннямі і выкладкамі. Акрамя таго Раку, які кожны радок выношваў тыднямі (каб пасля яго выкрасліць), асабліва непрыемна было, што гэты Літаў нават на сваёй роднай рускай мове кідаецца словамі як папала, направа і налева, нібы венікам мяце. Рак перакладаў, правіў і з сорамам бачыў, што пасля яго рэдактуры атрымліваецца яшчэ горш, чым у арыгінале,— а таму быў нямала здзіўлены, калі пасля першай порцыі перакладу Самусенка, які ўзяў на сябе ролю пасярэдніка, аб'явіў, паціраючы рукі, што Літаву страшэнна спадабалася і ён гарыць жаданнем са сваім рэдактарам пазнаёміцца.

— Паглядзіш, які цікавы чалавек. Ну што ты за ламака. Табе трэба ведаць жыццё, быць з народам, бо што ты бачыш, ад чаго ты бярэш творчую энергію — ад разеткі?

Рак як мог аднекваўся, абяцаў і адцягваў, як раптам у канцы вясны гэты Літаў сам да яго заявіўся. Невысокі мацачок, прыкладна аднаго з Ракам веку, у светлым ільняным касцюме, які сядзеў на Літаве як уліты, у моднай, белай без гальштука кашулі, жвавы і пругкі — здавалася, калі пастукаць зверху па лысінцы, ён пачне адскокваць ад падлогі, як мячык. Адразу было відаць, што чалавек глядзіць сябе, займаецца спортам і, у адрозненне ад, напрыклад, баязлівага Рака, які звяртаўся да дактароў у самым крайнім выпадку, гэты карыстаецца лепшымі медыцынскімі паслугамі, якія можа дазволіць сабе багаты. Першае, што Літаў сказаў:

— Прабачце, пакуль не ў дастатковай ступені валодаю моваю,— а наступны за гэтым сказ быў такі: — Як вы лічыце, хто лепшы пісьменнік у Беларусі?

Рак уважліва на яго паглядзеў і прамаўчаў.

— А-а, цяжка! Усе творцы, у каго ні пытаю, не могуць адказаць. Ведаеце, чаму? Кожны ў душы лічыць, што ён лепшы.

Ён засмяяўся, паказаўшы два буйныя пярэднія зубы з шчылінкай паміж імі. Далей гэты Літаў нагаварыў кучу кампліментаў, якіх Рак у жыцці не чуў, прызнаваў сваё дылетанцтва, прыніжаў сябе, а Рака і асабліва Самусенку, якога не было тут, узносіў да нябёс; спытаў чамусьці, як Рак ставіцца да кнігі Маўра «Палескія рабінзоны», на развітанне папрасіў падараваць яму кніжку. Пацягнуўшыся да паліцы, Рак зачапіў жэтон, той упаў на падлогу, закаціўся пад шафу. Літаў падняў; толькі і паспеў заўважыць выяву плошчы Якуба Коласа на аверсе, як Рак хутка забраў жэтон і павесіў назад.

— Цікавая рэч,— крыху сумеўшыся ад такога яго рэзкага руху, сказаў Літаў.

Рак адказаў, што нічога цікавага: некалі ў яго была каханая дзяўчына, я правёў яе, назад хацеў ехаць на метро, купіў жэтон, але пайшоў пешкі, а жэтон пакінуў на памяць. А пасля высветлілася, што гэта незвычайны жэтон, выпушчаны да дваццацігоддзя мінскага метро; такіх усяго восем, па ліку першых васьмі станцый.

— Пакуль у мяне адзін, але я не губляю надзеі сабраць яшчэ сем. Праўда, іх з кожным годам становіцца ўсё менш, сціраюцца, губляюцца, выводзяцца з ужытку, ды і калекцыянеры ў шапку не спяць...

— Дазвольце даць вам параду,— фамільярна перабіў Літаў.— Гэта проста: трэба даць абвестку на «Куфры» ці на «Ау».

— Шкада часу.

— Тады я прашу вашага дазволу самому гэта зрабіць. Будзе вам маленькі прэзент.

— Не, дзякуй. Не трэба лішніх клопатаў ні мне, ні вам.

Пабыў ён мала і Раку не спадабаўся.

— Дзе вы яго адкапалі? — пытаў ён потым у Самусенкі.

— А што?

— Слізкі ён нейкі... І гэты зачын, «прабачце, што пакуль не валодаю мовай у дастатковай ступені». Я сустракаў многа людзей, якія пачыналі, як Літаў, але ні разу не бачыў ніводнага, які б сваю абяцанку выканаў. Гэта проста анекдот, пароль, апазнавальны знак: як толькі чалавек папросіць прабачэння, што «пакуль не валодае», ён ніколі не авалодвае.

— Цэ творча людына!

— Падазроны нейкі.

— Дык кожны чалавек падазроны. Калі паставіць мэту — у кожнай шафе знойдзеш па шкілету,— у рыфму сказаў Самусенка.— Думаеш, мы з табой для кагосьці не падазроныя?

Рак неяк дзіўна на яго зірнуў; Самусенка не заўважыў гэтага.

— Ды і не надта веру я гэтым дабрадзеям з усходу,— сказаў Рак.

— А дзе ўзяць лепшых? У нас што, ёсць выбар? Каму мы трэба тут? Хто намі цікавіцца? Дзе нашы чытачы, наша дзяржава? Хто дае, да таго і хілімся. Ва ўсе часы былі мецэнаты. Я хачу каб ты адно зразумеў, дзівак-чалавек, рэдактура гэта так, ні пра што, толькі пачатак, праверка нас — мы яму для іншага патрэбны.

— Ды для чаго?

— Якая розніца? Пажывем — пабачым.

III

Цяпер Самусенка стаяў за дзвярамі, званіў, пастукваў і прасіўся:

— Відчыняй! Я ведаю, ты дома!

Упускаючы яго, Рак падумаў, што, мабыць, упершыню за паўгода гэты прыход дарэчы. «Я памог яму, а цяпер хай ён мне памагае». Да таго ж цяпер, пасля званка Міхайлоўскай, будзе чым яго крыць, калі ён завядзе сваю

песню пра нетрадыцыйную арыентацыю. Сёння Самусенка быў з пустымі рукамі, на прапанову прысесці не звярнуў увагі, аб'явіў, што на хвілінку і па даручэнні «нашага Літвінчыка», які толькі што яму званіў, «папрасіў забегчы да цябе і папярэдзіць: у нядзелю ў яго фуршэт, у васямнаццаць нуль-нуль, дык каб быў, як штык».

— Дрэс-код любы, фракі і смокінгі неабавязковыя,— нясмешна пажартаваў Самусенка.

— Пачакайце, які фуршэт, смокінг... Чаму ён сам не патэлефануе?

— А табе можна? Мабільны адключаны, гарадскі заняты.

— У прынцыпе, у мяне былі свае планы.

— Не выдумляй. Хоць паглядзіш, як людзі жывуць.— Самусенка азірнуўся, нібы хацеў пераканацца, што іх ніхто не падслухоўвае, шапнуў па-змоўніцку: — Скончылася наша чаканне! Нарэшце даведаемся, што ён ад нас хоча.

— Ну, я асабіста нічога і не чакаў.

Самусенка быў як на іголках, то парываўся ісці, то марудзіў. Рак вырашыў, што цяпер самы момант, і будзённым, амаль абыякавым голасам паведаміў, што ў яго нечакана адшукалася дачка. «Некалі была каханая дзяўчына, ну і вось — вынік...»

— Мога буты,— толькі і прамармытаў Самусенка, пайшоў да дзвярэй, тады спыніўся і падняў указальны палец.— Успомніў! Яшчэ Літвінчык прасіў персанальна перадаць, што цябе чакае вельмі прыемны сюрпрыз. Будзеш задаволены… Вялікая? Дачка?

— Скончыла школу, паступае на журфак.

— І, я так разумею, цяпер ты павінен памагаць ёй? А помніш, як адмахваўся, не хацеў брацца за рэдактуру?

— Пачакайце!

Бачачы, што стары спяшаецца, Рак сам загаварыў хутка; патлумачыў: ёй трэба прайсці творчы конкурс, ад яго многа залежыць, «дык мо паможаце па старых каналах?»

— Якія каналы,— сказаў Самусенка.— Цяпер заплаці ды вучыся спакойна. Так, па-мойму, сама лепш.

— Лёгка сказаць — заплаці.

— Добра, пазней пагаворым. Пабягу, зараз Літвінчык павінен званіць,— стрымана пахваліўся Самусенка.— Хоча пазнаёміцца з новымі старонкамі манаграфіі. Мо давядзецца ехаць да яго, на ноч гледзячы. Пабягу!

Надзвычай хутка для свайго ўзросту ён выслізнуў з кватэры, а Рак зноў выйшаў на лоджыю. Пра тое, каб спакойна пісаць, не магло быць і гаворкі. Вось яшчэ набыў клопату. «Чаму я ніколі ні ў кога нічога не прашу?»

Ён рана лёг у ложак. Які мітуслівы вечар. Ды і ўвогуле апошнія паўгода.

Яшчэ гэты фуршэт. Нікуды не пайду. Ці схадзіць? Не спалася. «Трэба, трэба ўсур'ёз заняцца прозай»,— праз дрымоту думаў ён. І напісаць раман, прыблізна такі: вось званок, і пазашлюбная дачка прыязджае, і герой бачыць у ёй рысы былога кахання... Не, лепш не дачка, а проста дзяўчына, а ў яго, Рака, няма месца, і яна пасяляецца кватаранткай у аднаго багатага, сквапнага старога, у якога дачка замужам за французам у Парыжы... Глабалізацыя... Раней беларускія дзяўчаты замуж максімум у суседнюю вёску выходзілі, а цяпер па ўсім свеце...

Рак павярнуўся на другі бок — і тут зноў разарваў цішыню тэлефон. Трэці званок за вечар! Рак схапіў трубку. Незнаёмы жаночы голас, даволі прыемны, але ўсхваляваны і, як падалося Раку, з прыбалтыйскім акцэнтам, менавіта — з латышскім; у мужчын-латышоў ён амаль адсутнічае, а ў жанчын моцны.

— Прашу прабачэння за турботы, але вы мне тэрмінова патрэбны. Я жонка вядомага вам Літава, у дадзены момант знаходжуся ў машыне каля вашага пад'езда. Тэрмінова спускайцеся ўніз,— як усе чужаземцы, яна занадта правільна будавала сказы.

— Што здарылася?

— Вас хочуць уцягнуць у вельмі брудную справу. Вы не ведаеце, з кім звязаліся. Тут стаіць пытанне жыцця і смерці.

— Чыім?.. чыіх?

— Калі ласка, спускайцеся ўніз.

Нацягваючы джынсы, Рак блытаўся нагамі ў калашынах, і гэтак сама блыталіся яго думкі. Пачынаецца! Вось яны бокам вылазяць, дармовыя грошы!

Частка другая

САМУСЕНКА

IV

Цяпер наўрад ці хто помніць манаграфію з крыху зацягнутай назвай: «Пейзаж як элемент вечнасці ў беларускай літаратуры ад Мялеція Сматрыцкага да Уладзіслава Сыракомлі. Частка 1»; не знайсці яе і ў інтэрнэце, хаця ў свой час яна нарабіла многа шуму ў літаратурных і гістарычных колах; калі б тады існавалі сацыяльныя сеткі, яна б іх «парвала». Асабліва літаратары былі ў захапленні. Нарэшце тое, чаму большасць з іх прысвяціла жыцці — апісанне прыроды — было на належным узроўні ацэнена і арыгінальна, таленавіта і даходліва пададзена. Усе ў адзін голас прызнавалі, што гэтая смелая навуковая праца яшчэ і з падтэкстам, нясе палітычную афарбоўку; пагаворвалі, панізіўшы голас, што нібы нават спецслужбы ёю цікавяцца,— і не дзіва, бо што такое ў часы сацыяльнай стабільнасці пісаць пра птушачак-траўку-кветачкі? — прыхаваны выклік сістэме; пры хаценні любы пейзаж, любое на першы погляд нявіннае апісанне, калі ўмеючы яго падабраць і падаць, у прамым сэнсе выклікае непажаданыя асацыяцыі: напрыклад, гнеў прыроды лёгка праектуецца на народны гнеў, майстэрскае апісанне завеі, ветру, навальніцы можа разумецца як рэвалюцыйныя выступленні мас, а любаванне кветкамі і траўкаю міжволі наводзіць на думку аб недаўгавечнасці таго ці іншага пра-

вадыра, які рана ці позна ў зямлю сыдзе і прахам стане, пакінуўшы пасля сябе толькі гэтую траву, ды кветку, ды шапаценне лісця над галавой.

Аўтар манаграфіі, выкладчык Самусенка А. Ф., і без таго лічыўся вальнадумцам, а пасля манаграфіі ўвогуле стаў ледзь не дысідэнтам, хадзіў героем, ганарыўся — носа не дастаць. Аднак жыццё не стаяла на месцы. Падзеі шпарка развіваліся тады. Змянілася палітычная сістэма, зніклі, як і не было іх, учарашнія правадыры, спецорганам стала не да Самусенкі і не да яго манаграфіі. Тэхніка імкліва пайшла ўгару. Студэнты пачалі пад'язджаць да ўніверсітэта на машынах, карысталіся пейджэрамі, потым мабільнымі тэлефонамі, затым — па ўзрастаючай — смартфонамі, айфонамі, айпэдамі, планшэтамі і іншымі гаджэтамі. На гэтую моладзь ужо не дзейнічаў крытэрый заможнасці: багаты той, у каго многа кароў і цялушак.

Самусенка яшчэ стараўся не адстаць, нават пачаў выпісваць у нататнік і завучваць на памяць новыя словы: мэйнстрым, вэндзінг, дэдлайн, клінэр, мэрчэндайзер, месэдж, хэдлайнер, фрыгалізм і харасмент, але, дайшоўшы да «стартапа», хапіла розуму гэтую справу кінуць. І суцяшэннем яму было, што ніштो так хутка не старэе, як неалагізмы, і гэтыя нібыта абавязковыя цяпер словы могуць выпасці з ужытку яшчэ раней, чым саха, каса і бык Мікіта. Ужо смяюцца з нядаўна модных баксаў, пэйджэраў, дыскет, і ніхто не дасць гарантыі, што хутка не пачнуць смяяцца з хайпа, біткойна, рэп-батла і стартапа.

Раптам усё яму абрыдла. Адны й тыя ж з году ў год лекцыі, семінары, разборы — вось як парася разбіраюць — адных і тых жа пісьменнікаў. Ён сяк-так дацягнуў да пенсіі і адразу ж, як калісь казалі, выйшаў у адстаўку, з намерам спакойна працаваць над манаграфіяй. Свабода, незалежнасць, мора вольнага часу агаломшылі яго, узнеслі як на арэлях ці як на марской хвалі. Ён адчуў даўно забытую радасць (апошні раз такая была ў далёкім дзяцінстве), і да таго гэта было здорава, што нясцерпна захацелася

ёю з кім-небудзь падзяліцца, выліць душу. І тут здарылася першая непрыемнасць. Менавіта цяпер, калі яму гэта так трэба было, аказалася, што пагаварыць няма з кім. Ва ўніверсітэце, дзе ён быў спачатку старшынёй, потым членам прыёмнай камісіі, ад сяброў-знаёмых не было адбою; увесь час яму званілі, пісалі, чакалі, прасілі сустрэцца; яго немагчыма было пабачыць аднаго — заўсёды хтосьці пад ручку, адводзіць убок, інтымна нешта нашэптвае. Цяпер, калі ён страціў працу і адначасова пасаду, усё скончылася, і настала нейкае імгненнае, а таму асабліва прыкрае забыццё. Ніхто не прыязджаў, не званіў, не пісаў; на яго пісьмы па e-mail не адказвалі, тэлефонныя званкі скідваліся, а калі хто, заспеты знянацку, адгукаўся, дык чамусьці быў у гэты момант страшэнна заняты і знаходзіў самыя розныя прычыны, каб хутчэй развітацца. Якраз стаяла лета, мо людзі на самой справе былі занятыя дачамі і адпачынкамі, і не да яго ім было,— але ён успрыняў гэта як здраду. Тады ж упершыню і ўзнікла ў яго ўніверсальнае слова на ўсе выпадкі: «памаглі».

— Не, не проста так мне ўчынены байкот,— казаў ён жонцы.

— А што здарылася? Чаму?

— Памаглі.

— Як? Хто? — занепакоілася жонка.

— Я ведаю хто,— з хітрай усмешкай чалавека, якога не абдурыш, адказаў ён.

Жонка паціснула плячамі. А муж, наваспечаны пенсіянер, ганарлівы, задзірысты, няўрымслівы, нічога лепшага не прыдумаў, як са зларадствам павыдаляць з камп'ютара e-mail-ы тых, хто яму не адпісваў, а з тэлефона— нумары тых, хто яму не адказваў. Тэлефон служыў яму як гадзіннік, а камп'ютар — замест газеты.

І далей пайшло як на арэлях ці як на хвалях: угару — уніз, радасць — непрыемнасць. Радасць, бо з дачкою ўсё было ладна: разумная, прыгожая, канчала журфак; непрыемнасць — шалапутны, бесталковы сын, старэйшы за дачку,—

як у шаснаццаць гадоў атрымаў правы, павязаў на галаву бандану і сеў на байк, так, здавалася, да трыццаці пяці гадоў не здымаў з галавы банданы і не злазіў з байка, нідзе не працаваў, вёў лёгкае жыццё, а дзе лёгкае жыццё, там, само сабою, алкаголь, наркотыкі; то ён завязваў, то зрываўся, то яго пазбаўлялі правоў і адбіралі матацыкл, то вярталі назад.

Самусенка заўсёды адчуваў нейкую віну перад ім, з горыччу думаў, што мо таму яго Юрка такі, бо ён, бацька, усё жыццё памагаў уладкоўваць чужых дзяцей, а на роднае дзіця забыўся. Вось зноў узнялі ўгару арэлі — удачлівая дачка выйшла замуж за француза і паехала з ім у Парыж,— і адразу ж абрынулася хваля ўніз, на гэты раз не непрыемнасцю, а бядой: трагічна загінуў сын, разбіўся-такі ў аварыі на сваім матацыкле насмерць. Тут раптам адразу ўспомнілі пра Самусенку здрадлівыя сябры-знаёмцы, пачаліся званкі, пасыпаліся спачуванні, роспыты: што, ды як, ды чаму.

— Не сам — памаглі! — казаў Самусенка.

— Як — памаглі?

— Так. Перадазіроўка!

Ён неяк са смакам, ледзь не з гонарам вымаўляў гэтую «перадазіроўку», нібыта яе трэба было разумець як «мой сын загінуў геройскай смерцю на полі боя: прыкрыў сваім целам варожы дзот». Толькі-толькі пачалі з жонкаю звыкацца да ціхай, спакойнай адзіноты — і зноў уніз паляцелі арэлі: роўна праз год пасля сына, дзень у дзень, 11 верасня, па-народнаму — на Галавасека, раптоўна не стала жонкі. Пахавалі яе побач з сынам. На могілках людзей было яшчэ больш, чым на сынавым пахаванні, знаёмых, сяброў, радні, нават дачка з зяцем з Парыжа прыехалі, і ўсе звярталі ўвагу, што Самусенка нават не плакаў, наадварот, трымаўся аж занадта цвёрда і на роспыты зноў адказваў загадкава:

— Памаглі!

— Як гэта — памаглі? Дактары, ці хто?

— Не, не дактары. Я ведаю хто.

Насамрэч у выпадку з сынам, калі ён казаў «памаглі», ён меў на ўвазе, што гэтых адмарожаных байкераў за іх

начныя гонкі ніхто не любіць, часта ім ад душы жадаюць хутчэй скруціць шыю,— атрымліваецца, загінуць Юры «памагла» канцэнтрацыя нелюбові да яго; а што да жонкі, тут Самусенка надумаўся, што студэнты, якіх ён некалі так бязлітасна і неабачліва рэзаў, таксама наўрад ці жадалі яму шчасця, хутчэй за ўсё ціхенька праклiналі і такім чынам «памаглі» набліжэнню яго бяды.

І Самусенка зажыў поўным бабылём. З часам ён нават як бы крыху здзічэў, а праз год зусім загнаў сябе ў фізічную і духоўную рэзервацыю. Ён звёў да мінімуму ўсе жаданні, замяніў іх звычкамі і рэжымам. Адзіныя ваканцы, праз якія ён пазіраў у свет, былі кнігі, камп'ютар, тэлевізія і дзве прагулянкі ад дома да метро, зранку і ўвечары. Адзінокі, стары, нікому непатрэбны, ён туляўся па кватэры і па вуліцы прыгорбленым ценем. На свой знешні выгляд ён махнуў рукою, галіўся раз на тыдзень і, калі пазіраў у люстэрка, заўсёды дзівіўся, чаму так хутка пачало расці шчаціннe. Зрэдку выбіраўся на могілкі і хадзіў па дарожках між крыжоў, не ведаючы, што ён тут робіць. Была ў яго дача, і туды ён прыязджаў не часцей, чым раз на год,— нічога не саджаў, траву не касіў, стаяў, тупа глядзеў на лапухі і зноў дзівіўся, як імгненна ўсё прыйшло ў заняпад без жончыных рук.

З людзей ён ні з кім не кантактаваў. Быў у яго сусед, жыў праз вуліцу, былы яго студэнт, паэт, таксама адзінокі; з ім Самусенка не супраць быў бы пасябраваць, але паэт быў яшчэ больш эгаістычны, чым ён сам, заўсёды насцярожаны, нібы некалі раз і назаўсёды нечым напалоханы,— праўда, быў ён выдатны, пранікнёны лірык.

Ад самоты Самусенка нават падумваў завесці сабе сабачку ці ката, калі б не гідлівасць да іх паху. Хутчэй бы ўжо брытанскія вучоныя прыдумалі, а японскія сканструявалі такога робата, ці што, вельмі падобнага на ласкавага ката, але якога не трэба было б выгульваць, які не ліняе і не ходзіць па патрэбе.

Раз зімой, перад Новым годам, ён вырашыў з'ездзіць да «Еўраопта», купіць з машыны ў знаёмага палешука

вэнджанага сала і салёных памідораў у вядзерцы, якія вельмі любіў, а заадно, каб крыху развеяцца, паглядзець на ёлку. Доўга, па-старэчы, апранаўся: абгарнуў шыю шалікам, адзеў падараванае зяцем-французам моднае паліто (прыціснуўшы шалік падбародкам да грудзей), нацягнуў пальчаткі, насунуў на галаву шапку, не забыў пра кіёк. На вуліцы было здорава, сонечна, марозна. Мароз і снег фільтравалі нават гарадское паветра, і здавалася яно чыстым, бадзёрым. Каля прыпынку сабачка ў камізэльцы купаўся ў гурбе снегу.

Самусенка пад'ехаў на тралейбусе два прыпынкі, задумаўся, ледзь не забыў выйсці, а калі выйшаў, забыў прайсці наперад і зрабіць заўвагу жанчыне-кіроўцы за тое, што рэзка тармозіць на светлафоры. Ён няспешна ішоў да «Еўраопта», механічна, думаючы пра сваё, не прапускаў, як сабака, ніводнага слупа, чытаў абвесткі з махрамі тэлефонных нумароў («продам волосы», «куплю квартиру»), і калі адыходзіў ад слупа, спахопліваўся, што не помніць, што ён толькі што чытаў.

Каля «Еўраопта» стаяў білборд з дзвюх палавін; на адной — хакеісты з клюшкамі і надпіс па-беларуску: «Падтрымаем родную каманду!» — на другой — дзяўчынка гадоў дзесяці і надпіс: «Заплаці аліменты!» Усё было б цудоўна і кранальна, калі б мастак-калажыст не перастараўся і на яго плакаце дзяўчынка, замест таго, каб выклікаць спагаду, выйшла развязна-какетлівай, з недвухсэнсоўнай усмешкай,— здавалася, вось-вось яна падміргне і пакліча ўказальным пальчыкам. Насустрач сярэдзінай тратуара ішоў нападпітку мужчына ў шапцы набакір, у расхлістаным кажусе, і спяваў па-беларуску:

— Толькі з табою мне хочацца быць! Толькі з табою!

Самусенка саступіў яму дарогу і з зайздрасцю падумаў: «І не баіцца, не саромеецца».

— Шчасце, і гора, і радасць дзяліць — толькі з табою! — не сунімаўся п'яніца; з рота ў яго разам з песняй выходзіла пара.

Самусенка стаяў і глядзеў яму ўслед, пратыкаючы снег кійком. Зайздрасць не адступала. Гэты мужчына быў ненамнога за яго маладзейшы, а такі вясёлы і шчаслівы. Што ў гэтага чалавека ёсць такое, чаго няма ў яго? Адна на ўсіх вуліца, снег, блізкі Новы год, марозік; значыць, можна быць шчаслівым ад мінімальнага, даступнага кожнаму набору маленькіх радасцяў. Чалавеку добра — ён спявае. Як людзі развучыліся адкрыта радавацца; мала таго, само слова шчасце выводзіцца з ужытку, як і слова гора, дарэчы. Не модна ні радавацца, ні бедаваць, застаецца нешта сярэдняе: ні шчасце, ні гора, а абстрактны «поспех». «Што самае галоўнае ў жыцці?» — «Дабіцца поспеху»,— нават малое дзіця скажа. А што такое поспех — ніхто і не ведае. Вось гэты палескі дзяцюк, таксама яго былы студэнт, у якога цяпер ён купляе сала, паспяховы ён? Гледзячы на яго, ён ні аб чым не шкадуе. Гадоў дваццаць пяць яму, здаровы, вясёлы, просты, галоўнае, не зайздрослівы, што на розуме, тое і на языку. Самусенка і раней любіў з ім пагаварыць, а на гэты раз яшчэ больш затрымаўся, панаракаў на старасць, паскардзіўся на адзіноту.

Вярнуўшыся дамоў, вострым сцізорыкам парэзаў на скрылёчкі сала, памідоры, сеў за стол і пачаў есці, адшчыкваючы пальцамі чорны хлеб, марудна варушачы сківіцамі, гледзячы перад сабой,— еў і адчуваў, як пакрысе пачынае адпускаць яго, нібы прачынаецца ён. Апамятаўся, калі нічога не засталося ні ад сала, ні ад памідораў, ні ад вялікай лусты хлеба. Тады ён сабраў са стала крошкі і высыпаў у рот. А з галавы ўсё не йшоў шчаслівы п'яніца.

Пасля таго выпадку Самусенка пачаў адтаваць. Ён зразумеў, што жыццё не канчаецца ні ў яго ўзросце, ні ў любым іншым узросце. Ён нават змяніў рэжым: пачаў сяды-тады выбірацца ў якую-небудзь рэдакцыю — нічога не прыносіў, а проста каб пагаварыць, пабыць сярод творчых людзей.

V

У час аднаго з такіх візітаў, ужо ў канцы зімы, Самусенка ў сваім французскім модным паліто, цяпер расшпіленым, сядзеў у рэдакцыі «Гістарычнага часопіса»; маладзенькая рэдактарка за камп’ютарам уголас чытала каментарыі на нейкі антыбеларускі артыкул,— як зайшоў новы, незнаёмы Самусенку чалавек, невысокі мацачок, падобны на крэпенькі грыб, зняў шапку,— адкрылася лысінка, пачаў вітацца з кім за руку, з кім кіўком галавы, прыязна ўсміхаючыся, паказваючы пры ўсмешцы два буйныя пярэднія зубы са шчылінкай паміж імі.

— ...Калі б я быў маладзейшы і жыў у XIX стагоддзі, я б выклікаў яго на дуэль! — рэзка сказаў Самусенка, яшчэ знаходзячыся ў тэме артыкула. Чалавек з цікавасцю, з адабрэннем на яго зірнуў, затрымаў яго руку ў сваёй.

— Літаў.

— Самусенка!

— Дазвольце зрабіць вам запыт...

— Трэба казаць: можна задаць вам пытанне,— папраўілі яго.

— Так, дзякую,— ужо звяртаючыся да ўсіх,— за заўвагу і прашу выбачэння, што пакуль не настолькі свабодна валодаю беларускай мовай. Прашу і надалей — папраўляйце, вучыце мяне.

Гаварыў ён па-беларуску з цвёрдым «г» і з мяккім «ч», замест «ў» — «в»: паехав, прышов, як паляк. «Хто гэта?» — шэптам спытаў у рэдактаркі Самусенка.— «Не ведаю, ходзіць, нешта піша».

Літаў пачаў з месца ў кар’ер, звяртаючыся і да Самусенкі, і адначасова да ўсіх:

— Можна задаць вам пытанне: чаму няма масавай літаратуры па-беларуску?

— Як няма? — ёсць,— адказалі яму.

— Я маю на ўвазе адзін забойчы бестселер.

— Як няма? — ёсць,— вяла, відаць у соты раз на такім узроўні: «няма — ёсць», адказвалі яму.

— Каб адзін такі твор, як стрэл, як настольная кніга, хэдлайнер!

Нікому не хацелася ўцягвацца. Нарэшце дзяўчына сказала:

— У нас няма чытацкай масы, якую можна было б прааналізаваць і зразумець, што яна хоча. У нас сто, ад сілы дзвесце чытачоў, якія сумленна чытаюць усё, што мы пішам. Але яны хутчэй блізкія сябры, суаўтары, чым чытачы.

— Чаму так?

— Мова не развіваецца натуральна.

— Не сама — памагаюць! — вырашыў гучна ўмяшацца Самусенка.

— Хто? — павярнуўся да яго Літаў.

— Я ведаю хто. Я скажу, можа быць, крамольную рэч. На маёй роднай Ельшчыне ўся наша вялікая вёска гаварыла выключна па-беларуску...

— Ельшчына? — усклікнуў Літаў.— Не паверыце, але я толькі што вярнуўся з вашых мясцін, з-пад Ельска. Якія там краявіды! Якія людзі!

— Свет цесны, а Беларусь удвая,— адказаў Самусенка, незадаволены тым, што яго перабіваюць. Ён хацеў, каб з яго аповеда атрымалася павучальная гісторыя.— Дык вось, я вучыўся ў цалкам беларускамоўнай школе, усё вакол па-беларуску: на перапынках, на двары, дома, кнігі, радыё, тэлевізія — з дзвюх праграм адна беларускамоўная,— і што? Тыя цалкам беларускамоўныя людзі былі анёлы з крыламі? Яны не сварыліся, не біліся, беларускамоўныя дзяўчаты не здраджвалі беларускамоўным хлопцам, і наадварот? У вайну не было калатнечы паміж беларускамоўнымі партызанамі і беларускамоўнымі паліцаямі?

— Што гэта значыць?

— А тое, што ў нас другое стагоддзе адна і тая памылка. Мы думаем, што мова — панацэя. Верым, што калі ўсе загавораць па-беларуску, дык аўтаматычна стануць разумнымі, смелымі і добрымі.

— Цяпер трэнд,— сказала рэдактарка.— Мода выратуе нашу мову. Праўда, гэта будзе ўжо іншая мова і літаратура. Будзе новая літаратура...

— Не будзе,— строга запярэчыў Самусенка.— Ніякай ні новай, ні старой літаратуры ўвогуле не бывае. Ёсць толькі таленавітае і не. Што таленавітае, тое і новае.

— Як разумець вашы словы? — спытаў Літаў.

— А так. Я людына вжэ стара і, можа быць, сучасную літаратуру не разумею, але здаецца мне, што яна ўсё больш робіцца пісьменніцкай — не ў пераносным, а ў прамым сэнсе: пісьменнікі пішуць для пісьменнікаў. Але нават такая літаратура павінна прыносіць найперш эстэтычную асалоду,— сярдзіта казаў Самусенка,— а не пакуты, з якімі чытаеш тэкст, дзе ледзь не кожнае слова ўжыта няправільна, стаіць ракам і бокам і адно на адным едзе, праз якія прадзіраешся, як праз іржавы калючы дрот.

— А скажыце...

Невядома, колькі б яшчэ гэта працягвалася, калі б ім не нагадалі, што яны не ў дыскусійным клубе і перашкаджаюць людзям працаваць. Выйшлі разам. Каля рэдакцыі стаяў джып, Літаў спыніўся каля яго. Не хацелі развітвацца.

— А хто вы? — спытаў Самусенка.— У якой сферы працуеце? Літаратар?

— Не, не ўгадалі.

— Гісторык?

— Не зусім,— ухіліста адказаў Літаў.— А ведаеце, што? Вы вельмі цікавы чалавек. Я маю да вас інтарэс. Ці не згадзіліся б вы з'ездзіць да мяне? Тут зусім недалёка. Хачу параіцца.

Самусенку даўно ніхто нікуды не запрашаў, таму было проста цікава глянуць, як жывуць такія людзі; да таго ж ён вельмі любіў даваць парады.

— Паказаць вам сёе-тое, адну рэч.

— Літаратурную?

— Хутчэй археалагічную.

— Дык вы археолаг?

— Зноў не ўгадалі. Не буду вас мучыць. Я працую ў лесаздабываючым канцэрне, кшталту аўдытара. У вас тут у Беларусі многа лесу, адпаведна, многа нашых філіялаў, дык вось мая праца — ездзіць па рэгіёнах, інспектаваць. Цудоўная магчымасць пабачыць розныя мясціны, гарады, мястэчкі. Нават дзікія астравы, як у Маўра. Прыгажосць, экзотыка, мне, ва ўсялякім разе, падабаецца.

У машыне, прышпільваючыся рамянём, Самусенка паляпаў па скураным сядзенні:

— Вось яшчэ наш беларускі крыж — машыны. Пакуль у беларуса ёсць машына, яго з месца не скранеш.

Па дарозе Літаў расказаў, што сам рускі, родам з Расіі, пабыў паўсюль, аб’ездзіў усю Еўропу, але нідзе не было лепш, чым тут; у Беларусі жыве ўжо тры гады, мае від на жыхарства, які дае права праз дзесяць гадоў стаць законным грамадзянінам.

— Засталося ўсяго сем.

— І за гэты час вы так далучыліся да нашай культуры?

— Лічу сваім абавязкам і доўгам перад краінай,— крыху пафасна адказаў Літаў,— якая мяне прытуліла, хоць бы збольшага, у агульных рысах, ведаць яе мову, гісторыю і народныя звычаі.

Машына выехала на кальцавую. Тут, за горадам, снегу было менш, чым у Мінску. Проста ў лабавое шкло свяціла зыркае чырвонае сонца, якім яно ўмее быць толькі ў канцы зімы. Літаў, не сціхаючы, усё расказваў пра сябе: што сувязей з Беларуссю ў яго ніякіх, але цяга на генным узроўні заўсёды існавала: напрыклад, калі чуў песню пабеларуску, заўсёды падымаўся камяк да горла і «находзіла шчымлівае зачараванне даўнімі, забытымі, як салодкі сон, гукамі, нечакана ўспомненымі,— так ён выказаўся.— Ды і само прозвішча Літаў: Літаўт — Вітаўт — Літва...», а Самусенка адказаў на гэта: «Адзін мой знаёмы філолаг звярнуў увагу, што ў нас амаль няма прозвішчаў з коранем «беларус», напрыклад, Беларусовічаў ці Беларусоўскіх, затое процьма Ліцвіноўскіх і Ліцвіновічаў».

Звярнулі з кальцавой, праехалі кіламетры два ўгару; Самусенка ведаў гэтае месца, праязджаў аўтобусам, калі ехаў на дачу, бачыў, што вялося нейкае будаўніцтва, але, канечне, не мог і падумаць, што неўзабаве сам тут апынецца. Спыніліся перад белай агароджай з рыфлёнага алюмініевага профіля, уехалі праз металічныя вароты ў двор. Захрабусцеў гравій пад коламі. Самусенка выйшаў з машыны. Дзверы гаража рассунуліся. Пакуль Літаў ставіў машыну, Самусенка агледзеўся. На самым высокім месцы стаяў белы трохпавярховы дом пад зялёнай металадахоўкай: першы паверх шырокі, другі меншы, трэці яшчэ меншы; з белымі пузатымі калонамі, з высокімі паўкруглымі вокнамі ў раманскім стылі, з балкончыкамі, агароджанымі ажурнымі чыгуннымі парэнчамі; самы верхні балкон быў закратаваны. Уся сядзіба, уключаючы двор, размяшчалася на схіле, як на невялікіх тэрасах. Ад адной тэраскі да другой каскадам спускалася падмеценая дарожка. На ніжэйшай ад двара тэрасе быў вялікі, авальнай формы, як дзіцячы каток, каркасны басейн (такія Самусенка бачыў у Францыі калі ездзіў да дачкі ў госці), закансерваваны на зіму, закрыты драўлянымі шчытамі; яшчэ ніжэй, пад трыма старымі вербамі, нейкі вадаём — як бы сажалка ці ставок, зацягнуты лёдам пасярэдзіне і з вадой каля берагоў, далей — альтанка, ад якой да самага дальняга кутка агароджы цягнуўся сад, вялікі і непрыгожы зімой, а можа проста занядбаны. Літаў тым часам падышоў да Самусенкі і раўніва сачыў за яго рэакцыяй.

— Як вам?

Самусенка прызнаўся, што чакаў раскошы, а тут — не сказаць, каб вельмі.

— Хаця ў параўнанні з маім лецішчам — канечне.

— І заўважце, усё гэта менш чым за тры гады. Калі нас вазілі па ваколіцах і мы выбіралі месца, жонка хацела на гатовае, нагледзела старую дачу нейкага акадэміка ў Ратамцы; мне таксама спадабалася, я рэтраград у архітэктуры, люблю ампір, манументалізм,— але то была дача,

а значыць, маленькі ўчастак, суседзі, да таго ж там раней жылі людзі, а гэта нібы карыстацца скарыстаным,— і я выбраў вось гэтую пустку, як ні адгаворвалі жонка і забудоўшчыкі: маўляў, высокае месца, цяжкі грунт, гліна; затое, казаў я, тут здзічэлы сад, вербы, натуральны вадаём. І цяпер шчаслівы, што нікога не паслухаў. Усяго за тры гады — такі чароўны куточак. І гэта зімой, а летам! Зверху, з мезаніна,— Літаў паказаў на закратаваны балкон, патлумачыў: — адтуль зваліўся будаўнік, таму краты; дык вось, улетку бачна сіняя палоска рэчкі, зялёныя шатры далёкага лесу, залатая ніва з цяжкім калоссем, па якой у жніўні плывуць камбайны, а зімой, калі снег — белае чыстае поле, якое так супакойвае стомленыя ад камп'ютара вочы. Дайце слова, што прыедзеце ўлетку! Пасядзім на балконе, пап'ем гарбаты, з сапраўднага меднага самавара, па-маскоўску, доўга, упрыкуску...

Нешта непрыемнае кальнула ў сэрца Самусенку. Што ён нясе? Якая ніва, якія каласы, якая гарбата па-маскоўску?

— Я, гэта,— сказаў ён, каб памяняць тэму,— чакаў, што ў багатых ахова, розныя відэакамеры, сабакі.

— Знайшлі багацея,— засмяяўся Літаў.— Наадварот, мне трэба яшчэ больш грошай — пазарэз прычым. У мяне ў Маскве ёсць адзін... гм, знаёмы, вось там сапраўднае багацце! У мяшчанскім, канечне, разуменні: вілы, яхты, верталёты, самалёты. Дарэчы, у Еўропе ўжо лічыцца непрыгожа, нават непрыстойна быць багатым.

— А хто даглядае гэта ўсё? прыбірае, падмятае? — пацікавіўся Самусенка, гледзячы на чыстую дарожку.— Павінны ж быць нейкія спецыяльныя людзі.

— Увесь мой штат — на паўстаўкі. Інакш дорага. Ёсць дворнік, ён жа шафёр, ён жа садоўнік; ёсць хатняя гаспадыня, яна ж кухарка, толькі не як у серыялах — пастаянна і з пражываннем, а два разы ў тыдзень: прыбраць, нагатаваць абедаў; ёсць доктар — амаль свой, хатні; ёсць настаўніца, прыходзіць да маіх дачушак... А цяпер, калі вы не супраць, пакажу вам свае ўладанні.

І Літаў, не даючы Самусенку апамятацца, падхапіў і павёў яго, прытрымліваючы пад руку. Сцежка вяла ўніз прыступкамі, дзе цаглянымі, дзе драўлянымі, дзе проста выразанымі ў цвёрдай зямлі, зручнымі, так што Самусенка і кійком не карыстаўся, тым больш Літаў памагаў. Спусціліся паўз басейн да стаўка.

— Прыродная сажалка, натуральная,— пахваліўся Літаў,— крынічка пульсуе, паспытайце, папіце,— і Самусенка вымушаны быў нагнуцца, крэкнуўшы ад болю ў спіне, і зачэрпнуць далоняй сцюдзёнай вады, змачыць губы і пахваліць: вада і праўда была смачная, аж саладкаватая, хоць і аддавала талым снегам.

Мінулі сажалку, спусціліся яшчэ ніжэй, да альтанкі, адкуль пачаўся сад з каравымі гэтай амаль бясснежнай зімой дрэвамі. Сцяжынка ў адзін след вяла да кутка агароджы, дзе жаўцелі і цямнелі цэглаю нейкія руіны. Звонку яны выглядалі як закінуты вясковы пограб ці склеп. Зверху — тоўсты пласт дзёрну. Арачнага тыпу ўваход, цьмянага колеру новыя металічныя дзверы. Літаў стаяў перад імі ў нямым захапленні.

— Вось,— дрыготкім ад гонару голасам паведаміў ён.— Гэта я і хацеў вам паказаць. Разам з участкам зямлі атрымаў у бонус. Спачатку дом планаваўся быць тут, будаўнікі пачалі капаць катлаван і натыкнуліся на такое дзіва. Я ўпэўнены, што гэта асабняк шляхты, парэшткі старадаўняга замка. Можа, тут яшчэ падземны ход да самага Мінска.

— А вы паказвалі яго спецыялістам? — абыякава спытаў Самусенка.

— Знарок не хачу. Сам пакорпаюся ў архівах. Гэта так цікава.

Літаў набраў на смартфоне код. Цяжкія дзверы на пнеўматычных цыліндрах бязгучна расчыніліся. Запахла падзямеллем і будаўнічай вапнаю. Вузкія прыступкі вялі ў выкладзенае клінковаю цэглаю паўкруглае сутарэнне. Цьмяная лямпачка. Ззаду ціха цмокнулі, зачыніўшыся,

дзверы. Літаў з Самусенкам спусціліся даволі глыбока па лесвіцы і ўвайшлі ў доўгае, з нізкай столлю, памяшканне. Падвал, ці нейкія лёхі, толькі вялікіх памераў. Святло непрыемнае, зыркае. Не тое што холадна, а стыла. І крыху вусцішна. Ніводнага гуку жыцця не прасочвалася сюды праз тоўшчу зямлі. Гэта нагадала Самусенку, як іх некалі на занятку па грамадзянскай абароне вадзілі ў бамбасховішча, такое ж прыблізна падзямелле, дзе стаялі тапчаны, кушэткі, плакаты на сценах, шафы з цёмна-балотнага колеру гумавымі супрацьгазамі на паліцах. А тут, у літаўскім «бамбасховішчы», уздоўж адной сцяны былі ўсяго тры доўгія, як більярдныя, сталы-стэнды са шклянымі вечкамі-накрыўкамі, каля другой — столік, крэсла, лямпа.

— Спачатку хацеў зрабіць вінны пограб,— у Літава змяніўся голас, стаў прыглушаны,— тут тэмпература заўсёды аднолькавая, а потым падумаў — павінна ж быць у кожнага свая *personal space*, і зрабіў вось — сабе кабінет. Ідэальнае месца для працы. Мабільнік не бярэ, вай-фай не ловіць, нішто не перашкаджае, поўная ізаляцыя.

— Я б не сказаў, што камфортна,— азірнуўся Самусенка.

— Так. З двара дзверы можна адчыніць толькі на званок з майго мабільнага, знутры — уручную, трэба ведаць код, а я мяняю яго кожны раз, як сюды заходжу. Не пазайздросціў бы я чужому, які тут апынецца. Ад адной клаўстрафобіі можа разарвацца сэрца.— І раптам, гледзячы ўбок, Літаў задумліва, нібы сам сабе, прамовіў: — Вось бачыце, не трэба ні XIX стагоддзя, ні дуэляў, дастаткова паставіць палец на курсор і націснуць — як на курок.

«Ды ён... вар'ят»,— халадзеючы, падумаў Самусенка. Але Літаў схамянуўся і пачаў расказваць далей:

— У мяне мара: зрабіць у гэтым сутарэнні музей. Толькі не звычайны краязнаўчы, а музей фальшывак, разумееце? Сабраць рознае «багацце», напрыклад, спарахнелыя паперы, на якіх нібыта вершы і паэмы Міцкевіча на беларускай мове. Нібыта фрывольныя навелы Скарыны. Невядо-

мая аповесць Яна Баршчэўскага, напісаная беларускай кірыліцай. Крыж Еўфрасінні з медзі і з фальшывымі каменнямі, падробныя слуцкія паясы, куча несапраўдных шчарбатых талераў і берасцяных грамат-шыфровак... Разумееце — не музей артэфактаў, а музей падробак!

— Навошта?

— А-а, я чакаў гэтага пытання. Па прынцыпе магнетызму. Вы ведаеце, што рэчы прыцягваюцца? У дзяцінстве ў мяне быў вельмі прыгожы шкляны шарык, і неяк згубіўся ў траве. Я зляпіў з хлебнага мякіша такі самы, кінуў у траву прыблізна на тое ж месца і з першага разу знайшоў, яны ляжалі побач. А то раз на пошце згубілася важнае пісьмо, і вось што я прыдумаў: напісаў і паслаў пісьмо самому сабе. Што вы думаеце — мне аддалі два! Так і тут: можа, падробкі хутчэй прыцягнуць да сябе сапраўднае.

Самусенка адчуў, што яму не хапае паветра. Нясцерпна захацелася адсюль наверх.

— Але я так мала ведаю. Было б здорава, калі б вы з вашым аўтарытэтам, з вашымі ведамі — пагадзіліся быць маім кансультантам. Вучылі б мяне, падказвалі, увялі ў літаратурна-культурны асяродак, пазнаёмілі з творчай элітай. Не за бясплатна, само сабою!

«Не — здаецца, нармальны хлопец»,— з палёгкай падумаў Самусенка. Літаў прызнаўся, што спрабуе пісаць кнігу на гістарычную тэму, сабраў усе магчымыя, якія толькі знайшоў у інтэрнэце, гіпотэзы стварэння і гістарычнага, і сацыяльнага развіцця Беларусі, і цяпер прэтэндуе на стварэнне яшчэ адной, сваёй уласнай гіпотэзы.

— Магчыма такое, як вы падлічваеце?

— Лічыце,— паправіў Самусенка, які пакрысе рабіўся самім сабою.— Што ж. Можа, сапраўды чужому відней. Прыйшоў жа некалі збоку рускі Мулявін — і вунь на якую вышыню ўзняў беларускую песню. Мо і вам удасца зрабіць тое самае з гісторыяй.

Дамовіліся, што Літаў будзе даваць яму раздрукаваны тэкст порцыямі раз на месяц.

— Толькі я папрашу, хай гэта будзе між намі. Не хачу розгаласу.
— Гэта і ёсць ваша таямніца? — спытаў Самусенка.
— Не, не яна.

VI

Пасля падзямелля лёгка дыхалася, і белы свет выглядаў прыветна. Сонца, марозік, сіне-пунсовае неба, нават латкі рабога снегу сям-там глядзеліся весела. Было гадзіны дзве дня. Пайшлі назад, падымаючыся па прыступачках угару на пагорак да дома,— гаспадар зноў клапатліва прытрымліваў госця пад руку. Самусенка адчуў нават нейкую прыхільнасць да яго. Калі падышлі да ганка, Літаў спахапіўся:
— Забыў папярэдзіць, у нас лазарэт, дзеці хворыя.
У цёплай вялікай гасцёўні Літаў-гаспадар не паспеў памагчы госцю зняць паліто, як зверху скаціліся па лесвіцы дзве дзяўчынкі, адна шасці, другая чатырох гадоў, босыя, у белых піжамках, круглатварыя, белагаловыя, кучаравыя херувімчыкі, якія нібы сышлі са старадаўняй віньеткі ці з каталіцкай іконы Анёла Ахоўніка. З двух бакоў павіслі на бацьку, ашчаперылі яго.
— Дочкі мае — Іра, Эма. А дзе мама?
Старэйшая дзяўчынка амаль спалохана азірнулася на чужога дзеда, нешта шапнула бацьку на вуха. Літаў чамусьці збянтэжыўся. Правёў госця ў сталоўку, папрасіў пачакаць, сам падняўся з дочкамі наверх. Самусенка агледзеўся. Шторы, прыцішанае святло, вялікае памяшканне. Але не памеры ўражвалі, а абстаноўка: усё цяжкае, груваcткае, цёмных і карычневых колераў; старадаўняя мэбля, масіўны круглы стол, з высокімі строгімі спінкамі крэслы; але нічога не цісне, не прыгнятае, не здаецца няўклюдным; нават тоўстыя васковыя свечкі ў цяжкім, на выгляд сярэбраным кандэлябры прыўносілі адчуванне супакою і ўтульнасці. Зверху данесліся галасы: ціхі, вінава-

ты Літава і звонкі, высокі — жаночы. Самусенка спакойна сядзеў за круглым сталом і чакаў. Нарэшце з'явіўся Літаў з роблена вясёлым тварам.

— Жонка вельмі прасіла прабачэння, але ніяк не зможа... З прычыны хваробы. І прыслуга адпушчана. Нічога, не ўпершыню.

Ён накінуў на плечы шлейкі фартуха і адразу стаў падобны на ўдзельніка тэлевізійных кулінарных шоу, якія суткамі ідуць ледзь не на кожным канале. Не хапала толькі каўпака на галаве.

— У нас сёння... булён з куры. Не крамнай — на базары купленай,— Літаў зухавата разліў апалонікам з рондаля варыва ў талеркі, паставіў у мікрахвалевую печ.— Мы ядзім усё, што падабаецца,— казаў ён, раскладаючы на стале сурвэткі, лыжкі, відэльцы, ставячы чаркі.— Можам бульбы з селядцом навярнуць, можам куплёныя пельмені. Калі-небудзь пад настрой самі гатуем, а калі хочацца чагось такога — ідзем у рэстаран... А вось чаго я не люблю, дык гэта *fusion*, гэтыя змешаныя складаныя стравы... Што піць? Віскі, ром, каньяк, віно?

— Віскі.

— Піце, ежце, мой шафёр вас адвязе, а калі спатрэбіцца, і аднясе.

Выпілі; спіртное імгненна разагнала ў Самусенку старую загусцелую кроў. «Не — абсалютна нармальны хлопец!» — расчулена падумаў ён. Закусілі; булён быў духмяны, наварысты («вясковы», падумаў Самусенка, які любіў усё натуральнае), з жоўтымі плямкамі тлушчу. Здаволілі апетыт, Літаў прыбраў посуд, пакінуў на стале толькі пляшку і чаркі.

— Мне вашыя разважанні ў рэдакцыі вельмі прыйшліся даспадобы.

— Спадабаліся,— паправіў Самусенка. Цяпер, калі размова ад бункераў, абслугі і кулінарыі нарэшце звярнула ў сферу яго інтарэсаў, ён зноў узяў паблажлівы тон выкладчыка на іспытах.— У другой частцы сваёй манаграфіі...

На гэтых словах на лесвіцы пачуліся крокі, адчыніліся дзверы і хуткім крокам у сталоўку зайшла жанчына гадоў дваццаці пяці, апранутая ва ўсё цёмнае, тварам падобная на дзяўчынак, толькі не бялявая, а русая.

Жанчыны такога тыпу звычайна вельмі прыгожыя ў падлеткавым узросце, але ўжо да дваццаці гадоў вянуць, як недаўгавечныя летнія кветкі. Самусенка прыўстаў, крыху хіснуўшыся, і зрабіў рух з намерам пацалаваць ёй руку ці хаця б проста патрымаць у сваёй. Але жанчына рукі не падала.

— Ірма,— толькі і сказала і адразу павярнулася да мужа.— Ты зноў? Табе доктара Шнэйдара мала?

— Пасядзі, дарагая, з намі...

— Калі гэта трэба,— прысела.

— Вып'еш? З'ясі?

— Калі ты гэтага хочаш.

Каменны твар, ні ўсмешкі, ні ветлівага слова. Самусенка, які б ні быў скаваны яе прысутнасцю, заўважыў, што голас яе, з лёгкім латышскім акцэнтам, зусім не хворы, і ўвогуле на ёй ніякіх прыкмет хваробы — там, абвязанай цёплай хусткай шыі, ці чырвоных вачэй і носа, ці пад носам — ну, як бывае ў грыпозных.

— Пазнаёмся, дарагая, прафесар Самусенка... Ты не ўяўляеш, які цікавы чалавек. Першыя словы, якія я ад яго пачуў: пра дуэль! І гэта ў наш час! Ты казала, Беларусь — мядзведжы кут. А тут я сустракаю такіх людзей! Рыцараў!..

Ірма раптам устала; упаў і бразнуў аб падлогу відэлец; павярнулася і, нічога не тлумачачы, хутка выйшла, амаль выбегла. Літаў уздыхнуў.

— І так заўсёды. Вось яно, маё жыццё.

— Не адабрае вашага захаплення беларушчынай? — спагадліва спытаў Самусенка.

— Баюся, яна нават не ведае такога слова. Не цікавіцца нічым, акрамя сябе, не займаецца ні дзецьмі, ні домам, ні абслугаю, нават у камп'ютар не лазіць, нават сябровак не завяла. Але справа не ў тым. Свабода мая абмежаваная.

Ледзь не кожны крок пад кантролем. І крыўдна, што ўсё гэта цяпер, калі я так блізка! Калі амаль знайшоў, што хацеў!..

Незразумела, туманна гаварыў Літаў. А потым, нахіліўшыся да Самусенкі, тым самым голасам, што і ў бункеры, прашаптаў:

— Вы ўмееце трымаць язык за зубамі?

— Я ў такіх гадах,— самавіта прагудзеў Самусенка,— што мне павінна сорамна быць...

— Скажыце — каб быў чалавек, ад якога б вы залежалі матэрыяльна... Які б прыніжаў вас, не даваў займацца любімай справай... Што б вы зрабілі?

— Змёў бы любога, хто апынуўся б у мяне на дарозе,— адказаў смелы ад віскі стары.

— Дык вы не жартавалі там, у рэдакцыі? Пра дуэль? Вы сапраўды змаглі б забіць чалавека?

— За Беларусь — рука б не здрыганулася.

VII

Назаўтра раніцай Самусенка прачнуўся дома ў сваім ложку. Ад якаснага спіртнога і добрай закускі нічога не балела. Галава была ясная, хаця засядзеліся яны дапазна і дамоў яго прывёз шафёр Літава, такі ж невысокі, ладна скроены, спрытны, як і Літаў, толькі негаваркі. Прачнуўся, успомніў усё,— і першая думка была: як гэты Літаў, увесь час яго заманьваючы, умудрыўся так і не раскрыць абяцаную таямніцу. Пратрымаў на кручку («не будзем прыспешваць», «яшчэ не час»), ды нічога і не сказаў. Да начнога століка каля ложка быў прыхінуты кіёк. На століку ляжала папка Літава — і аванс: сінія з серабрыстай ніткай-палоскай купюры еўра. Гледзячы на папку, а больш на грошы, Самусенка адчуў, як у другі раз нешта нядобра кальнула ў сэрца. Бункер, дзіўная жонка, гэтая нездаровая цікавасць Літава да тэмы «хто каго мог бы забіць».

— Ды не, ён добры хлопец,— прамармытаў Самусенка, нібы спрачаўся з некім, хто казаў адваротнае. Ну праўда,— не ў якасці ж кілера ён спатрэбіўся. Хутчэй за ўсё «таямніца» Літава ў тым, каб заснаваць рэдакцыю часопіса ці, можа, уласнае выдавецтва.

Тэкст Літава ён прагледзеў і знайшоў яго не лепшым і не горшым за іншыя тэксты такога ж кшталту. Іх смела можна не толькі не чытаць, а нават не прабягаць па дыяганалі,— хапае першага сказа, каб зразумець, што яны дзеляцца на ўсяго дзве канцэпцыі, абсалютна кантрастныя, якія не толькі не дапаўняюць, а катэгарычна выключаюць адна адну; першая: усё, што з Усходу — кепскае, крывавае, разбуральнае, захопніцкае; усё, што з Захаду — добрае, мірнае, стваральнае, вызваленчае. Літаў належаў да другіх. Так што ніякіх асаблівых вымаганняў гэтая рэдактура-падпрацоўка не патрабавала, наадварот, развейвала, і грошы былі лічы што дармовыя (падумаў Самусенка).

З таго часу цёмная паласа ў яго змянілася на светлую. Ён пачаў пісаць другую частку манаграфіі. Ён нават узяўся памаленьку аднаўляць старыя сувязі — напрыклад, пачаў заходзіць у госці да свайго былога студэнта, самотніка-паэта. Як мог ён стараўся развесяліць яго — чытаннем манаграфіі, картамі, шахматамі, абмеркаваннем палітычнай сітуацыі. Яму падабалася падсмейвацца, бяскрыўдна пакеплівацць з паэта, а калі-небудзь за чаркай віскі ці самагонкі раскрываць душу.

— Парадокс! — казаў ён.— Людзі задыхаюцца ад адзіноты, выдумалі віртуальнае жыццё сацыяльных сетак — выключна ад адзіноты! — у той час мы, два, хай сталага веку, але — яшчэ ў саку! разумныя мужчыны,— абодва адзінокія. Ніхто намі не цікавіцца. Я проста здзіўляюся, чаму на нас дасюль яшчэ не выйдуць якія хоць бы аферысты, чорныя рыэлтары, ці што. Усё весялей было б. Пачытаеш, паглядзіш тэлевізію — поўна такіх выпадкаў, хаця б з-за кватэры... У мяне ёсць знаёмы, таксама былы мой студэнт, зямляк мой з Палесся, сала ў яго купляю,

калі і самагонку... вось гэтую, якую мы п'ем... дык вось, расказваю яму, а ён не верыць!

Мінуў студзень, прайшоў люты, а прыкладна ў канцы сакавіка Самусенка зразумеў, што самахоць пачапіў сабе на ногі гіры. Рэдактарскі хлеб аказаўся не лёгкі. Ён убачыў, што аддае чужому значную частку душы і энергіі, якія трэба было б ашчаджаць на сваё — на любімую манаграфію. Ён пачаў думаць, як быць. Адмовіцца? Пра гэта не магло быць гаворкі. І прызнанне сваёй слабасці, і проста неразумна — самахоць страціць сяброўства з мецэнатам. Неяк раз, седзячы ў паэта за шахматамі, робячы выгляд, што задумаўся над ходам, Самусенка цягнуў сваё «тэк-с, так-с, шо він робліць»,— і тут цюкнула ў галаву: шукаю акуляры, а яны на носе! Вось перад табой ідэальная кандыдатура. Праўда, Літаў прасіў трымаць у тайне, але на крайні выпадак можна будзе патлумачыць, што някепска таму ж Літаву падтрымліваць сувязь з чалавекам, які працуе ў часопісе, звязаны з выдавецтвамі, рэцэнзентамі, крытыкамі; да таго ж Літаў, здаецца, сам прасіў пазнаёміць яго з творчай элітай. У той жа вечар ён уламаў капрызнага паэта. Пераклаў на яго плечы абрыдлую рэдактуру, заплаціўшы яму палавіну ад таго, што плаціў яму Літаў (па прынцыпе піраміды: Рак у сваю чаргу мог знайсці літраба, а той — яшчэ аднаго, як дзяленне клетак і атамаў). Літаў, які б ні быў дылетант, пры перадачы чарговай порцыі чыткі адразу ўбачыў чужую руку. Давялося прызнацца:

— Не сам, памагалі...

— Дык гэта проста выдатна! Вы павінны абавязкова нас пазнаёміць.

А пасля таго, як пабываў у Рака, збянтэжана, нават крыху разгублена казаў:

— Ну вы і знайшлі мне рэдактара. Я пабыў з ім дзесяць хвілін, а дзесяць гадзін прыходзіў у сябе. І ведаеце, што я скажу: вось гэты пайшоў бы на дуэль, і не ў XIX стагоддзі, а цяпер.

— Ды вы што! Ён гарний хлопець. А які тонкі лірык!

— Сентыменталізм — прыкмета жорсткасці. Вы бачылі яго вочы? Халодныя, ледзяныя; калі ён выхоплівае жэтон, я выпадкова сустрэўся з яго позіркам, і мурашкі па скуры пайшлі.

Самусенка вымушаны быў прызнацца, што калі-небудзь і яму рабілася не па сабе ад вачэй Рака, ад яго дзіўнага замірання, глядзення праз сцены некуды ў далячыць ці ўнутр самога сябе. Як бы ні было, а ён застаўся толькі ў якасці кур'ера паміж Літавым і Ракам. Зноў можна было з лёгкай душою займацца любімай манаграфіяй. А другая частка яе пайшла куды весялей за першую. Тут пейзажа было хоць адбаўляй. Колас з Гарэцкім, наперадзе — Чорны з Мележам, а там і да Пташнікава і ўсяго філалагічнага пакалення недалёка; вось дзе раздолле!

Ішоў дзень за днём, тыдзень за тыднем, месяц за месяцам, да канца вясны, усю палавіну лета — Літаў ні словам не абзываўся пра славуты «час ікс». Самусенка пачаў быў падумваць, што і няма ніякай тайны, а было тое сказана Літавым проста для звязкі слоў,— як у пятніцу 17-га ліпеня каля дзевяці вечара Літаў нечакана пазваніў, вясёлы, бадзёры, паведаміў, што выдатна «з'ездзіў», «усё гатова», пацікавіўся, як рухаецца манаграфія; а яшчэ папрасіў зараз жа схадзіць да паэта і персанальна запрасіць на заўтрашні раўт: «Скажыце, што яго чакае вельмі прыемны сюрпрыз. Пасля я вас набяру». Самусенка ўсё акуратна выканаў, калі выходзіў ад паэта, у вечаровым сутонні старэчым зрокам заўважыў каля пад'езда нейкую нібыта знаёмую жаночую постаць, побач з машынаю. Ён спыніўся і пачаў углядацца. Жанчына адвярнулася. І тут Самусенку ў трэці раз, як некалі зімою, непрыемна, да фізічнага болю кальнула ў сэрца. Паціраючы левую грудзіну, ён прыйшоў дадому, дастаў папку з манаграфіяй, пяшчотна, дрыготкімі пальцамі пагладзіў яе. Сядзеў з ёю на каленях, чакаў званка ад дабрадзея і не разумеў, што яго так глыжэ?

Частка трэцяя

ЛІТАЎ

VIII

Кампанія «Славлеспрамвест», падобна нафтагазавай кампаніі, як павуціннем апляла вялікімі і малымі філіяламі Расію, Беларусь, Прыбалтыку, Украіну, Скандынавію і цяпер цэлілася на Малдову, Румынію, Балгарыю. Яна мела адносіны да вырабу мэблі, да вытворчасці нейкіх катлоў, да паставак драўніны і будматэрыялаў, да выпуску каваных вырабаў, да перапрацоўкі харчовых адыходаў,— словам, займалася ўсім на свеце. Але асноўнай яе дзейнасцю былі пасярэдніцкія паслугі ў імпарце і экспарце лесу. З тых мясцін, дзе ён ёсць, яна памагала, як сказаў бы Самусенка, яго выразаць і перапраўляць туды, дзе яго няма, або туды, дзе ён ёсць, але яго берагуць і не высякаюць.

Цікава, што бізнес гэты ніколі не затухаў, нягледзячы ні на якія палітычныя расклады. Усім хочацца свае прыродныя рэсурсы пакінуць нечапанымі, а карыстацца чужымі.

Дзейнічала кампанія дзе афіцыйна, дзе неафіцыйна, дзе па-беламу, дзе па-чорнаму; у адным месцы яе філіялы ўзнікалі, у другім цярпелі крах, штат супрацоўнікаў бесперапынна абнаўляўся: хто на павышэнне, хто на паніжэнне, хто проста знікаў і неўзабаве аб'яўляўся ў Лондане або ў месцах не надта аддаленых,— і толькі для акцыянера і адначасова супрацоўніка кампаніі Леаніда Літава ўсё было як з гусі вада. Ён як звязаў свой лёс з лесам адразу пасля ВНУ ў роднай Вятцы, калі яму было 23 гады і калі кампанія яшчэ называлася «Кіраў-Лес», так і заставаўся нязменным. Якія б вакол ні адбываліся катаклізмы, яны абміналі яго бокам. Ляснуў «Кіраў-Лес» — Літаў выплыў чамусьці ў Таліне, у кампаніі «Еўраэкспалес». Там усё паўтарылася, і ён, як грыб з-пад зямлі, вырас у Калінінградзе, потым у Беластоку, а затым яго пачало кідаць па ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропе, як тэнісны мячык.

І куды б яго ні закідвала, перш наперш ён пачынаў ужывацца ў мясцовы побыт.

«Мой абавязак, калі хочаце, доўг,— заяўляў ён,— прыняць культуру і вучыць мову краіны, якая мяне прытуліла».

Праўда, намеры так і заставаліся намерамі. Пры ўсім жаданні зрабіць гэта проста фізічна было немагчыма — хаця б таму, што ён нідзе не затрымліваўся больш за два гады. Зрэшты, ён мала з-за гэтага перажываў. Энергічны, хуткі на пад'ём, ён лёгка зрываўся з аднаго месца і пералятаў на другое. Камунікабельны, таварыскі, хутка сыходзіўся з новымі людзьмі; акрамя ўсяго меў надта шчодры на любоў характар, быў жанаты чатыры разы, яшчэ тры засталося да «Сіняй Барады», як ён сам жартаваў. Праўда, зараз жа бажыўся, што сваёй Ірмы, апошняй жонкі, дачкі дзвінскага латгальца і латышкі, ён ні на кога не прамяняе. Сышліся яны, калі лёс закінуў яго ў Венцпілс (дзе зноў казаў Леанід Літаў: «мой абвязак прыняць культуру краіны, якая мяне прытуліла»), у кампанію «Балтлес». А калі там усё паўтарылася, зноў пачаліся цёмныя справы, Літаў — замест Лондана ці гасціннай балтыйскай турмы — апынуўся разам з жонкаю і з малымі дзецьмі ў ліпені месяцы 2013 года ў Крыме, супрацоўнікам кампаніі «Укркрымбудлес».

Няцяжка было здагадацца, што нехта аберагае яго, вядзе па жыцці. Але ніхто, у тым ліку і ніводная з жонак, не ведалі, хто менавіта. Сам Літаў трымаў на гэты конт магільнае маўчанне. Сяброў у яго не было, а знаёмым ён ні п'яны, ні цвярозы ні разу не прагаварыўся. Можа, яму хацелася, каб думалі, што яму проста шанцуе, што ён сам дабіваецца ўсяго ўласным талентам і розумам. На асабліва дакучлівыя роспыты знаёмых: «ну прызнайся, які ў цябе блат?» — ён адказваў жартам:

«У мяне не блат, а сястла».

І казаў няпраўду, бо быў менавіта брат. Праўда, зводны — адна маці, розныя бацькі, таму і прозвішчы мелі розныя. Брат быў на тры гады маладзейшы за Літава, але кар'еру іх нельга было і параўноўваць. Літаў пасля сваіх

пературбацый хоць і выходзіў сухім з вады, заставаўся цэлы, але і ўгару не йшоў, а як бы закансерваваўся, застыў на месцы звычайнага аўдытара. А гэты зводны малодшы брат даўно сядзеў у Маскве, насіў на лацкане трыкалор РФ і меў такую ўладу, што Літаву і не снілася. Калі Літаў аднойчы нясмела спытаў, ці ёсць у яго свае яхты, самалёты і верталёты, ён толькі іранічна гмыкнуў: верталёты і яхты, якая драбяза.

Чамусьці так склалася, што яшчэ з дзяцінства старэйшы Літаў заўсёды ва ўсім падпарадкоўваўся малодшаму, прывык выконваць яго волю, і ўжо тым больш пазней, калі брат імкліва пайшоў угару.

Адносіны паміж імі былі дзіўныя. Літаў амаль нічога не ведаў пра яго асабістае жыццё. Брат быў жанаты, але Літаў у вочы не бачыў яго жонкі. Брат ніколі не запрашаў яго да сябе ў Маскву і сам ні разу не прыехаў да Літава на яго часовыя стаянкі. Звычайна яны трымалі сувязь па тэлефоне ці па скайпе. І калі брат абзываўся, Літаў імгненна настройваў сябе на патрэбную хвалю: залішняй вінаватасці, перабольшанай пакорлівасці, празмернай павагі. Малодшы не прамінаў ніводнага выпадку, каб не нагадаць старэйшаму, што той ад яго ва ўсім залежыць.

— Зайздрошчу я табе,— казаў ён.— Хай бы мяне хто засланіў такой спінаю. Што б ты рабіў без мяне? — а заканчваў заўсёды аднолькава, як падводзіў рысу: — Пасада і вышнія эшалоны ўлады прывучылі мяне не верыць людзям. Не трэба, каб ведалі, што мы радня. Пачнуць цікавіцца табою, выйдуць на мяне, а мае магчымасці не бязмежныя. Усе толькі і чакаюць, каб наляцець і разарваць. Ад іх не схаваешся, яны нічога не даруюць!

На гэтых загадкавых *яны* і *ўсіх* звальвалася ўсё. Кожны раз пасля такіх размоў у Літава спаўзала з твару пакора, ён нібы камянеў, вочы звужваліся і глядзелі ў адну кропку, а твар рабіўся каменным, як у старога, многа разоў бітага баксёра, які прайграў чарговы бой. Ужывую сустракаліся яны рэдка, на два-тры гады раз, і заўсёды на нейтральнай

тэрыторыі. Літава прыгняталі гэтыя сустрэчы яшчэ больш, чым відэасувязь.

— Церпіш? — спагадліва пытаў брат.

— Ды не.

— І праўда нічога не хочаш? Ні кар'ернага росту, ні больш грошай?

— Ды не.

Брат пільна ўзіраўся ў яго, затым ляпаў па плячы і з палёгкай знаходзіў, як яму здавалася, тлумачэнне:

— Ну, гэта ты так кажаш. Бо ў цябе няма магчымасці. Ты не думай, што я табой грэбую, саромеюся цябе, заціраю, не даю падняцца. Зразумей: я павінен цябе стрымліваць. Ты — непрадказальны. Ведаеш сваю ахілесаву пяту?

— Ведаю...

— Помніш школу? Універсітэт? Помніш свае пазнейшыя фокусы?

— Помню...

— Кожны на маім месцы страхаваўся б. Я не магу не думаць пра рэпутацыю. Так што пацярпі яшчэ трохі. Доля рускага чалавека — цярпець. Дай мне ўмацавацца. Умацуюся — і цябе не забуду. Крышку засталося.

Кожны раз было пацярпі, і крышку, і ўмацавацца; Літаў заставаўся на месцы, а брат падымаўся ўсё вышэй,— здавалася, вышэй ўжо і нельга, а яму было ўсё мала. Не любіў Літаў гэтых сустрэч яшчэ і таму, бо ведаў: амаль заўсёды пасля іх яму зноў давядзецца мяняць дыслакацыю — пераязджаць на новае месца. Перадапошні раз яны бачыліся ў жніўні 2014 года ў Крыме, ужо ў рускім Крыме, на невялікай дачцы паміж Місхорам і Гаспрай. Быў дзень. Яны прагульваліся па высокім беразе дарожкаю, белай ад крымскага пылу; абодва ў панамах і ў шортах, але на гэтым падабенства канчалася — надта розныя былі знешне: невысокі, як бы па-жаночы акруглы, мяккі Літаў і даўгалыгі хударлявы брат. Поўныя ногі Літава былі загарэлыя да шакаладнага колеру, а жылістыя худыя братавы — чырвоныя, як у індзейца, у плямах ад першых дотыкаў пякучага паўднёвага сонца. Зверху былі горы,

знізу блішчэла мора. У бухтачцы тры невялікія чарнаморскія дэльфіны — мільгаў то востры трохкутны плаўнік, то чорная спіна, то белы жывот — збівалі каля берага да кучы кефаль, каб спакойна харчавацца.

— Як табе Крым? — спытаў брат.

— Ды так неяк. Не магу зразумець. Дзіўная рэч: калі ён быў украінскім, я адчуваў сябе дома, а стаў наш — як у гасцях. Быццам зайшоў у чужы дом без гаспадара, пераклейваю шпалеры, перастаўляю мэблю, і ўвесь час думка — а што калі нарвуцца гаспадары?

— Кінь. Па-мойму, нічога няма дурней, чым вайна за тэрыторыю. Межы такое ж часовае, як і ўсё ў гэтым свеце. Яны самі собой знікнуць у наступным стагоддзі, калі не ў сярэдзіне гэтага. Вялікае перамяшчэнне народаў не спыніць. Рана ці позна створыцца адзіны транснацыянальны саюз, дзе будзе і Украіна, і Амерыка, і Расія, і тады разборкі, чый Крым і чыя Аляска, проста страцяць сэнс.

— Так, глабалізм,— няпэўна сказаў Літаў.

— Не столькі глабалізм, колькі фізічны, калі хочаш, фізіялагічны працэс — усім разам элементарна лягчэй пракарміцца.

Браты прайшлі ў ратонду, затым на адкрытую тэраску, знялі панамы, і зноў выявілася розніца паміж імі: Літаў, саромеючыся невялікай лысінкі, даўно сам сябе спецыяльнай машынкай падстрыгаў пад нуль (што, зрэшты, яго толькі маладзіла), брат — з пароды тых, хто свае валасы і свае зубы захоўвае да смерці. У яго была густая, плацінавага колеру шавялюра, высакародны профіль, стомленыя разумныя вочы. Прыселі за столік з паўднёва-курортным наборам: вінаград, віно, персікі, у марлі — салёная малдаванская брынза, ад якой так прыемна скрыпяць зубы. Віўся вінаград па рашотках над галавою, варушыўся на століку цень яго зубчастых лістоў; па сцяне тэрасы паўзлі ружы — і кучна, і па адной; праз іх відаць былі гранатавыя дрэўцы, фэйхаа, лагерстрэмія і дзве карлікавыя пальмы з кашлатымі стваламі (а ў гэтым іх пакуллі замест райскіх птушак ціўкалі, мітусіліся, жылі самыя звычайныя шэрыя вераб'і).

Крыху далей раскінулася крымская магнолія з белымі, як малдаванская брынза, вялікімі, з добры сподак, кветкамі, якая тут, на ПБК, звычайна цвіце ад пачатку чэрвеня і па жнівень. Брат услед за Літавым таксама паглядзеў на дрэва.

— Пахне.

— Прыемна, я так люблю! — падхапіў Літаў.

— Аднак я чуў,— заўважыў брат,— што яе трэба нюхаць на адлегласці. Зблізку гэты пах небяспечны, асабліва ўночы. Пяць кветак у спальным пакоі на ноч, ды яшчэ з зачыненымі вокнамі, могуць ўсыпіць навек. А прызнайся, ты не супраць быў бы падарыць мне такі букецік?

— Ну што вы,— Літаў прыклаў да грудзей поўныя загарэлыя рукі.— Як можна...

— Добра. Магнолія магноліяй, а я папрашу цябе вось аб чым. Збірай манаткі. Нельга табе затрымлівацца на адным месцы, тым больш з тваім мінулым. Пакуль траснацыянальны саюз, ніхто не ведае, як яно там далей будзе. Трэба перасядзець, перачакаць.

— І... дзе?

— У Беларусі.

Вось так заўсёды. Літаў прывык, што брат ганяе яго, як дэльфіны кефаль, звычайна ён без лішніх слоў выконваў, што скажуць. Але гэтым разам набраўся смеласці.

— З гадамі цяжка вось так зрывацца з месца.

— Нічога не зробіш. Цярпі. Доля рускага чалавека — цярпець. Ды і нічога ад цябе там не патрабуецца. Рабі тое, што і да гэтага рабіў. Вучы мову, укараняйся ў мясцовы побыт, уваходзь у чужую культуру, наладжвай кантакты з нацыянальнай творчай элітай, словам, станавіся сваім. Ніхто не патрабуе, каб ты шпіёніў, збіраў звесткі, вербаваў. І вось яшчэ: помніш нашу ўмову? Што ты абяцаў?

— Помню...

— Не ўздумай паўтараць сваіх фокусаў! Я цябе сур'ёзна папярэджваю. Трымай сябе ў руках. Мы абодва ведаем, чым гэта канчаецца. Зразумей — мае магчымасці не бясконцыя. Я табе памагаў усё жыццё, а цяпер так можа скласціся, што ты мне будзеш памагаць.

Другая і апошняя сустрэча братоў адбылася праз два гады, у снежні 2016-га, чамусьці ў Варшаве — так брат захацеў. Для Літава гэтыя два гады прайшлі як у чароўным сне. Цяпер ён не мог уявіць, што жыў недзе ў іншым месцы. Ён зразумеў, што грунтоўна пускае тут карані, і вырваць іх будзе нялёгка. З горыччу ён казаў жонцы: «На што былі патрачаны гады! І чаму адным даецца гэта ад нараджэння, а другім — такой дарагой цаною! А як табе тут?»

Жонка-прыбалтка, хоць і зусім не падзяляла радасці мужа, адказвала: «Мне там добра, дзе табе».

Зімовая Варшава нічым не адрознівалася ад іншых еўрапейскіх зімовых гарадоў. Брукаваныя гарбатыя вулічкі і плошчы, чырвоныя чарапічныя дахі, плюсавая тэмпература, мяккае пахмурнае надвор'е, уключаныя днём фары машын. Брат гэтым разам таксама быў пахмурны, як гэтае надвор'е, гаварыў чамусьці вельмі ціхім голасам. На горцы Старога Мяста яго пацягнула на настальгію; пачаў успамінаць, як некалі летам тут пахлі чарэшні — «проста водар, я любіў стаяць і проста дыхаць, сапраўдныя былі пахі, а цяпер еўраўніфікацыя, без паху і ва ўсім аднолькавы смак». Перад тым, як зайсці ў кавярню, папярэдзіў: «Гавары па-англійску»,— і да Літава дайшло, чаму ён гаварыў ціха: саромеўся, ці баяўся, роднай мовы. Выпілі гарачага шакаладу з каньяком і пайшлі ўніз па вуліцы ў напрамку Віслы.

— Вы адзін? — спытаў, азіраючыся, Літаў.— Усё ж можа не варта так рызыкаваць.

— Кінь. Каму-каму, а табе сама больш выгадна, каб мяне не было. Вось тады б ты ўжо разгарнуўся! Поўная была б воля.

— Ну што вы! Як можна...

— Лепш скажы: праўда, што ў гэтай Беларусіі нешта ёсць?

— Праўда. Які край! Якая гісторыя! Якія людзі!

— Ты нават знешне памаладзеў,— з зайздрасцю заўважыў брат.

— Што вы! Здароўе стала лепш. Чым менш сплю, тым лепш адчуваю сябе. Раней баяўся крызісу сярэдняга ўзросту, а яно — наадварот — пад 50 такая працаздольнасць!

Літаў пачаў расказваць, якія беларусы: працавітыя, як немцы, спеўныя, як украінцы, таленавітыя, як рускія і наіўныя, як амерыканцы.

— Як на маю думку, ім не трэба ні Расія, ні Еўропа. Расія нічога ім не дасць, а Еўропа ў іх пад нагамі. У іх прыкладна тая самая Фінляндыя. Выдатныя дарогі, чыста, вясной едзеш — сеюць, у канцы лета— жнуць. А прырода! Іх прырода хітрая, яна нібыта сціплая, але якая непаўторная! Мова — музыка, а не мова, і амаль ніхто на ёй не размаўляе...

— Музыка музыкай,— перабіў брат,— а там яшчэ засталося што-небудзь? Не ўсё яшчэ высеклі? Колькі лесу ў Прыбалтыку сплавілі пад выглядам сыравіны, а фактычна дроў? Але гэта няважна,— абарваў ён ужо сам сябе.— Не надта прырастай там.

— А што? — спытаў Літаў і сам не пазнаў свайго голасу.

— Хутка зноў пераязджаць.

— Куды?

— У Малдову. А адтуль, хутчэй за ўсё, у Румынію. Віна пап'еш, памідораў паясі.

— Калі?

— Думаю, недзе вясной, у маі. І вось яшчэ што. Сітуацыя памянялася. Узяліся за мяне,— неахвотна патлумачыў брат.— Моцна, усур'ёз узяліся. Вішу, калі шчыра, на валасінцы. Можа, яшчэ палітычнага прытулку давядзецца прасіць. У сувязі з гэтым я павінен урэзаць тваё фінансаванне да мінімуму. Разумею, гэта жорстка. Але я вымушаны. На самае неабходнае ты, канечне, атрымаеш, але больш — прабач, ні капейкі.

— Як... а як жыць? — разгублена спытаў Літаў.

— Цярпець,— адказаў брат.— Такая ўжо доля рускага чалавека.

IX

Першае, што Літаў зрабіў, вярнуўшыся з Варшавы,— адразу з машыны пайшоў зірнуць, як рухаюцца справы з бункерам. Адліжны сыры снег прыліпаў да падэшваў. Пакуль яго не было, бункер амаль давялі да ладу. Яшчэ рабочы ў чырвонай камізэльцы рабіў з тачкай рэйсы да плота і назад — прыбіраў, вывозіў будаўнічы друз, яшчэ каля ўвахода ляжала куча застылай вапны, вядро на баку і рыдлёўка са зламаным дзержаком, яшчэ рупіўся з кельмай тынкоўшчык пры вушаку — падмазваў, падшкрэбваў; але металічныя дзверы ўжо былі гатовыя, бясшумна адчыняліся, усярэдзіне прасторна, светла ад люмінесцэнтных лямпаў і чыста. Ірма ў накінутай на плечы цёплай хусце сустракала яго на ганку. Так цярплівыя латышскія рыбачкі ў шторм чакаюць на беразе мужоў з мора. Яна зірнула на яго і спалохалася.

— Што здарылася?

Літаў моўчкі прайшоў у гасцёўню, не здымаючы паліто, стомлена апусціўся ў крэсла; жонка — следам, таксама чамусьці забыўшы скінуць хусту з плячэй.

— Як дзеці? — спытаў Літаў.

— Быў Шнэйдар, сказаў, што здаровыя.

Доктар Шнэйдар, з даўно абеларушаных немцаў, за гэты час амаль што зрабіўся іх сямейным доктарам; ён прыходзіў ледзь не кожны дзень. Ці то з яго лёгкай рукі, ці таму, што дзецям падышоў клімат, але заўсёды хваравітыя дзяўчынкі нарэшце пачалі папраўляцца. Гэта была ці не галоўная прычына, чаму Літаў не хацеў з'язджаць адсюль.

— Ты на сябе не падобны. Што здарылася? Мы зноў пераязджаем?

— Не,— паспрабаваў усміхнуцца Літаў. Але нават шчылінка між зубоў не адкрылася.— Якраз наадварот.

— Я ведаю ўсе твае перапады настрою. Чым ты заклапочаны?

— Ну, слухай. Я хачу стварыць прыватнае выдавецтва. Ці фонд — як атрымаецца. З грантамі, ганарарамі, прэміямі, каб падтрымліваць беларускую культуру, гісторыю, літа-

ратуру, незалежную кінематаграфію. Толькі не моладзь, яе ёсць каму падтрымліваць, а — сталых, у гадах творцаў, такім цяжэй за ўсё, яны паўзабытыя, у іх няма навізны імён, публіка ўжо мала чаго ад іх чакае, але мне здаецца, менавіта такія людзі — інтэлектуальны падмурак нацыі. Як табе?

— Цудоўна,— яна адвярнулася да вакна.— Толькі гэта няпраўда. Я ўсё адно не адстану, пакуль не скажаш.

— Ну, добра. Ёсць чалавек, якога я не люблю, нават баюся. Ён узяўся мяне апякаць і хоча рабіць гэта да канца жыцця. Ён так моцна трымае мяне ў абдымках, што рэбры трашчаць. Кантралюе ва ўсім мяне. Я залежу ад яго, я не ведаю волі, скаваны па руках і нагах, нічога не магу вырашыць сам.

— Не разумею, як ён цябе трымае?

— Грашыма. Я гэтаму чалавеку многім, ды можна сказаць — усім, абавязаны. А ён карыстаецца гэтым. На маё імя ў банку ляжыць сума, але разумееш, так атрымалася, такая схема, так хітра складзена дамова, што я абмежаваны ў дзеяннях, без яго ведама не магу ўзяць адтуль ні капейкі. Ён выдае мне крошкамі, цыркае дозамі ў залежнасці ад настрою.

— Ну і няхай. Дозы не такія і мізэрныя. Нам якая розніца?

— А такая, што ён — калі не хлусіць, вядома — можа эміграваць, нават папрасіць палітычнага прытулку. І калі ён гэта зробіць, усё замарозіцца, усе актывы і пасівы, і ўжо не толькі я, а і ён не будзе мець у банк доступу. І мы станем жабракамі.

— І што, ніяк не разблытаць?

— Ніяк! Я ўжо зламаў галаву, думаючы, так і сяк прыкідваючы, як гэты вузел разблытаць ці рассекчы адным махам. Зрэшты, ёсць адзін варыянт. Але настолькі малаверагодны, фантастычны, што я пра гэта і думаць не хачу.

— Я магу табе памагчы?

— Можаш. Калі дасі слова не задаваць лішніх пытанняў.

Пасля таго Літаў змяніўся. У яго пачаліся перапады настрою, знаёмыя Ірме яшчэ з Латвіі, якія і тады, і ця-

пер палохалі яе,— гэтыя рэзкія пераходы ад маўчання да балбатлівасці, ад лагоды да раздражнення. То ён з апушчанымі плячамі падоўгу стаяў каля акна, барабаніў пальцамі па падаконніку і пасвістваў, паціраў гладкі лоб, глядзеў некуды ўдалячынь ці ўнутр самога сябе, а калі падыходзіла жонка, пазіраў на яе і не заўважаў, потым, спахапіўшыся, уздрыгваў, нібы злоўлены знянацку, апускаў вочы і задаваў недарэчныя пытанні, напрыклад: «Сёння ў нас якое? — пытаў і сам адказваў: — З раніцы дзевятнаццатае было», або «Цяпер у нас студзень?», або: «Цікава, колькі кіламетраў ад Кішынёва да Тэрэспаля?», то станавіўся няўважлівым да таго, што блытаў імёны дочак — Эму называў Ірай і наадварот, то раздражнёна цадзіў Ірме праз зубы «адстань», а праз хвіліну прасіў прабачэння, абдымаў, цалаваў. І па-ранейшаму многа валэндаўся са сваім бункерам: нешта ўсталёўваў, штосьці ўпарадкоўваў. Неяк раніцай, прыкладна праз месяц пасля Варшавы, Літаў, прыгорбіўшыся, сядзеў на канапе, скроліў у планшэце. Ірма па сваёй звычцы нячутна падышла ззаду. Раптам ён засмяяўся такім смехам, што ў яе мурашкі па спіне пабеглі: не разабраць, смех то быў, ці плач.

— Што? Што такое?

— Павіншуй мяне! — смяяўся Літаў.— І сябе заадно. Той чалавек,— паказаў на планшэт,— ён такі эміграваў! Папрасіў палітычнага прытулку. Але дзе! Ва Украіне!

— І што цяпер?

— Не ведаю. Нічога не ведаю! Хаця,— крыху астыў ён,— адзін плюс у гэтым ёсць. Як мінімум, нікуды не трэба пераязджаць.

— І што цяпер?

— Ты памятаеш, што абяцала? — сказаў ён і лёгенька націснуў ёй на кончык носа ўказальным пальцам.— Не задаваць лішніх пытанняў!

Тыдні праз два пасля гэтага ён сабраўся ў чарговую дзелавую паездку, ці, як сам называў на стары манер — у камандзіроўку, на Усходняе Палессе. Мясцовы бізнесмен, нейкі Вадзім Асавец, стварыў у мястэчку дрэваапрацоўчае

прадпрыемства, невялікае, але якое атрымлівала стабільны прыбытак і ўжо другі год пастаўляла прадукцыю ў Еўропу, у прыватнасці, тэрасныя дошкі ў Англію і драўляныя дэкаратыўныя шырмы — у Германію. Акрамя таго аказвала лясгасу паслугі па распрацоўцы дзялянак, за што атрымлівала лес-кругляк. Вось гэтым лесам-кругляком і зацікавілася кампанія Літава. Усё было дамоўлена па тэлефоне, заставалася толькі з'ездзіць на месца, падпісаць паперы. Раней жонка, збіраючы і праводзячы мужа ў дарогу, заўсёды казала: «Няўжо больш няма каму ехаць, ужо ж не малады, можна і ў офісе пасядзець», а ён з усмешкай адказваў: «Ды я сам напрошваюся, такая магчымасць пабачыць новыя мясціны, не ўяўляеш, як гэта цікава». Цяпер Ірма нічога ўжо не пытала. Перад паездкай Літаў уважліва вывучыў па гугл-карце геаграфічнае размяшчэнне мястэчка. Блізкасць да мяжы з Украінай, лясістая мясцовасць, зліццё дзвюх рэчак, Жэлоні і Славечна, ды і да Прыпяці, шырокай і глыбокай у гэтым месцы — перад упаданнем у Дняпро, недалёка. Ён застаўся вельмі задаволены.

Ехаць было каля 5 гадзін. Стаяў пахмурны зімовы дзень. За акном пралятаці белыя палі, шэра-белыя аднолькавыя плоцікі, праносіліся невялікія населеныя пункты, а вакол такіх гарадоў, як Бабруйск, Калінкавічы, Мазыр былі аб'язныя. Камбінат размяшчаўся на ўездзе ў мястэчка, побач з аўтатрасай, на занесеным снегам полі. Гаспадар камбіната чакаў Літава каля варот. Літаў за сваё жыццё нямала нагледзеўся гэтых тартакоў, лесапільняў, дрэвапрацоўчых фабрык і камбінатаў, а таксама іх заўсёды заклапочаных, дзелавых, як правіла адзетых па-простаму, у зашмальцаваныя рабочыя спяцоўкі ці ў што пад руку гаспадароў, таму быў прыемна здзіўлены ўжо адным толькі знешнім выглядам гэтага Асаўца: скураная кароткая куртка, блакітныя вузкія джынсы; дужы, высокага росту, падцягнуты — такую выпраўку толькі доўгае нашэнне формы дае. Нечым гэты Асавец нават знешне нагадваў яго маскоўскага брата. Спакойны, без эмоцый твар, роўны, бубнявы, без інтанацый голас. І яшчэ дэталь — у яго, як

у вужа, не міргалі вочы. Сур'ёзны; калі Літаў паспрабаваў пажартаваць, як часта ў такіх месцах рабіў: «Ну што, лес сякуць — грошы цякуць?», Асавец паглядзеў на яго сваім немігаючым позіркам і адказаў строга:

— Яшчэ ў XIX стагоддзі папярэджвалі мудрыя людзі: беражыце лясы. Не будзе лясоў — усё загіне, без катастроф і войнаў.

— Вы філосаф.

— Лес сам па сабе нараджае філосафаў — ад амерыканца Тора да англічаніна Круза, ці не так?

— Парадаксальны вы чалавек. З аднаго боку самі ўдзельнічаеце, з другога — шкадуеце.

— Я сябе ніколькі не апраўдваю. Але раз ужо такая масавая высечка, дык лепш я, чым хто чужы, праўда? Калі ж вы маеце на ўвазе камбінат,— паказаў Асавец рукою,— у мяне ўсё законна. Дакументы ў парадку. Я даю працу дзясяткам мясцовых людзей.

Пайшлі аглядаць гаспадарку; цэхі, рамонтныя майстэрні; гудзенне станкоў і піларамы, пах свежай драўніны, кучы жоўтай тырсы і белых стружак на снезе.

— Тут стаяў закінуты будынак, без вокан і без даху,— манатонна, як станок, гудзеў Асавец,— адна сцяна нават разваліласяі, трэба было ўсё гэта аднавіць, горы смецця прыбраць, вадаём засыпаць. А цяпер — самі бачыце. У нас ні адна трэсачка не выкідваецца. Закупілі дзялянку, спілавалі, стралявалі, прывезлі, высушылі, паstругалі — і вось табе профільны брус, спрапілы-балкі, блокхаўс, вагонка, тэрасныя дошкі і дошкі на падлогу, вы згодныя?

Асабліва ўпіраў Асавец на тое, што ў яго поўны цыкл, глыбокая пераапрацоўка — «пачынаючы з таго, што мы паехалі ў лес, і канчаючы тым, што прадалі гатовую прадукцыю». Літаў заўважыў, што рабочыя на гэтым камбінаце нейкія дзіўныя: нейкія надта ўсе арганізаваныя, дружныя, як бы ўсе з адной сям'і, ціхія, ніхто не перакурвае.

— А гэта адэпты мясцовай баптысцкай царквы,— сказаў Асавец.— У мяне працуе прэсвітар, ён і падцягнуў сваіх. Я задаволены. Не спазняюцца, ніхто нічога не

возьме сам, заўсёды папытаюць дазволу, ці не так? Трэба, каб у чалавека быў фундамент, каб ён у штосьці верыў. Чалавек без веры — як без стрыжня, яго пахіліць куды хочаш. Ён ідзе на працу, а яго запрасілі ў краму — ён пайшоў туды, ці не так?

Чым больш слухаў яго Літаў, тым больш весялеў. Ён ужо разумеў, хто перад ім — класічны, ідэальны зануда. Гэтая сур'ёзнасць, шчырасць, прыстойнасць, старамоднае праўдалюбства, гэтая запаволенасць рухаў, бубненне, канцылярская будова сказаў, гэтая звычка пад любую тэму падводзіць філасофскі ці, лепш сказаць, псеўдафіласофскі базіс, на любое, нават самае нязначнае пытанне даваць грунтоўны, разгорнуты, поўны адказ; гэтае частае перапытванне: «правільна? вы згодныя? ці не так?» — і зноў само сабою напрошвалася параўнанне з маскоўскім братам, прычым цяпер Літаў пераконваўся, што падобныя яны не толькі знешне, а і характарамі, з тою, праўда, розніцай, што ў Асаўца абсалютна адсутнічала пачуццё гумару, як чамусьці ва ўсіх гэтых дамарослых філосафаў.

Заглянулі ў дамок вартаўніка, складзены з бярвення — такімі захапляюцца ў інтэрнэт-супольнасцях аматары адзінокага адпачынку сярод дзікай прыроды. Усярэдзіне спальнае месца, тэлевізар, мікрахвалевая печ, электрачайнік.

— Інтэрнэт нават ёсць. Толькі слабы трафік, сувязь прападае. Нават мабільны не заўсёды ловіць у гэтых балацянках,— як бы пахваліўся Асавец.— А мо таму, што мяжа побач.

— Вы так лічыце?

— Не магу сцвярджаць, але дапускаю. Са мной падобнае было, і не раз. Неўзабаве такія ў продаж пусцім,— вярнуўся ён да доміка.— Тут нядаўна прыязджалі з Англіі, першай справай глядзелі бытоўкі. Іх цікавіць, дзе рабочыя абедаюць, пераапранаюцца, а потым ужо — вырабы. Калі не спадабаецца побыт, яны нічога не купяць, праўда ж?

— Дык то англічане,— сказаў Літаў.— Што да мяне, прызнаюся шчыра: самае нецікавае — дрэваапрацоўка. Не люблю гэтага шуму, паху; не кажу ўжо пра дзялянкі

з харвестарамі і фарвардэрамі; нейкая няёмкасць у такіх месцах. Нібы ты сведка забойства,— дадаў ён, заўважыўшы, што размова пра экалогію закранае нейкую струну ў Асаўцы.— Увогуле не люблю, калі нешта памірае, хай сабе і маўклівыя дрэвы.

— Трэба ўлічваць, што ў свеце поўна сапраўдных забойстваў — чалавека чалавекам. Да таго ж няма вялікай розніцы, што рабіць з мёртвым целам пасля таго, як адбылося забойства, ці не так? А тут,— паказаў Асавец на заснежанае поле,— хачу сквер пасадзіць.

— Скажыце, а як вам дазваляюць? Каля самай мяжы? — спытаў Літаў. Яму не цярпелася хутчэй перайсці да таго, што яго цікавіла, і ён толькі вычэкваў зручнага моманту.

— Дык а мяжы па сутнасці яшчэ няма. Пакуль яна ўмоўная. Апошнім часам, праўда, пачалі прыбіваць дрот да дрэваў пасярод лесу, і то не калючы, а гладкі.

— Што вы кажаце!

— Гэта не хуткая справа. Гадоў на дзесяць яшчэ працы. Мясціны цяжкапраходныя, вялізныя плошчы густога лесу, балот, разгалінаваная сетка меліяратыўных каналаў, плюс больш за сто кіламетраў па Чарнобыльскай зоне...

— І што, вось так лёгка можна прайсці?

— Прайсці,— гмыкнуў Асавец.— Мяжа — гэта не палоска на геаграфічнай карце. Ёсць жаданне — можна і танк працягнуць.

— Вы хочаце сказаць, можна знайсці чалавека, які зматаўся б, напрыклад, у Кіеў на гадзіну, і вярнуўся назад?

— Дык так і робіцца. Раней украінцы хадзілі да нас па грыбы, па ягады, мы да іх па цукеркі, а цяпер з двух бакоў цягаюць мяса, сала, цыгарэты, паліва, аграхімію. Мясцовы бізнес, ці не так?

— Скажыце, а як знайсці такіх лазутчыкаў? — спытаў Літаў.— Пазнаёміцца, пагаварыць з імі. Ніколі не бачыў прафесійных кантрабандыстаў. Мне гэта трэба для маёй працы. Я не сказаў, хай вас не дзівіць... Я пішу навукова-гістарычную працу і вось, збіраю матэрыял.

Упершыню ў немігаючых вачах Асаўца праявілася хоць нейкая эмоцыя, прынамсі цікавасць.

— Вы — творчы чалавек,— ці то спытаў, ці то канстатаваў ён.

Літаў схіліў галаву ў знак згоды. «Зараз пачне расказваць сваю біяграфію, а скончыцца тым, што папросіць напісаць кнігу пра лясную прамысловасць»,— падумаў ён. Але Асавец больш да гэтай тэмы не вяртаўся. Нарэшце тартак быў збольшага агледжаны. Паехалі ў цэнтр мястэчка, у офіс лясгаса, які размяшчаўся ў пяціпавярховым будынку, адзіным такім высокім на плошчы. Ён быў кшталту мурашніка ці вулея. Шыльды сведчылі, што тут ёсць усё тое самае, як і ў вялікіх гарадах (так дзеці імкнуцца быць падобнымі на дарослых): гандлёвы цэнтр, рэстаран і кавярня-бар, аптэка і оптыка, цырульня і стаматалогія, рэдакцыя раёнкі, банк; з тарца адзін ганак вёў адразу ў дзве ўстановы — у аддзяленне пошты і аддзяленне міліцыі. Побач, пад таўсценным, як баабаб, дрэвам незразумелай пароды, з абрэзанымі галінамі стаяў газетны кіёск і банкамат, далей за імі — будынак аўтастанцыі з паўкруглымі акенцамі касаў. На ідэальна круглай плошчы з Леніным у цэнтры ляпіліся адна каля адной штук дзесяць фур, з беларускімі, рускімі, украінскімі і еўрасаюзаўскімі нумарамі.

— Жвавае мястэчка,— азіраючыся, сказаў Літаў.

— Міжнародная аўтатраса. І чыгунка побач. Да Оўруча рукой падаць, і да Кіева гадзіна язды. Я тут стаянку планую зрабіць для фур, а ў праекце — пункт адпачынку для дальнабойшчыкаў; будзе пакойчык, душ, так жа?

У лясгасе хутка аформілі, узгаднілі, падпісалі патрэбныя паперы, выйшлі зноў на плошчу. Літаў з намёкам паказаў на вывеску рэстаранчыка, толькі цяпер звярнуўшы ўвагу на назву: «Раздолье».

— Няўжо сапраўды рэстаран?

— І вельмі някепскі.

— Зойдзем?

— Не атрымаецца, рамонт; працуе толькі бар. Вы не крыўдуйце,— сказаў Асавец, калі заходзілі ў бар,— што да

сябе не запрашаю. Мой дом — мая халасцяцкая крэпасць. Я аскет, нічога лішняга, а вы, відаць, любіце раскошу.

— З чаго вы ўзялі?

— Машына ў вас дарагая, а водзіце вы нядбайна, не шкадуеце яе, з чаго выснова: калі разаб'ецца — не праблема купіць новую.

Сімпатычны правінцыйны бар, чысценькі. Селі на высокія крэслы, адкінуліся на спінкі. Літаў не мог не заўважыць, што Асавец пачуваецца тут як дома; і на самой справе, дзе ж яму, халасцяку, харчавацца. Заказалі кавы, Літаў акрамя таго яшчэ мясцовых круасанаў і заварны эклер. Пакуль ён прагна набіваў рот духмяным круасанам, спечаным на тлустым сялянскім масле, Асавец перайшоў-такі да аповеду пра сябе. У яго была звычка, калі ён задумваўся, забіраць падбародак у кулак і глядзець сваім няміргаючым позіркам некуды ў прастору. Сам ён з Мінска. Кватэра там. Раней прыязджаў сюды толькі на лета, займаўся рыбалкай і паляваннем, а потым зусім пераехаў, купіў домік з садзікам.

— У горадзе стала цесна — горад мяне як бы сціскае, люблю прыроду, свабоду, праўда?

Распачаў сваю справу каля пяці гадоў назад. Побач з домікам быў участак, недзе 45 сотак, ён яго «аформіў для вытворчых патрэб», правёў сілавую электралінію, зрабіў дакументы па экалогіі...

— Напачатку мясцовыя скептычна ставіліся да маіх намераў,— цягнуў, нібы жаваў мачалку, Асавец, і ў Літава было адчуванне, што яму ўголас чытаюць раённую газету ці перакладныя навіны на БТ.— Аднак я заняўся тэхнічным абсталяваннем цэха. Па першым часе ніякай аддачы, толькі страты, жыў на адну пенсію...

— Як пенсію? — усклікнуў Літаў.

— Пенсію адстаўніка. Яе можна атрымліваць ужо ў сорак пяць. Да пачатку свайго шляху ў бізнес я пятнаццаць гадоў працаваў у праваахоўчых структурах, прасцей — у міліцыі, цяпер — на заслужаным адпачынку.

— А выглядаеце маладзей за мяне.

— І гэта пры тым, што магу выпіць і закурыць,— сціпла пахваліўся Асавец,— пры тым (ён загнуў палец), што многа хаджу і не стамляюся (загнуў другі), высочваю браканьераў у лесе і на вадзе, не дапускаю незаконныя высечкі, абшнырыў тут усе куткі і закавулкі, ведаю кожную сцежку.

— Вы шчаслівы чалавек.

— Я — чалавек цвёрдых прынцыпаў. Прынцыпы, я лічу, самае галоўнае ў жыцці. У мяне абвостранае пачуццё справядлівасці. Кім і дзе я толькі ні быў: у РУУС, у МНС, у дэпартаменце аховы,— нудна, пунктуальна, то загінаючы пальцы, то растапырваючы іх і пагладжваючы сябе па калене, расказваў Асавец,— і пераканаўся, што нідзе не любяць прынцыповых. Такі я ўжо ўрадзіўся. Люблю парадак, не выношу хлусні, праз гэта цярплю ўсё жыццё, з тае ж прычыны пацярпеў няўдачу на сямейным фронце...

— Скажыце,— перабіў Літаў,— адно гэта? Толькі з-за бізнесу і з-за чароўнай прыроды вы сюды перабраліся?

— Не, не толькі.

— Каханне? — гулліва спытаў Літаў і нават запанібрата падміргнуў бабылю, але той застаўся сур’ёзны.

— Угадалі,— сказаў ён.— Нягожа чалавеку аднаму векаваць. Надакучыла неўладкаванасць, пацягнула да сямейнай утульнасці. Ёсць у мяне на прыкмеце мая будучая другая палавінка, мясцовая ўдава, нягоднік муж кінуў яе з маленькай дачкой. Працуе ў раённай газеце тэхрэдам. Так атрымалася, што як толькі я ўбачыў яе...

— Прыгожая?

— Не тое слова. Прыгожая, разумная, сціплая, такіх цяпер няма. Прынамсі, у Мінску не сустрэнеш. Вось чакаем, пакуль яе дачка скончыць школу, і тады афіцыйна аформім наш шлюбны саюз.

Пасля ўтульнага святла, прыемных пахаў і гукаў кавярні плошча падалася непрыветнай, пахмурнай, туманнай; з нізкага неба церушыўся нейкі ні снег, ні дождж, на тратуары ўжо стаялі калюжыны, а на газоне ўзбоч тратуара ўвачавідкі асядаў рыхлы брудны снег. Асавец закурыў; дым ад цыгарэты не развеяўся ў паветры, а застыў над ім,

як воблачка ці німб. Рэдкія людзі раскрывалі парасоны. Два хлопчыкі, абыякавыя да непагадзі і да ўсяго на свеце, з вялікімі, як гарбы, заплечнікамі прайшлі, стуліўшыся галовамі, на хаду гледзячы ў адзін смартфон; але трэці — іхні таварыш, які затрымаўся каля газетнага кіёска і цяпер даганяў іх, будучы паэт, аббег плошчу вачыма і нібы зрабіў імгненны здымак, які назаўсёды адаб'ецца ў памяці: гэтая плошча ў тумане, тоўстае скалечанае дрэва, дальнабойныя фуры, джып і двое мужчын каля яго. Літаў ужо развітаўся, сеў у машыну, як раптам, нібы ўспомніўшы нешта, вярнуўся і спытаў, ці не паможа яму Асавец падшукаць востраў не востраў, а па магчымасці больш-менш непралазны куток, пажадана акружаны вадой.

— Разумею, цяпер такое цяжка знайсці, але раптам? Вы паляўнічы, рыбак, ведаеце ўсё наваколле. І душа ў вас баліць за экалогію,— уставіў Літаў.— Можна гэта?

— Усё можна ў межах чалавечага жыцця. Ёсць мясціны, амаль некранутыя цывілізацыяй. Праўда, цяпер зіма самі бачыце якая — цёплая, нікуды не ўлезеш. Але вам, я так разумею, не гарыць? Можна вясной?

Літаў адказаў, што нават летам, не гарыць, тым больш, яму трэба час, каб вырашыць адну важнейшую справу, а потым яшчэ знайсці патрэбных людзей.

— Вы падбіраеце для нечага людзей,— зноў ці то спытаў, ці то сцвердзіў Асавец, скіраваўшы Літаву ў жывот указальны палец.

— Творчых людзей,— мякка ўдакладніў Літаў.— І не за бясплатна. І вам я ў сваю чаргу аддзячу. Магу я вам чым памагчы?

Асавец асцярожна патрэскаў у далонь сухім кашлем курыльшчыка.

— Яшчэ як можаце. Вы менавіта той, хто мне трэба. У мяне да вас таксама просьба ці, хутчэй, прапанова. Упэўнены — вас як чалавека творчага павінна гэта зацікавіць.

«Каб напісаў кнігу пра лясную прамысловасць»,— у думках дагаварыў за яго Літаў. А ўголас паабяцаў:

— Зраблю ўсё, што ў маіх сілах.

На развітанне ён узяў з Асаўца слова, што той улетку абавязкова пабывае ў яго ў гасцях.

— Пагаворым, пап'ем гарбаты на тэрасе, доўга, па-маскоўску, упрыкуску. Пазнаёміцеся з творчымі людзьмі. Я бачу, вы сам чалавек творчы.

— З задавальненнем прымаю вашу прапанову,— на сваёй казённа-драўлянай мове адказаў Асавец.— Сяброў у мяне мала, пагаварыць асабліва няма з кім, акрамя маёй будучай другой палавінкі. Мяне чамусьці лічаць чалавекам занудным, нецікавым. Хаця я — вы не памыліліся — не чужы творчасці, з дзяцінства люблю чытаць, толькі ніколі не запамінаю аўтараў, ці не так?

X

З гэтай паездкі, у адрозненне ад варшаўскай, Літаў вярнуўся зусім іншым. Зноў Ірма бачыла перад сабой ранейшага мужа: жвавага, радаснага, поўнага планаў.

— З якім чалавекам пазнаёміўся,— захоплена расказваў ён.— Лясны прадпрымальнік, адначасова эколаг і філосаф. Мяне заўсёды цікавіла, чаму калі разумны, прыстойны чалавек робіць нейкі для масаў незразумелы ўчынак, напрыклад, кідае горад і перабіраецца бліжэй да прыроды, ці, скажам, працуе над кнігай па гісторыі — яго ў лепшым выпадку аб'яўляюць дзіваком. А мясціны там! некранутыя! дзікія! нават сувязь не паўсюль ловіць.

З канца студзеня жыццё Літава пайшло ў паскораным рытме. З яшчэ большым імпэтам ён узнавіў свае пошукі «патрэбных», як казаў, людзей, яшчэ раз ездзіў у мястэчка, заадно пабываў у Ельску, у Мазыры і ў Нароўлі, але больш не пасвячаў Ірму ў свае планы і ні словам не абмовіўся пра мэту гэтых паездак, у лепшым выпадку аджартоўваўся ці нагадваў: «ты дала слова не пытаць», а часцей проста буркаў: «я працую» — нават калі проста ляжаў на канапе, ногі на валіку. Затое пачаў зближацца з тым жа доктарам Шнэйдарам. Дзяўчынкі былі ўжо здаровыя, але доктар па-ранейшаму наведваўся, яму плацілі за гэта —

«так у мяне спакайней на душы»,— казаў Літаў. Яны падоўгу сядзелі ў Літава ў кабінеце або прагульваліся ўніз да альтанкі і назад. Доктар, вялікі, непаваротлівы чалавек, больш слухаў, чым гаварыў, нагнуўшы лабастую галаву, счапіўшы на жываце дужыя белыя рукі, якія рэзалі на аперацыйнам стале ракавыя пухліны з такой жа абыякавасцю, як селянін лусты хлеба ад каравая на стале абедзеным. І сваім праставатым тварам ён быў падобны да звычайнага беларускага вясковага дзядзькі, які ў будні многа працуе, а ў святы многа выпівае; з той, праўда, розніцай, што доктар ні кроплі не браў спіртнога, целам быў вегетарыянец, а душою — наіўнае дзіця. Ён умудрыўся пражыць шэсцьдзясят гадоў і не запэцкацца. У дзевяностыя з сям'ёй з'ехаў у Германію, у нулявых таксама з сям'ёй вярнуўся, яго прынялі і далі месца ў ваенным шпіталі. Літаў усё распытваў, як яму жылося за мяжою і чаму ён вярнуўся.

— Мала што магу ўспомніць,— адказваў доктар.— Пражыў дзесяць гадоў і Германіі практычна не бачыў. Мы жылі ў сваім анклаве, эсэсэраўскія немцы: узбекскія, казахскія, арэнбургскія, у асноўным рускамоўныя. Памятаю, неяк у аўтобусе захацеў саступіць месца цяжарнай жанчыне і паплаціўся за гэта — сэксізм: «чым я горшая за цябе?» Там з гэтым строга. А чаму вярнуўся? Быў адзін выпадак, які стаў апошняй кропляю. Да суседзяў, казахскіх немцаў, прыехала на аздараўленне дзяўчынка з Беларусі. Яны жылі ў сваім доме, а мы побач, праз цагляны плот, у звычайнай кватэры ў пяціпавярховіку. Вяртаючыся з працы, часта бачыў гэтую дзяўчынку, усё збіраўся загаварыць, ды боязна было, там наконт гэтага строга. А неяк пабачыў, што ў яе заплаканыя вочы... і такое нахлынула! Мы, немцы, сентыментальныя. Сабраў манаткі — і дамоў. Вось так,— закончыў Шнэйдар.— Не шукай ты шчасцядолі на чужым далёкім полі, як пісаў наш вялікі Купала.

Літаву яшчэ хацелася многае ў яго распытаць. Але, пазіраючы ў нявінныя вочы доктара, яму рабілася сорамна, усё адно як бы ён пачаў уцягваць у свае аферы і маленькіх дачок. А Літаў пытаў іншае:

— Скажыце, вось, дапусцім, чалавек эміграваў, папрасіў палітычнага прытулку. Ён можа быць спакойны за сваё жыццё? Іх ахоўваюць, такіх людзей?

— Па-мойму, ніхто там нікога не ахоўвае,— адказаў доктар.— Кожны сам па сабе і любому на любога начхаць.

У пачатку лютага ў Літава з'явіўся яшчэ знаёмы, стары Самусенка, якога ён прывёз да сябе, вадзіў у бункер, карміў абедам, знаёміў з Ірмаю, а на другі дзень казаў ёй: «Ты, дарагая, не ўяўляеш, што за цікавы чалавек! Як ведае мову, разбіраецца ў літаратуры! Вельмі, вельмі патрэбны чалавек»,— і не стрымаўся, каб не ўпікнуць жонку за тое, што так раптоўна выйшла з-за стала:

— Што здарылася з табою?

— Я не змагла... Я баюся такіх размоў, не магу больш слухаць пра гэтыя смерці, злачынствы, дуэлі. Апошнім часам ты так змяніўся! Стаў скрытны, нешта абдумваеш, хаваеш ад мяне! — казала Ірма ледзь не з адчаем у голасе.— Што адбываецца?!

— Ты абяцала не задаваць лішніх пытанняў.

— Як іх не задаваць, калі ў мяне адчуванне, што ідзе падрыхтоўка да нечага? Мне здаецца, ты задумаў нядобрае, і мне страшна ад гэтага. Ты перастаў казаць праўду. Прызнайся — ты мяне больш не кахаеш? У цябе нехта ёсць?

— Глупства.

— І гэты бункер — нашто ён табе?

— Ты выдатна ведаеш. Я там працую. Гэта мой кабінет, там сейф і некаторыя важныя дакументы. Там няма перапіскі з палюбоўніцамі... ды цяпер і не пішуць іх на паперы.

— Я табе не веру.

— Калі ласка, зайдзі сама ў любы час і пераканайся. Я нічога не хаваю. І прашу цябе — выкінь усё нядобрае з галавы! Нядобрых сакрэтаў у мяне няма, а пра добрыя неўзабаве даведаешся.

— Калі?

— Ад мяне не залежыць. Можа, вясной, можа, улетку.

А ў пачатку сакавіка зноў хваліўся жонцы:

— Яшчэ з цікавым чалавекам пазнаёміўся. Паэт Віктар Рак. Чула?

— Не.

— Учора быў у яго. Вельмі, вельмі цікавы і патрэбны чалавек. А дзіўны! Не верыцца, што такія яшчэ захаваліся. Старамодны рамантык, жэтон на метро захоўвае як памяць пра каханую дзяўчыну. Не могуць гэтыя паэты без сваіх выкрунтасаў.

— Але для чаго ты іх усіх збіраеш? Ты нібы калекцыянуеш іх!

— Так і ёсць,— з усмешкай адказваў Літаў.— Усе яны мне спатрэбяцца.

— Тое самае было ў Латвіі!

— Абсалютна правільна. Толькі там не атрымалася, а тут атрымаецца.

У апошні дзень сакавіка, з раніцы, Літаў не знаходзіў сабе месца. Схадзіў у бункер, яшчэ раз праверыў, як з ціхім чмокам, шчыльна, надзейна зачыняюцца за ім дзверы, потым сноўдаўся па доме. У дзіцячым пакоі дочкі нагуляліся ў пячору і ў першабытных людзей, цяпер старэйшая ляжала на жываце, падняўшы ногі, каля аранжавай палатачкі з адкінутым полагам, побач з кучай рассыпаных каляровых алоўкаў, і малявала, а ў палатцы меншая засяроджана калупалася ў бацькавым планшэтніку. Літаў забраў яго, пайшоў на кухню і пачаў праглядаць навіны. І раптам у яго зноў вырваўся той самы здушаны ўскрык, які не так даўно напалохаў Ірму,— смех то быў ці плач, страх ці радасць, не зразумець. Ён кінуў на мяккую канапу планшэтнік, падышоў да вакна і шырока расчыніў створкі. У пакой хлынула пахамі і гукамі вясна. Праз сіняе неба прабівалася сонца, заглядвала ў вокны. Вербы каля сажалкі былі ў зялёным вэлюме і з жоўтымі коцікамі. Сама свабода, само жыццё разам з гэтай вясною ўварваліся ў пакой. Літаў не бачыў, што жонка, пачуўшы яго ўскрык, увайшла, пастаяла ззаду і ціха выйшла, шчыльна прычыніўшы за сабою дзверы.

Частка чацвёртая

АСАВЕЦ

XI

За чатыры няпоўныя месяцы, з канца сакавіка па сярэдзіну ліпеня, Літаў пачаў імкліва аддаляцца ад жонкі. Ён пазбягаў яе і ўжо нават іранічным тонам не загаворваў з ёю — зусім нічога не расказваў, не тлумачыў, не дзяліўся. Ён нібы злаваў на яе, ці больш на сябе, за тую хвіліну залішняй шчырасці. Некалькі разоў тэлефанаваў Асавец; спачатку паведаміў, што не знаходзіць патрэбнага месца, потым — што пачаліся дажджы і ў балацяністую твань не ўлезеш, потым — што нечакана ўзяліся за ўмацаванне мяжы, на некаторых участках начаплялі відэакамер, робяць ледзь не «жалезную заслону», і ці не задаволіць Літава іншае месца, падалей ад мяжы, тады ён падшукае. «Мяжа мяне больш не цікавіць!» — нецярпліва адказваў Літаў. Сваю гістарычную кнігу ён сяк-так скончыў, і цяпер трэба было думаць, што з ёю рабіць. Ён хацеў правесці раўт, ці фуршэт, словам, нешта кшталту творчай вечарыны, як ён казаў — прэлюдыю прэзентацыі, на якую планавалася сабраць разам усіх «патрэбных людзей» — сваіх новых знаёмцаў, у тым ліку і Асаўца.

Часу яшчэ хапала, вечарына была прызначана на нядзелю 19 ліпеня, але Літаў задоўга пачаў насіцца з ёю, падбіраў меню, нават выглядаў на розных сайтах, якое будзе надвор'е, каб ведаць, на прыродзе збірацца ці ў памяшканні. Калі ж шчыра, ён, пакуль пісаў, астыў да гістарычнай тэмы, яна надакучыла яму як горкая рэдзька, і цяпер ён быў апантаны зусім новай задумкай. Літаральна за дзень да раўта пазваніў Асавец, паведаміў нарэшце, што «ўсё гатова, падсохла, умовы ідэальныя,— суха, добра».

— Заўтра ж выязджаю!

— Заадно паможаце мне вырашыць абяцаную справу,— нагадаў Асавец,— ці не так?

Назаўтра, у пятніцу раніцай 17 ліпеня 2017 года, Літаў стаяў пасярод кабінета на другім паверсе, аглядваў стол,

шуфляды, бегаў позіркам па кутках — ці не забыў чаго; тут увайшла Ірма. Яна зайшла ў кабінет бледная, рашучая. Русая грыўка спадала на лоб. Тонкія вусны падцiснуты.

— Я прашу, не едзь. У мяне вельмі нядобрыя прадчуванні!

— Як ты не разумееш,— непрыветна адказаў ён.— Я так чакаў гэтага дня. Трэба, трэба ехаць. Мы дамовіліся. Ну, Ірма.

— Гэта дабром не скончыцца. Я прашу, давай, пакуль не позна, з'едзем адсюль!

— Яшчэ што. Цяпер лягчэй ісці наперад, чым вяртацца. Ну, Ірма, вазьмі сябе ў рукі. Гэтыя дні табе трэба быць у форме. У нядзелю раўт, госці.

— Прабач, я давала слова не пытаць ні аб чым. Але скажы: што з тым тваім злым геніем? З чалавекам, які эміграваў?

— Сто разоў казаў — забудзься на яго. Лічы, што яго не было ніколі.

— Ты замешаны ў гэтым?

— Не кажы глупства.

— Не бойся, я не вораг табе, а саюзніца.

Ён схапіўся за галаву:

— У чым саюзніца? Гэтага толькі не хапала. Як я шкадую, што сказаў!

— Кажу ж, не бойся,— паўтарыла яна.— Я буду маўчаць, і ні адна жывая душа....

— Так я і ведаў, што гэтым скончыцца! Яшчэ б ты не маўчала! Ды цяперашнім часам не трэба ні фактаў, ні доказаў, дастаткова паказаць на чалавека пальцам, і яго віна ўяўная ператворыцца ў рэальную!

Яна здзьмухнула грыўку з вачэй.

— А магу і сказаць. Калі ты не зменішся. Калі не перастанеш гаварыць загадкамі і хаваць ад мяне нешта.

— Гэта... шантаж?

— Ты проста не пакідаеш мне выбару.

— Ірма, апошні раз прашу — забудзь! — яго голас і яго кінуты з-пад ілба пагляд нічога добрага не абяцалі.— Інакш можа здарыцца...

— Што?

— Нічога,— і выйшаў, амаль выбег, не развітаўшыся, не пацалаваўшы, не сказаўшы свайго звычайнага «на сувязі». Варта было яму выйсці, як плечы ў Ірмы апусціліся. У зялёных, колеру балтыйскай хвалі вачах з'явілася адчайная рашучасць чалавека, загнанага ў кут. «Далібог, я зраблю гэта»,— прашаптала яна, сціскаючы ў руцэ смартфон.

А Літаў хуткім крокам збег з ганка. Было без чвэрці восем раніцы. Лісты і трава блішчэлі расой на сонцы. Усё пахла, квітнела, шчабятала, радавалася жыццю. Ён пастаяў пасярод двара, каб супакоіцца, прыйсці ў сябе. Агледзець яшчэ раз сваю сядзібу. Заўсёды памагала такое сузіранне. Цяпер усё гэта яго, ніхто не адбярэ, не скране з месца. Белы дом пад зялёным дахам, па самыя вокны абвіты плюшчам і жаночым драбналістым вінаградам; двор — усе гэтыя альпійскія горачкі, клумбы, курціны (у думках ён пахваліў густ фларысткі, якую запрашала жонка раз на тыдзень), кветнікі з ружамі — звычайнымі садовымі, а таксама чайнымі і дзікімі, падобнымі да шыпшыны, з садовымі рамонкамі, з дэкаратыўнымі нізкарослымі жоўтымі з чорнай сярэдзінкай сланечнікамі, асобна кусты з бела-зялёнымі шарамі гартэнзій, крыху ніжэй, паўз дарожку да басейна — агрэст, сімвал мяшчанства, ён сам пасадзіў некалькі калючых кустоў і цяпер кожную раніцу хадзіў глядзець, як наліваюцца сокам паласатыя, бы вялікія каларадскія жукі, ягады; яшчэ ніжэй — карлікавыя вішні, ростам з чалавека, а пладоў, якія памерамі і смакам больш нагадвалі чарэшні, чым вішні, збіралі з кожнага дрэўца па два вядры; далей — зялёны падстрыжаны газон, за якім сіне-бірузовая авальная пляма басейна, зялёныя шаты вербаў каля сажалкі. І толькі аддалены ўчастак саду, з каравымі яблынямі, быў запушчаны, дзікі, зарослы травой па пояс. Яго па загадзе Літава знарок не чапаў садоўнік, каб даць усяму волю расці як хочацца. Ногі самі панеслі Літава туды. Нават дарожку да бункера цяжка было разгледзець сярод бур'яну.

У ніжняй частцы двара, гаспадарчай, дзе гараж і выезд з варотаў, блішчэў на сонцы вымыты джып. Шафёр, ма-

лады, дужы, у майцы, коратка падстрыжаны, з загарэлай шыяй і нават патыліцай, курыў, адышоўшы да агароджы, убок пускаючы дым, і нават рукой яго адганяў, бы адмахваўся ад камароў, разумеючы, што псуе гэтым дымам такі свежы ранак. Літаў падышоў да яго. Чакалі яшчэ аднаго пасажыра, доктаравага сына Хрысціяна Шнэйдара, які, даведаўшыся ад бацькі пра паездку Літава, папрасіў падвезці да Парычаў, як ён растлумачыў, «паром пафоткаць». Гэты Хрысціян, фатограф, фрылансер, калумніст, прадстаўнік моладзевага нацыянальна-патрыятычнага руху меў за плячыма ўжо дваццаць гадоў, але, як усе цяперашнія маладыя, быў да смешнага інфантыльны. Літаў сышоўся з ім яшчэ зімой. Пару разоў яны разам хадзілі на літаратурныя «імпрэзы», дзе Літаву вельмі спадабалася. Ён зразумеў, што дарэмна так ужо камплексуе наконт свайго няведання мовы. Маладыя тутэйшыя беларусы ведалі яе прыкладна на тым жа ўзроўні, што і ён, немалады ўраджэнец Цэнтральнай Расіі, з той толькі розніцай, што ніхто асабліва гэтым не замарочваўся. Размаўлялі яны па такім самым, як і ён, прынцыпе: механічная замена рускага слова на беларускае, а калі яны па гучанні супадалі, слова проста ламалася націскам — не доўгі, а даўгі, не коратка, а каротка. Літаў, наслухаўшыся, нават пачаў сумнявацца: можа, гэта ён гаворыць правільна, а яго рэдактары-настаўнікі, Рак з Самусенкам, памыляюцца? Не можа ж быць, каб усе ішлі не ў нагу, а два чалавекі— у нагу. На гэта Самусенка яму адказаў, што мала мець у галаве гугл-транслейт, трэба адчуваць прыродныя законы мовы, паводле якіх яна існуе, і тады яна зможа развівацца нават аўтаномна, незалежна ад таго, гаворыць на ёй чарка-шкварачнае насельніцтва, ці не. Літаў вырашыў адкласці разборку гэтых філалагічных тонкасцей на потым.

Хрысціян з'явіўся па-нямецку дакладна, секунда ў секунду без пяці восем, у шортах, кедах, у чорнай майцы з чырвонай «Пагоняй»; па знешнасці класічны сын сваёй нацыі: цыбаты, руды, кірпаты, залаціста-кучаравы, з рассыпаным па скулах і па носе рабаціннем. Роўна ў восем

выскачылі з горада. Шафёр, ведаючы што Літаў не любіць кандыцыянер, апусціў шкло. Ветрык, лёгкі, духмяны, летні. Ні ў якае параўнанне не йшло з тым, як Літаў ездзіў адзін, зімой. І чым далей ад Мінска, тым лягчэй рабілася яму. Каб не вісела над душою гэтая Ірма, усё астатняе складваецца цудоўна. Ён нарэшце матэрыяльна незалежны. Кніга яго гістарычная гатова. Задумка яго, мара яго неўзабаве пачне рэалізоўвацца. І ўсе прымуць у гэтым удзел: і паэт Віктар Рак, і дзед Самусенка, і зануда-філосаф Вадзім Асавец, і Ірма, і нават гэты вось рабы хлопец-немец, што сядзіць ззаду. Каб разварушыць яго, Літаў спытаў:

— А што, такі рэдкі паром? — і расслабіўся ў прадчуванні адказу, бо ведаў, як Хрысціян любіць пагаварыць, прычым, як і ў выпадку з Асаўцом, распавядае грунтоўна, цягуча-занудна, а Літаў любіў зануд, яму было з імі цікавей, чым з веселунамі.

Беглі за акном палі і дрэвы, малады Шнэйдар расказваў, як калыханку, што паромныя пераправы — цэлая галіна ў краязнаўстве, усе яны пабудаваны ў XVIII — пачатку XIX стагоддзя, нават патлумачыў прынцып іх дзеяння. Усё максімальна проста. Паром замацаваны канатамі, якія сілай рухавіка падцягваюць яго да аднаго або да другога берага. У Беларусі засталося іх усяго каля дзесяці, самы малы і вузкі — у Гродзенскім раёне, шлюз «Кужынец» Аўгустоўскага канала, самы шырокі — каля Петрыкава, «але Прыпяць так мялее, што гэты парычскі можа выйсці на першае месца».

— Як дзіўна,— перабіў Літаў.— Мы, рускі і немец, падымаем беларускую культуру.

— Нічога дзіўнага,— неахвотна адказаў малады Шнэйдар. У адрозненне ад старэйшага Шнэйдара ён чамусьці не любіў, калі размова заходзіла пра нацыянальнасць, нават, як падалося Літаву, ён чамусьці саромеўся сваёй.

Ён замоўк, і рэшту дарогі да Парычаў прадрамалі ў маўчанні. У Парычах былі а палове на дванаццатую. Спыніліся каля ракі. Літаў выйшаў разам з Хрысціянам. Даволі шырокая рака паміж двух зарослых дрэвамі і кус-

тоўем берагоў. Пахла рачной вадою. Літаў дыхаў на ўсе грудзі. Каля драўлянага вялікага прычала стаяў паром, ішла пагрузка на яго. Хрысціян адразу выцягнуў фотаапарат з заплечніка. Літаў убачыў прывязаны да прычала вянок са штучных кветак упярэмешку з жывымі летнімі.

— Недалёка патоняў чалавек,— патлумачыў Хрысціян.— Труп вадой прыбіла да берага, а сваякі прынеслі кветкі. Не ўсім падабаецца, кепскі знак, але так проста не прыбярэш жа.

На платформу заехаў міні-фургон, за ім грузавая машына з газавымі балонамі, следам — легкавая, чамусьці з латышскімі нумарамі. Людзі паселі на лаўку. Чалавек у скураной куртцы з-пад ілба пазіраў на Літава. Жанчыны смяяліся. Дзядзька ў бейсболцы, убачыўшы фотаапарат, паказаў Хрысціяну кулак. Паром марудна адчаліў ад берага. Хрысціян падзякаваў, запэўніў, што назад сам дабярэцца: «У мяне ў кожным горадзе сябры»,— развітаўся і знік. А Літаў усё стаяў і не мог адарваць вачэй ад вянка. Думаў, думаў аб нечым, пакуль не кашлянуў ззаду, нагадваючы пра час, шафёр, а потым крануў яго за плячо.

Пры пад'ездзе да мястэчка пазваніў Асавец, каб папярэдзіць, што затрымліваецца на дзялянцы, папрасіў пачакаць. Спыніліся ў цэнтры на плошчы каля знаёмага Літаву будынка. Літаў не быў тут летам, і цяпер апынуўся ў патрыярхальнай чароўнай атмасферы летняга паўсоннага мястэчка. З узвышанай плошчы відаць былі чырвоныя дахі сярод зеляніны садоў. Стары таўсценны вяз — Літаў не адразу прызнаў, што гэта тое самае тоўстае, як баабаб, дрэва, якое зімою падалося яму скалечаным і мёртвым,— цяпер зялёны, разложысты, з пераплеценым, як жыламі, ствалом у некалькі абхватаў, па ўсім — сведка напалеонаўскага, калі не шведскага нашэсця, са сваімі арэшнікавымі густымі лістамі кідаў цень на паўплошчы. У цені яго стаяла штук шэсць фураў. У самым цэнтры плошчы, каля помніка Леніну, на парапеціку круглай клумбы, зарослай чырвонымі, высокімі, падобнымі да гладыёлусаў кветкамі, сядзеў спінай да Літава хлопец, трымаючы за сядло

веласіпед. На ганку, які вёў адначасова ў аддзяленне міліцыі і аддзяленне сувязі, стаяў тварам да сонца міліцыянер без фуражкі. Пад ганкам сабака з хрустам грыз вялікі яблык, наступіўшы на яго лапай. Каля газетнага кіёска малады глуханямы «званіў» па тэлефоне па відэасувязі: круціў пальцамі, крыўляўся перад маніторам, нібы дражніў сам сябе ў люстэрку. Дворнік у аранжавай камізэльцы, згінаючыся, як мурашка, валок некуды тачку макулатуры, і колы падскоквалі на бруку. Недзе запрацавала газонакасілка, у адказ ёй азваўся малады ці дурны певень. Літаву ўспомнілася недзе чытанае: калі певень спявае ўдзень — да бяды. Ад акенца аўтастанцыі адышла, блізарука, праз акуляры разглядваючы білет, дзяўчынка-школьніца пятнаццаці-шаснаццаці гадоў, у белай маечцы, чырвонай спаднічцы да каленяў і белых красоўках. Светлыя, выпаленыя сонцам да рудога колеру кароткія валасы. Пасма спадала на акуляры. Крыху касалапячы, як умеюць толькі дзяўчынкі, яна пайшла да клумбы. Падышла да хлопца, паказала яму білет. Адкінула з вачэй пасмачку, усміхнулася. На фоне чырвоных кветак (сальвіі, успомніў Літаў), ды яшчэ падкрэсленыя чырвонай спаднічкай яе цнатлівыя ногі з белымі каленямі падаліся Літаву неверагодна прыгожымі. Ён машынальна дастаў з кішэні планшэт.

— Падобная на Ірму Айгараўну,— ціха сказаў шафёр ззаду.

Падабенства і праўда было, толькі не дэталямі, а хутчэй — паставай, авалам твару, колерам валасоў, нават прычоскай. Але на дзяўчынцы выразна ляжаў той ледзь улоўны флёр абаяльнасці, налёт дзіцячай мілаты, якіх ужо не было на Ірме, той самы флёр, які (не першы раз жанаты Літаў ведаў гэта не з тэорыі, а з практыкі), на жаль, так хутка знікае — як рачная свежасць, як туман, крануты ветрам. Яна спінай адчула, што на яе глядзяць. Падняла галаву. Яна паглядзела на Літава ўважліва, прыязна, як на старога добрага знаёмага. Вусны яе варухнуліся, нібыта яна хацела нешта сказаць, ды стрымалася. Хлопец таксама цераз плячо азірнуўся на Літава.

— Што, дзядзька?

Гадоў дваццаць пяць. Высунутая ўперад ніжняя квадратная сківіца. Непрыемная нахабная ўхмылка. На пульхных, чырвоных, амаль дзявочых вуснах малочная сліна. Бойкія вадзяністыя вочы глядзяць прыжмурана і разам з тым пільна, нібы вызначаюць цану: якім спосабам цябе можна абдурыць? А не атрымаецца, дык адабраць сілаю?

— Маю сястру бясплатна не здымаюць.

— Я і не збіраўся,— схлусіў Літаў, які якраз-такі паспеў зазняць.

— А то можам арганізаваць фотасесію. У любым выглядзе.

Літаў хацеў апраўдвацца, хацеў сказаць, што ў яго ўжо свае і дарослыя, і малыя, дзеці. Але не сказаў, а чамусьці яшчэ больш збянтэжыўся. Раскаваны ў адносінах з раўнагодкамі, з моладдзю ён ужо саромеўся свайго ўзросту. Ён нічога не сказаў, адвярнуўся і пайшоў да машыны.

— Багаценькі,— пачуў ён за спінай.

А да іх ужо роўным, ледзь не страявым крокам ішоў праз плошчу Асавец. Кароткая куртка, штаны, кепка з доўгім брылём, шнураваныя чаравікі, нават заплечнік — усё на ім было плямістага камуфляжнага колеру. «Business casual», прыйшло Літаву ў галаву, мо таму, што сёння была якраз пятніца. Яму падалося, што з зімы, пакуль яны не бачыліся, Асавец і паспрытнеў, і памаладзеў. З роўнай шчацінкай на шчоках і барадзе без прыкмет сівізны, да таго ж, яму пасавала гэтая амаль вайсковая форма. Як і паўгода назад, быў ён сур'ёзны і, не міргаючы, строга пазіраў на Літава. Павітаўшыся, прапанаваў спачатку паабедаць, «заадно вырашым маю справу, ці не так?» — а потым ехаць аглядаць востраў.

— Няўжо нарэшце я пабываю ў славутым рэстаране?

На душы ў Літава было амаль радасна; з той хвіліны, як ён убачыў дзяўчынку, настрой у яго не проста палепшыўся, а як бы нават крыху ўзвінціўся. Шафёр пайшоў разам з імі. Перад тым, як падняцца на ганак, Літаў азірнуўся. Дзяўчына ішла па вулічцы ўніз ад плошчы, хлопец марудна

ехаў побач на веласіпедзе: адна рука на рулі, другая ў дзяўчыны на плячы. Асавец прасачыў за яго позіркам.

— Спадабалася?

— Я жанаты чалавек,— з вінаватай усмешкаю адказаў Літаў.— Вы яе ведаеце?

— Хто яе не ведае. Між іншым, гэта мая будучая падчарка. Люда, ці, як усе завуць, проста Лю.

— Вось як? А гэты, з ёю, брат?

— Брат,— гмыкнуў Асавец.— Ён такі ж ёй брат, як я яму сват. Турма па ім плача.

— Яна купляла білет...

— Так. У нядзелю едзе да сяброўкі ў Мінск. Будуць разам паступаць.

— Пачакайце, як у нядзелю? Але ж і вы таксама выязджаеце ў нядзелю,— нагадаў Літаў.— Мы чакаем вас на раўце. Спадзяюся, вы не перадумалі? Будзеце ў мяне?

— Абавязкова.

— Тады чаму яна не з вамі?

Асавец буркнуў нешта, і Літаў не стаў распытваць.

XII

Зала невялікага рэстарана з трыма радамі круглых столікаў была амаль запоўнена людзьмі. Асавец зняў шапку, заплечнік і пашукаў вачамі вольны столік, як набожны чалавек, уваходзячы ў памяшканне, шукае абраз, каб на яго перахрысціцца. Збоку каля ўвахода былі два незанятыя. Селі за бліжэйшы. Белы абрус, кветкі-сурвэткі, прыборы-попелкі (сюды яшчэ не дакацілася хваля антытытунёвага змагання). Афіцыянт прынёс меню. Шафёр, разумеючы, што яго прысутнасць тут наўрад ці пажаданая, заказаў комплексны абед і перасеў за суседні столік. Літаў з Асаўцом засталіся ўдвух.

— Люблю такія правінцыйныя рэстаранчыкі,— узбуджана балбатаў Літаў. Прыступ нейкай дурной гуллівасці не пакідаў яго.— За мяжой такіх многа. У іх адчуваеш сябе багатым па-сапраўднаму. І што цікава, у такіх, як правіла,

смачней, прынамсі, не горш, як для мяне, чым у прэміум-класе. Ого, брэндзі, каньяк, нават грапа. Як вы наконт выпіць? Слухайце, я такога яшчэ не бачыў! — усклікнуў Літаў, углядаючыся ў меню, і зачытаў уголас:

Салаты

«Хрушчоў» (крабавыя палачкі, рыс, яйка, кукуруза).
«Русь» (грыбы, кура, цыбуля, яйка, гуркі).

Першыя

Расольнік ленінградскі з смятанаю.
Расольнік па-піцерску з грыбамі і смятанаю.

Другія

Свініна па-пскоўску з грыбамі і сырам.
Біф удмурскі (з грыбамі).
Зразы па-ленінградску.
Калабкі па-маскоўску.
Галубцы лянівыя «Уралачка».

Дэсерт

Морс «Паўночная ягада» (бруснічны, журавінны).

— Што вас дзівіць? — спачатку не зразумеў Асавец.

— Назвы! Скажыце, а можа вас прымушаюць? Да гэтых «раздолляў» і «пскоўскіх свінін»?

— Ды не. Рабалепства добраахвотнае,— адказаў з лёгкай пагардай Асавец, нібыта сам быў не мясцовы, а, як і Літаў, чалавек збоку.

Шафёр тым часам паспеў управіцца з баршчом і ўзяўся за біфштэкс. Калі Літаў з Асаўцом толькі пачалі, ён ужо скончыў абед і выйшаў. Неўзабаве Літаў, вочы ў якога заблішчэлі і яшчэ больш падабрэлі, забыўшы на пскоўскія назвы, размякчэлы пасля спіртнога і смачнай закускі, спытаў:

— Вы зусім не ўжываеце? Памятаю, зімой казалі, што можаце выпіць і закурыць.

— Чаму — вечарам, пасля працы. Да таго ж я не рызыкую даўно, ніякіх він, каньякоў, грапы; магу выпіць звычайнай таннай гарэлкі — менш верагоднасці, што «палёная», з натуральным таматным халодным сокам.

— Што ж, шляхетна, «Крывавая Мэры»,— цягнуў Літаў.— Скажыце, няўжо беларусы такія крыважэрныя?

— Чаму вы спыталі?

— Бо яны лічацца мяккай рахманай нацыяй, разам з тым гэта адзіная, калі не памыляюся, еўракраіна, дзе не адменена смяротная кара.

Літава не столькі цікавіў адказ, лепш сказаць, зусім не цікавіў, а хацелася проста паслухаць роўны манатонны занудны голас, як лёгкую музыку пасля абеду.

— На гэта ёсць тлумачэнне,— адказаў Асавец.— Мы спрынтары, а не стаеры, мы хочам усё і адразу, мы жывём кароткімі дыстанцыямі: дня, тыдня, месяца, года, дзесяць гадоў максімум.

Літаву падалося, што ён сядзіць у машыне, а Хрысціян з нямецкай пунктуальнасцю бубніць па-ранейшаму. Ён не столькі слухаў, колькі прыкідваў, як перакінуць размову на Лю. Самыя розныя варыянты круціліся ў яго хмельнай галаве. Можа, узяць яе з сабою? Пазнаёміцца і прапанаваць падвезці? А яшчэ лепш — адпусціць шафёра, самому купіць білет на маршрутку і ехаць разам з ёю. А пераначаваць у Асаўца. «Заадно папрашу пазнаёміць».

— ...У параўнанні з будучымі пакаленнямі мы, з усімі нашымі гаджэтамі і касмічнымі караблямі, знаходзімся прыкладна ў стане неандэртальцаў каля вогнішча, якое да таго ж яны яшчэ не зусім навучыліся распальваць; і гэтак, як нам цяпер дзіка і незразумела, чаму неандэртальцы не маглі прыдумаць запалкі, порах, кола, вадаправод, таксама дзіка і незразумела будзе нашчадкам: як?! у XXI стагоддзі яны не маглі справіцца з прымітыўнай анкалогіяй? яны нават не дажывалі да нейкіх ста гадоў? у іх яшчэ былі такія першабытныя формы існавання грамадства, як дзяржавы, падзеленыя межамі? Калі вам цікава,— прапанаваў раптам Асавец,— заставайцеся ў мяне начаваць. Пасядзім, пагаворым. Раскажу сёе-тое пра сябе. Абяцаю, што вам як творчаму чалавеку будзе цікава. З маёй будучай другой палавінкай пазнаёміцеся.

— Я, калі шчыра, сам хацеў напрасіцца.

Літаў дастаў планшэт, каб папярэдзіць жонку; затым успомніў, што яны пасварыліся. Ён пагладзіў пальцам па маніторы і паказаў Асаўцу:

— За гэты здымак мне ледзь не папала. Вось мая жонка, а вось — ваша будучая падчарка. Праўда, падобныя?

— Усе маладыя падобныя знешнасцю, усе прыгожыя — чаго не скажаш пра характар.

Асавец азірнуўся на афіцыянта, які за суседнім столікам прыбіраў пасля шафёра пустыя талеркі і выцягваў шыю, таксама спрабуючы зазірнуць у планшэт.

— Яшчэ што-небудзь? — запытаў афіцыянт.

Заказалі каву: Асавец слабай, а Літаў самай, як толькі можна, моцнай і без цукру. Зноў падсунуў Асаўцу планшэт.

— Дык што не так з характарам?

— Адорва, якіх пашукаць.

— Што вы кажаце! А здаецца такой безабароннай, у акулярах.

— Хуліган у акулярах удвая больш небяспечны, гэта вам кожны міліцыянер пацвердзіць.

Літаў паварочваў планшэт і так і сяк, не перастаючы любавацца здымкам. Асавец тым часам распавядаў манатонна, што гэта «гультайка, якіх свет не бачыў», і ўсё адно хутка вернецца сюды, «на жаль».

— Чаму на жаль? Калі не сакрэт?

— Сакрэту ніякага няма. Мы не ўжываемся разам. Вось я і шукаю, хто б мне памог. І ёй заадно. Некалі зімою вы сказалі, што набіраеце для нечага людзей... Дык бярыце яе.

Радасць разам з алкаголем разліваліся па целе Літава.

— Памажыце куды-небудзь упіхнуць. Абы не вярнулася. Я дам вам грошы, а вы нібыта ад свайго імені, па сваёй ініцыятыве прапануйце іх.

— А вы самі?

— Ад мяне яна ніколі не возьме. Яна мяне не пераносіць, нават размаўляць са мной не хоча. Яна хутчэй прыме з рук абсалютна чужога чалавека.

— Але чаму?

— Ганарлівы характар. Вы сказалі — падвезці. Яна ніколі са мной не сядзе. І што я ёй зрабіў такога? — голас яго ўздрыгнуў.— Ставіўся як да роднай дачкі...

— Прашу прабачэння, што лезу не ў сваю справу,— сказаў Літаў,— але што вы хацелі? Каб вам на шыю кідаліся? Наколькі я разумею, вы чужы чалавек у чужым манастыры. Можа, ёсць іншыя прычыны?

Асавец адвярнуўся і пакашляў сваім траскучым кашлем, прыкрываючы рот сурвэткай, потым уперыў у Літава немігаючыя вочы.

— Разумееце, я нармальны чалавек, здаровы мужчына. Калі мы будзем жыць разам, калі яна ўвесь час будзе ў полі майго зроку, я магу і не ўстаяць перад спакусай. Часта бывае, што непрыязь такога роду канчаецца самым жарсным каханнем. Уся гэтая двухсэнсоўнасць, калі айчым жыве разам з дзяўчынкай-падлеткам, ды яшчэ з такімі паводзінамі, калі ў яе ўсё на лбе напісана... Я не хачу выпрабоўваць лёс. Трэба ізаляцыя ад жадання, разумееце?

— Не зусім. Хіба жаданне, простае чалавечае жаданне — зло?

— Абсалютнае. Большае за дзеянне. Ва ўсіх філасофскіх і рэлігійных вучэннях так. Дзеянне ўсяго толькі адзін учынак, хіжыя думкі вядуць і рана ці позна прыводзяць да мноства ўчынкаў.

Літаў раптам пачырванеў. Рукі яго пачалі перастаўляць на стале, мяняць месцамі сальнічку і перачніцу.

— А вось скажыце... Добра, я канкрэтызую. Напрыклад, я пішу мастацкі твор. Дапусцім, кінасцэнар. Пракручваю ў галаве розныя сітуацыі, стаўлю сябе на месца герояў. І там адзін з галоўных герояў, высокі чыноўнік, так зашугаў зводнага брата, па натуры добрага, інтэлігентнага, мяккага, які да таго ж залежаў ад гэтага чыноўніка матэрыяльна, што гэты брат захацеў яго смерці, усяго толькі захацеў, заўважце,— і так і адбылося: у самым цэнтры адной еўрапейскай сталіцы сярод белага дня яго забіваюць!

— Што ж у тым дзіўнага? Няма ніводнага чалавека ў свеце, які хоць раз у жыцці пры пэўных абставінах не

пажадаў бы смерці другому чалавеку. Калі-небудзь гэта супадае — намер і выкананне. Галоўнае, каб не было сведкаў,— заўважыў Асавец.— Бо тады ў вашага героя з’явіцца іншы галаўны боль — як пазбавіцца ад сведкаў. Ці не так? Што да мяне, мяне куды больш цікавіць забойца не містычны, не патэнцыяльны, а рэальны. Я, канечне, нагледзеўся ў міліцыі рознага, але многа б даў, каб пабыць усярэдзіне такога, зразумець, як ён жыве, што адчувае...

— Нічога ён не адчувае,— рэзка сказаў Літаў.— Есць, спіць і радуецца жыццю!

Усталявалася маўчанне. Асавец, нібы першы раз бачыць, разглядваў афіцыянта, які ўсё круціўся побач, хаця ў ім нічога такога асаблівага не было: чырвоны фартух-пярэднік, таблічка з іменем і з лагатыпам кавярні (руская тройка коней), кашуля ў клетку з кароткімі рукавамі, кароткая прычоска, джынсы, папружка, гадзіннік. Літаў упарта глядзеў у планшэт, то зводзіў пальцы, нібы выцягваў тонкую нітку, тым самым выяву змяншаючы, то лёгкімі пстрычкамі расшыраў яе.

— Вы казалі, у вас да мяне просьба? — нарэшце парушыў маўчанне ён.

— Дык гэта яна і ёсць. Наконт падчаркі. Каб вы памаглі пазбавіцца ад яе. Скажыце, што вам пільна, кроў з носа трэба, каб яна ўладкавалася ў Мінску. Прапануйце грашовую дапамогу, наабяцайце, што паможаце стаць зоркай на Еўравізіі, не ведаю. Маладыя любяць славу і поспех.

— А як маці? — спытаў Літаў.— Звычайна такіх хуліганістых любяць.

— Не той выпадак. Маці не ведае, як ад яе пазбавіцца.

— Вось як? Тым не менш зразумейце мяне правільна, вы асоба зацікаўленая, а я хачу перастрахавацца, атрымаць ад маці афіцыйны дазвол.

— Увечары вы яго атрымаеце,— запэўніў Асавец.— А зрэшты, нашто чакаць вечара? Яна тут побач працуе ў раёнцы. Кожны дзень ходзіць дамоў абедаць. Цяпер дзве гадзіны, акурат павінна вяртацца. Я вас і пазнаёмлю.

Па выхадзе з рэстарана Асавец параіў Літаву купіць раёнку. «Ёй як супрацоўніцы газеты спадабаецца, што

чужы чалавек чытае яе прадукцыю». Літаў паслухмяна пайшоў да кіёска. Непадалёку ў халадку пад вязам каля джыпа таптаўся шафёр з мабільным каля вуха. Літаў пачакаў, пакуль ён дагаворыць, папрасіў набраць Ірму па сваім тэлефоне. Той жа вынік. «Вы звязаліся з галасавой поштай... пакіньце паведамленне». Літаў пазваніў гувернантцы, тая спакойным голасам адказала, што з дзецьмі ўсё ў парадку, а дзе Ірма, яна паняцця не мае. Літаў значна павесялеў. Калі ён вярнуўся, убачыў — жанчына ў блакітных джынсах і сіняй блузцы лёгкім крокам падыходзіла да іх. Каштанавыя валасы забраны пад плецены саламяна-залацісты тонкі абручык. Чысты твар, гладкія поўныя белыя рукі, блізарукія добрыя вочы. Крыху паўнаватая, затое надзвычай зграбная, уся нейкая хатняя, утульная, ахайная, дагледжаная — такімі бываюць удовы, з якімі раней жаніліся з-за багатай спадчыны пры дапамозе гаварлівай свахі. Яна падыходзіла, напярод усміхаючыся, і ўсмешка адрасавалася не толькі Асаўцу, але і яго таварышу. Калі Асавец буркнуў: «Пазнаёмцеся, мой партнёр па лясным бізнесе, акрамя таго творчы чалавек, ці не так?»,— яна, энергічна паціскаючы Літаву руку, з усмешкаю сказала:

— Ведала я аднаго творчага чалавека.

— Вы тут пагаварыце, а я... мне трэба,— і Асавец пайшоў да джыпа.

Літаў з Міхайлоўскаю прыселі за столік пад чырвона-белым «кока-колавым» парасонам, адгароджаным дэкаратыўным плоцікам. Літаў, трымаючы перад сабой, як мікрафон, газету, сказаў першае, што было ў галаве:

— Вашая дачка падобна на маю жонку ў маладосці...

— Мала хто на каго падобны. Я таксама падобная на Брытні Спірс. У свеце двесце пяцьдзясят восем двайнікоў у кожнага чалавека.

— Скажыце, яна гаворыць па-беларуску?

— Разоў у сем лепш, чым па-руску.

— Я маю да яе інтарэс,— не стаў прыдумляць нічога новага Літаў,— і хачу вашага дазволу, каб прапанаваць ёй...

— Няўжо руку і сэрца? — яна прыняла гэты паўжартаўлівы тон.

— Не, не руку і сэрца, а адну цікавую справу.

Літаў з усёй ветлівасцю, на якую быў здатны, растлумачыў, чаго ён хоча. Можа быць, калі-небудзь, як усё атрымаецца, ён будзе здымаць фільм. У яе дачкі ўсе дадзеныя кінаактрысы. Яна ідэальна падыходзіць на ролю гераіні. Хай спакойна вучыцца, ён нават згодны авансам аплаціць яе вучобу, бо ў курсе, што на бюджэт яна наўрад ці пройдзе. Ён увогуле хоча апекавацца ёю і памагаць матэрыяльна, абы толькі яна была ў полі яго зроку.

— Забірайце,— нечакана проста сказала Міхайлоўская.— Хоць цяпер. Калі шчыра, я ўжо сама думала, у чые б надзейныя рукі яе перадаць. Толькі не факт, што яна сама захоча.

— ?

— Дзіўная яна. Можа, нельга так пра родную дачку, але... яна цураецца людзей. Думае, што прыносіць няшчасці. А калі шчыра — гэта гора маё. Часам я думаю, лепш бы ў мяне быў хлопчык. А тут яшчэ гэты ельскі сябар збівае з толку, уцягвае ў свае цёмныя справы, ён яе звядзе нарэшце,— шчыра дзялілася яна з ледзь знаёмым чалавекам.

— Тады тым больш. Я яе вызвалю ад уплыву. У нас яна будзе ў іншай кампаніі. У нас усе інтэлігентныя паважаныя людзі, вучоныя, літаратары. Прафесар філалогіі Самусенка, паэт Віктар Рак, доктар Шнэйдар Хрысціян Андрэевіч, жонка яго — Ванда Вацлаваўна...

— Вы сказалі — паэт?

— Вы яго ведаеце?

— У школе некалі вучыла.

— Сапраўды, чаму я здзіўляюся... Беларусь малая, народ ведае сваіх паэтаў. Дарэчы! — Літаў успомніў, што яшчэ з вясны, калі ездзіў да Рака, кніжка так і валялася ў джыпе.— Я на хвілінку.— Ён збегаў да машыны, каля якой Асавец з шафёрам мірна размаўлялі, знайшоў кніжку — яна так і ляжала ззаду над сядзеннем каля аптэчкі; вярнуўся: — Вось... Важу з сабою. Цяпер бачыце як — творчыя людзі побач з аўтографам пішуць кантакты, е-мэйл, нумар тэлефона...

Міхайлоўская падушачкамі пальцаў пагладзіла вокладку.

— Ён мне рэдактар,— не стрымаўся, каб не пахваліцца, Літаў.— У якасці дапаможнай тэхнічнай сілы. Я пішу

важную навукова-гістарычную працу, а ён так, на падхваце, коскі мне расстаўляе.

— Скажыце, як ён жыве?

— Як усе людзі — святым духам.

— А матэрыяльна? Канечне, свой дом, зала з камінам?

Літаў падумаў і сказаў:

— Ды не, звычайная кватэра.

— Сям'я, дзеці?

— Ды не, адзін. Рамантык, лётае ў аблоках. Цацкі розныя калекцыянуе, напрыклад, жэтон на метро...

— Жэтон?

І яго ўразіла перамена ў яе адразу запунсавелым твары, яе ўсмешка, ад якой яна і памаладзела, і папрыгажэла, і яшчэ больш падабрэла.

На развітанне дамовіліся, што Літаў увечары прыйдзе ў госці — пазнаёміцца, і там усё абмяркуюць, абгавораць.

— Да вечара,— сказала Міхайлоўская.

Яна пайшла. Літаў дастаў планшэт. Пуста. Ад спіртнога, ад моцнай кавы, ад усіх гэтых спраў у яго шалёна білася сэрца. Яго нават не насцярожыла, не падалося дзіўным, што яна так лёгка пагадзілася. І ўвогуле, усё ў яго неяк падазрона складна атрымлівалася — не паспее падумаць, а жаданне ўжо збываецца.

XIII

Востраў быў паміж дзвюма рэчкамі, Жалоннню і Славечна. Кіламетр у даўжыню і столькі ж у шырыню. З аднаго боку — балоцістая нізіна, зарослая высокім багуном, буякамі, лазняком і крушыннікам. Асавец паказаў Літаву, як на крушынавых дрэўцах аднačасова растуць чорныя, чырвоныя, зялёныя і белыя ягады, потым дастаў з заплечніка паляўнічы нож, злупіў паску крушынавай кары (ствол на тым месцы адразу стаў аранжавым) і даў Літаву панюхаць: «прымяняецца ў касметалогіі». Пах сапраўды быў надзвычай прыемны. Далей нізіна пастулова пераходзіла ў сапраўднае балота. Пад нагамі ляжаў мяккі сівы мох,

у якім пракідаліся дзе-нідзе невялікія, як бы хто капнуў рыдлёкаю, «вакенцы». Над адным такім «вакенцам» Літаў нагнуўся і ўбачыў, што вада, якая здавалася нерухомай, насамрэч жыве, пульсуе, падымаецца знізу, і ў ёй марудна кружацца павучок і сухая хваёвая шыпулька. Асавец тым часам расказваў, што адразу за балотам — Украіна, а збоку, праз рэчку — Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік.

— Тут цэлая гісторыя. Вам як творчаму чалавеку павінна быць цікава,— і расказаў, што прыблізна вунь там, на мяжы запаведніка, хаваючыся ад высялення, ад людзей і ад уладаў гадоў трыццаць пасля Чарнобыля жыў поўным дзікуном, на падножным корме і на лове рыбы, стары дзед. У краму не хадзіў, пенсію не атрымліваў. Калі журналісты выпадкова яго адшукалі, яму было за дзевяноста, ён абсалютна нічым не хварэў і абсалютна нічога не ведаў: ні пра развал Саюза, ні што Беларусь цяпер існуе самастойна.

З другога боку востраў забіраўся ўгару. Высокі бераг, глiністая зямля, круча. Унізе цякла Жалонь. Каля берага, аблізанага хвалямі, плаваў змыты вадой мурашнік. Літаў пастаяў з краю, гледзячы, як мурашы і ў вадзе памагаюць адно аднаму. Месца сапраўды было ідэальнае. Калі не лічыць следу даўняга вогнішча, практычна дзікі востраў паміж багны, імшараў і вады. Але Літаў асаблівага захаплення не выказваў, увогуле слухаў няўважліва, адказваў недарэчы і ўсё зазіраў у планшэтнік.

— Цэлы дзень не магу дазваніцца да жонкі. І ад яе нічога.

— Тут сапраўды трафік прападае.

— Ды не, баюся, не ў трафіку справа.

Хмель праходзіў і адначасова ўзрастаў неспакой. «Гэта будзе ўсё жахліва, гэта будзе ўсё жахліва»,— круцілася ў яго галаве дурной мелодыяй. Потым ішлі да лясной дарогі, дзе чакаў іх шафёр з машынай, прадзіраліся праз хмызняк, адгінаючы пружыністыя галінкі, якія балюча сцябалі па вачах. Назад у мястэчка вярталіся іншым маршрутам, па, як назваў Асавец, «старым Кіеўскім шляху».

— А ведаеце, мы ўжо разоў дзесяць парушылі закон аб дзяржаўнай мяжы,— сказаў ён.— Тут яна зігзагамі, як зубы

ў пілы, то Украіна залазіць у Беларусь, то наадварот, вось мы і едзем то па беларускай тэрыторыі, то па ўкраінскай.

Але і на гэта прамаўчаў Літаў. Крыху зацікавіўся ён, калі праязджалі праз дуброву, цэлы лес, цёмны ад ценю. Джып асцярожна перавальваўся праз тоўстыя карані. На палянцы пры дарозе, у прастакутніку загародкі з чатырох жэрдак, стаяў крыж, абвязаны белымі ручнікамі з чырвонай вышыўкай, зверху дзве дошкі стрэшкаю. Такія можна ўбачыць ледзь не ў кожнай палескай вёсцы на разгалінаванні вуліц. Асавец пачаў расказваць, што гэта сакральнае месца, нехта некага тут у вайну пастраляў — ці то венгры партызанаў, ці партызаны венграў, але мясцовыя людзі на гэтым месцы ўкапалі памятны крыж. Такіх многа па лесе, і тут, і на украінскай тэрыторыі, і пад кожным пахаваны чалавек. Цікава й тое, што некаторыя крыжы маюць уласнае імя — напрыклад, гэты называецца Каралеўскі. Калі нешта здарыцца з крыжом, у бліжэйшую вёску прыйдзе няшчасце, таму яны вельмі шануюцца. Калі крыж згнівае, ставіцца новы, «ці не так?»

— Хто ж гэта робіць? Укопвае новы крыж і мяняе ручнікі?

— Мясцовы люд. Раней думалі, што дзед. Але дзед памёр, а крыж за адну ноч паўстаў новы, з новенькімі даматканымі ручнікамі.

Нарэшце джып выехаў з лесу на пагорак. Унізе рассцілаўся луг. Адсюль, з пагорка, ён нагадваў вялікую разгорнутую кнігу: па баках узвышэнні, пасярэдзіне лагчына. У лагчыне, паўз перасохлы ручай, была насыпная дарога. Калі спусціліся і марудна паехалі па ёй, Літаў зірнуў знізу ў вакно. Два чалавекі, хлопец з дзяўчынаю, ішлі лугавой сцежкаю. Хлопец вёў у адной руцэ веласіпед. Дзяўчына падняла на лоб акуляры, як звычайныя сонечныя, і сонца адбівалася ў іх дзвюма светлымі плямкамі. Маладая кобра, якая пачула гукі чаратовай дудкі. Літаў загледзеўся на гэтую пару і раптам падумаў, што сам ужо ніколі ў жыцці не пройдзе вось так лугам з дзяўчынаю. Але, калі б можна было, што б ён аддаў за такую магчымасць? І сам

сабе адказаў — усё. Усё сваё мінулае, цяперашняе і будучае, матэрыяльнае ды і духоўнае таксама.

Пры пад'ездзе да мястэчка спыніліся каля лесакамбіната, Асаўцу трэба было забегчы туды. Літаў у каторы раз зірнуў у планшэтнік.

— Гэта мне ўжо зусім не падабаецца,— прамармытаў ён.— Жонка цэлы дзень маўчыць. У мяне самыя нядобрыя прадчуванні.

— Так,— сказаў шафёр.

— Тэлефон не ловіць толькі ў адным месцы — у бункеры, у лёхах. Я ведаю, што туды не патрапіць. Але цяпер пачынаю сумнявацца. Я хадзіў туды раніцай... Можа, забыў выставіць код? Можа, увогуле не зачыніў дзвярэй? Туды можна патрапіць без ключа, а вось выйсці... Калі яна туды зайшла, яна не выберацца. Гэта ўсё будзе жахліва!

— Пазваніце каму-небудзь.

— Ніхто без мяне не адчыніць.

— У любым выпадку вам няма чаго баяцца. У вас жалезнае алібі.

— Якое яшчэ алібі? Што за крымінальны жаргон? Чаму ты так на мяне глядзіш? Ці не думаеш, што я знарок пакінуў дзверы адчыненымі?

— Я думаю, нам трэба тэрмінова вяртацца ў Мінск,— сказаў шафёр.

Частка пятая

ЛЮ

XIV

Лю ніколі не сумнявалася ў сваім дары. Адчуваць яго яна пачала рана. Ёй не было яшчэ і чатырох, калі яна стамілася ад вечных сварак бацькоў і аднойчы пажадала, каб бацька знік. І яго не стала — з'ехаў. Пачалося іншае жыццё, ціхае, спакойнае. Яна запомніла тады, што жаданні могуць, калі моцна захацець, збывацца. У першым класе

ў суседкі па парце прапаў мабільнік, яна чамусьці падумала на Лю і паскардзілася настаўніцы, а тая чамусьці паверыла ёй; былі ўгаворы прызнацца, быў нават нейкі агідны вобшук. Упершыню ў жыцці яна зазнала боль несправядлівасці. Тэлефон неўзабаве знайшоўся, ён і не прападаў, сяброўка забыла яго дома. Але было позна, Лю паспела загадаць жаданне. У выніку настаўніца разбіла акуляры, спіхнуўшы іх локцем са стала, а сяброўка перавялася ў іншую школу, а неўзабаве іх сям'я і зусім з'ехала ў Мінск. То быў нязначны, дзіцячы выпадак, несправядлівасць яшчэ не паспела пусціць карані, таму і кара была адпаведнай — маленькай. Аднак Лю запомніла і гэта.

У дзесяць гадоў па лініі «чарнобыльскага аздараўлення» яна ўпершыню патрапіла за мяжу, у Германію. Яна думала, што там жывуць зусім іншыя людзі, іншыя дзеці, якіясь бясполыя райскія істоты, якія толькі ўсміхаюцца, усе ад малога да вялікага ведаюць сваю прыгожую нямецкую мову,— як яна марыла яе вывучыць! Гаспадары аказаліся казахстанскімі немцамі, дома паміж сабой размаўлялі па-руску. Толькі іхні сын, ветлівы руды прышчаваты немчык (падлеткі ўсе прышчаватыя ў такім узросце, а нямецкія яшчэ і ўсе з рабаціністымі тварамі), неяк аж занадта ахвотна ўзяўся яе вучыць. На другі дзень ён павёў яе паказваць горад. Яны ішлі па вуліцы, яна паказвала на будынак, шыльду, дрэва, чалавека, машыну, пад ногі, а ён называў, як гэта па-нямецку. Па дарозе да іх далучаліся яшчэ дзеці, чамусьці ўсе хлопчыкі і ўсе з веласіпедамі. Ішлі, пакуль не апынуліся на ўскраіне, на нейкай пустцы сярод развалін і лопухаў. Ёй на імгненне падалося, што яна дома. Такая самая бітая цэгла, глог, чартапалох, шыпшына, пустыя пляшкі і акуркі ў пажухлай траве, выбухі рознакаляровых мух з-пад ног. Тут, у гэтым глухім месцы, хлопчыкі раптам абступілі яе ўсе разам і, як па камандзе, замоўклі. Яна нарэшце заўважыла іх прагныя позіркі, учула небяспеку ў гартанных незразумелых словах. Гаспадарскі сын, чырванеючы, пераклаў, што хочуць яны ад яе фота, усяго толькі зняць яе на мабільнікі, і што згодныя нават заплаціць

за гэта. Яна не столькі спалохалася, колькі адчула ледзь не да слёз расчараванне. Усё так проста, раю не было. Словы чужой прыгожай мовы, аказваецца, маглі абазначаць тыя самыя, што і дома, саромныя, непрыстойныя рэчы. Яны стаялі і моўчкі разглядалі яе, пакуль чужы дарослы голас ззаду не гаркнуў: «Вас іст дас?!» Усе кінуліся ўрассыпную, акрамя яе, і высокі стары немец, падобны да іхняга школьнага вахцёра, нават у такім жа сінім, з бліскучымі гузікамі, форменным касцюме і ў такіх самых тупаносых літых чаравіках, павёў яе, моцна трымаючы за руку, і па дарозе ўсё выгаворваў, выгаворваў нешта. Яна пакорліва прывяла яго дамоў, дзе да яго далучыліся гаспадар з гаспадыняй; цяпер яны ўсе ўтрох называлі яе «распустай», папракалі, што яна не цэніць таго незямнога шчасця, якое ёй выпала, а прывезла сюды «свае гідкія звычкі», пагражалі расказаць яе куратарам,— а неўзабаве ў двор прыцёгся са знявечаным веласіпедам, кульгаючы, увесь у сіняках, драпінах, у слязах і смаркачах іхні сынок.

Праз два гады было другое замежжа, Італія. На гэты раз яе пасялілі ў прыватным доме. Тут хоць нешта падобнае было на «аздараўленне», такое, якім яны, беларускія «чарнобыльскія» дзеці, яго ўяўлялі: падарункі, крамы, сонца, мора. Але яна ўжо не бачыла ва ўсім гэтым раю, як ні напружвала вочы. Ёй здавалася, што ўсё такое самае, як тут, можна зрабіць і ў сябе дома, абы грошы. У дворыку, па ўсім перыметры *patio*, раслі ружы і вінаград. Даглядаць іх прыходзіў стары садоўнік у шортах і ў паласатай майцы, гарбаты, з доўгім вострым носам, Пінокіа на пенсіі. Пару разоў з ім сутыкнуўшыся, яна ўбачыла, што ён пазірае на яе таксама, як і нямецкія хлопчыкі, прагна і ліпка, нават сліна цякла па ніжняй губе. Яна не стала чакаць, калі яе зноў пачнуць вінаваціць у распусце, і назаўтра ўдзень, у самы санцапёк, стары садоўнік грымнуўся тварам уніз, падмяўшы сабой ружы і вінаградную лазу, а неўзабаве ляжаў у чаканні «хуткай дапамогі» на тапчане ў кутку *la terrazza*. Яго яшчэ больш завостраны нос тырчаў у неба з нямым дакорам, у чорных паўднёвых вачах застыла скруха.

Вось тады яна зразумела, і сама паверыла ў свой дар, хай і нядобры — прыносіць людзям няшчасце.

Гэта так яе напалохала, што дома яна расказала пра ўсё матулі. Тая толькі пасмяялася. «Ды ў кожнага чалавека кожны дзень ведаеш колькі такіх выпадкаў? Сёння ў краме на касе мяне аблічылі, касірка пайшла перапраўляраць і паслізнулася на мокрай падлозе — а калі б упала?» Але дачка ўжо ведала, што можа ўплываць на людзей, што яны ў яе ўладзе.

У чатырнаццаць гадоў яна зразумела, што яе абаяльнасць, якую зайздросныя сяброўкі называлі проста «вядзьмарства», у яе ўяўнай даступнасці. Дзіцячы тварык, ямачкі на шчочках, уменне чырванець, любімае слова «лёгка», акуляры з мінусавымі лінзамі — як яна ненавідзела іх спачатку і як хутка зразумела, што і мінус іх можна пераварыць у плюс: яны рабілі яе яшчэ больш безабароннай і, адпаведна, прыцягальнай. Ёй пасавала роля сціплай сарамлівай дзяўчынкі (тое, што па-ўкраінску «скромниця»), яна выдатна ўмела гуляць у нявіннасць, какетнічаць, страляць вочкамі, апускаць іх; пры патрэбе слёзы лёгка закіпалі на яе пушыстых вейках, і гэтак сама лёгка праз імгненне ўсмешка асвятляла яе наіўныя зялёныя блізарукія вочы, а дзіцячыя свежыя вусны, здавалася, заўсёды гатовы былі пацягнуцца да пацалунка. У такі момант любы мужчына, гледзячы на яе, не сумняваўся, што вось яна ўся перад табою, бяры і рабі з ёю, што хочаш.

Тады ж у яе з'явіўся сябар. З блізкага Ельска, старэйшы на дзесяць гадоў. Некалі вучыўся ў Мінску, кінуў вучобу, цяпер нідзе не працаваў, жыў з таго, што вазілі з бацькам у Мінск на продаж, гледзячы па сезону, то гуркі, то бульбу, то цыбулю, то клубніцы, то грыбы. Дарослы хлопец, сапраўдны мужчына, быў ён адначасова цынік, рамантык і авантурыст — хаця б таму, што не пабаяўся звязацца з ёю; да таго гэта быў першы ў жыцці чалавек, які яе ўважліва выслухаў, не перабіваў, не смяяўся, падтакваў і, як ёй падалося, паверыў ёй. І яна растала, паплыла і амаль закахалася. Калі ён прапанаваў: «У мяне ёсць машына, праўда, дабітая, але нас вытрымае, давай паедзем проста

гуляць, вандраваць, паглядзім свет, людзей, я даўно так марыў»,— яна з радасцю на гэтую лалітаўскую авантуру згадзілася (кніжка была да таго часу прагна праглынутая). І былі два вар'яцкія тыдні: начоўкі ў матэлях, каўчсёрфінгам у чужых кватэрах, у машыне, каля вогнішча, у палатцы, пакуль не апынуліся ў Латвіі, адкуль — экстрадыцыя і вяртанне дамоў; маці тады крычала: я страціла дачку!— але, па шчырасці, яна яе хутчэй набыла. Лю змянілася, прыцішэла, нават паспрабавала лепш вучыцца, але зусім не йшла ў яе вучоба; напрыклад, замежныя мовы даваліся з цяжкасцю, затое беларуская — лёгка, і калі маці з часам памаленьку пачала далучаць яе да газеты, у яе выявіліся яшчэ і рэдактарска-карэктарскія здольнасці. У яе быў густ, ці, хутчэй, нюх. Не ведаючы ніводнага правіла, яна тым не менш адгадвала самае дакладнае напісанне слова. Можа, ад таго, што многа чытала.

Так прайшлі тры гады, за якія адбыліся вялікія змены. Да здзіўлення дачкі, у маці з'явіўся мужчына, яна вось-вось павінна была выйсці замуж. Ні яна сама, ні яе будучы чалавек не хавалі, што амаль дарослая дачка ім замінае. Яна ведала, што калі цяпер паўторыць свой лалітаўскі подзвіг і з'едзе з кім-небудзь куды-небудзь, увогуле знікне з вачэй — і маці, і патэнцыяльны айчым будуць толькі радыя. Усё часцей маці заводзіла з ёй такія размовы: «Вось ты ўжо і дарослая. І што думаеш рабіць? Кім хочаш быць?»

— Нікім,— адказвала шчыра Лю.

— Павінна ж ты хоць аб нечым марыць!

— Ні аб чым.

— Ну, які ў цябе талент?

— Рэдкі,— пасміхнуўшыся, адказвала Лю.

— Менавіта?

— Я ўмею чакаць.

— О, дарагая, чакаць — самае цяжкае. Ясна, што перакладчыцай, сцюардэсай, спявачкай, бізнес-вумэн, мадэллю ты наўрад ці хочаш быць. Нават сацыяльныя сеткі цябе мала цікавяць, толькі кнігі. Як ты думаеш жыць у цяперашнім свеце?

— Лёгка.

— Гэта цяпер лёгка, пакуль абаяльнасць. Але нішто так хутка не знікае, як абаяльнасць. Гора ты маё. Куды мне цябе падзець? Можа, на журфак хочаш? Я магла б узяць ад газеты накіраванне. Грошы на платнае дастанем.

— Ад яго я нічога не вазьму.

— Усё гонар,— уздыхала маці.— Табе здаецца, што *ён* не любіць цябе, яму здаецца, што ты не любіш *яго*, а мне паміж вамі што — разарвацца?

— Не бойцеся. Калі вам трэба мяне сплавіць — я тут не затрымаюся.

— Ніхто цябе не сплаўляе.

А вясной, у сакавіку 2017 года, у мястэчку зноў узнік сябар. Тады, пасля вандроўкі, яго ўратавала тое, што ён Лю пальцам не крануў і другім не даў. Усе гэтыя тры гады ён не абазваўся, не падаў ні знаку, ні разу не пазваніў, не напісаў смс,— і вось паўстаў перад ёю: без машыны, пацёрты жыццём, але нейкі яшчэ больш мужны. Яны сустрэліся ў бары на плошчы, увечары. За вакном стаяла сакавіцкая адліга, сонца зайшло, а святло засталося. На пытанне «дзе быў?» сябар неахвотна адказаў:

— Так, грошы зарабляў, сёе-тое, дробная кантрабанда. Рэйды ва Украіну і назад. У мяне там усе сябры, машына з украінскімі нумарамі, украінскі пашпарт.

Але яна бачыла, што ён не дагаворвае. Яна была ўпэўнена, што ён удзельнічаў ва ўкраінскай вайне. Калі да іх століка ззаду падышоў шафёр-дальнабойшчык і звярнуўся па-ўкраінску, у сябра тарганулася правая рука да кішэні. Лю нават падалося, што яна заўважыла нейкую рэч, падобную на пісталет. Сябар сказаў, што цяпер «залёг на дно», зноў займаецца правераным заняткам — ездзяць з бацькам у Мінск прадаваць што папала: ад картопляў да самагонкі.

— А што далей?

— Я вольны казак, у мяне заўсёды Украіна пад бокам.

— Вазьмі мяне з сабою! — ледзь не ўзмалілася яна.— Хоць куды-небудзь, абы разам.

— Тое не хутка будзе. З год, хоць з паўгода трэба адлежацца.

— Шкада.

— А што здарылася?

— Нічога,— яна закусіла губку.— Проста не магу больш тут, ды і не хачу. Няма дзе дзецца пасля школы.

— А паступаць не хочаш? Як усе?

— Я не люблю вучыцца. Я не набяру іхніх ідыёцкіх балаў.

— Ну хоць мінімум набярэш, ты ж разумная дзяўчынка. А то я б памог. Грошы ў мяне ёсць. Не хопіць балаў на бюджэт — пойдзеш на платнае. Я аплачу.

— Я не люблю вучыцца.

— Можа, і правільна,— сказаў ён разважліва, нібыта ўхвальна. Але яна заўважыла, як яго вочы заблішчэлі знаёмым авантурным бляскам. Ён нешта абдумваў і матаў на вус.— Мо ты для іншага створана, не для вучобы. Ды і што такое цяперашняя вучоба? Наўрад ці рамантыка, сяброўства, песні каля вогнішча пад гітару. Цяпер гэта тое, што і паўсюль, тая самая барацьба за існаванне, разборкі, спаборніцтва: хто багацейшы, хто бяднейшы, у каго якія бацькі, хто паспяховы, хто няўдачнік. Дык ці не прасцей адразу ўключыцца ў гэтую барацьбу? Без аднаго лішняга звяна. Нават калі дапусціць, што ты паступіш, адвучышся і вернешся назад, напрыклад, у раёнку, і станеш, як твая маці. Хочаш быць як маці?

— Не, не хачу,— усміхнулася яна.

І ён таксама ўсміхнуўся ў адказ.

— Ты пахарашэла. А цікава, ты па-ранейшаму можаш уплываць на людзей?

— Не ведаю, не спрабавала.

— Ну што ж. Калі ты так настроена — хоць куды,— ён зрабіў выгляд, што задумаўся.— А ці не паспрабаваць такі варыянт? Ты ж ведаеш, я год грыз граніт навукі, таму такі разумны; дык вось: мы з бацькам часта ездзім у Мінск,— і што ты думаеш, аднойчы каля «Еўраопта» налятаем на майго старога выкладчыка, нашага земляка з-пад Ельска, па-ўкраінску любіць пагаварыць. Ён пазнаў мяне, я яго, узрадваліся, разгаварыліся. З таго часу возім яму на заказ

сала, памідоры салёныя, калі самагонку жытнюю; ён даўно на пенсіі, жыве адзін, жонка памерла, сын загінуў — разбіўся на матацыкле, дачка замужам у Францыі. А гэтай зімою пачаў мне скардзіцца, маўляў, жыву адзін у харомах, нікому не патрэбны, аж сумна, каб хоць хто, хоць якая аферыстка знайшлася. Я адразу пра цябе падумаў. З таго часу як ні прыязджаем, ён усё дапытваецца: знайшоў мне кватарантку?

— І?

— Табе засталося дацярпець да канца школы і выбрацца ў Мінск. Будзеш вучыцца і жыць у нашага дзеда.

Ён не здагадаўся ў гэты момант паглядзець на яе, але калі б зрабіў гэта, убачыў бы — ад дабрыні яе не засталося і следу. На яе тварыку была разгубленасць, крыўда, нават гнеў.

— Гэта ўсё, што ты можаш прапанаваць?

Яго жыццё ўяўлялася ёй поўным небяспекі, геройства, рызыкоўнай крымінальна-прыцягальнай рамантыкі, і калі б ён павёў яе з сабою, яна кінула б усё і пайшла. А ён прапаноўвае ёй такое! Яна бачыла яго навылёт. Ведаючы, што яна прыносіць няшчасці, ён па сутнасці штурхаў яе на забойства, прытым сам застаючыся чыстым.

— Я толькі на такое здатная?

— Лю, не дык не — няма праблемы.

— Як гэта брыдка, нізка.

— Лю, проста кватараваць — і ўсё. Адзінокі дзед жыве. У цябе б не балела галава, што рабіць пасля школы, і мне было б дзе прыткнуцца ў Мінску. Але не хочаш — не трэба.

Больш ён да гэтай тэмы не вяртаўся. Толькі пры развітанні сказаў, марудна прыкурваючы цыгарэту:

— Усё ж падумай. Нам наканавана быць разам. Я цябе знайду, дзе б ты ні была.

Страшна, але разам з тым соладка было чуць гэта. Ён па-ранейшаму быў адзіны, хто хоць так ці інакш цікавіўся яе лёсам. У той жа вечар да яе ў пакой зайшла маці. Лю ляжала на канапе на спіне з кніжкаю ў руцэ. Яна зняла акуляры і пацерла пальцам стомленыя вочы. Ведаючы на-

пярод, пра што маці збіраецца казаць, апярэдзіла яе, каб толькі адчапіцца:

— Добра. Я буду паступаць на журфак. Можаш браць ад газеты накіраванне. Дакументы самі збяруцца. Пашпарт, атэстат, фота, меддаведка, характарыстыка. Заява на месцы.

— А ты здасі ЦТ? Ты нічога не вучыла.

— Лёгка.

— А ты ведаеш, што на журфак мала сертыфікатаў ЦТ, там творчы конкурс у два этапы і ўнутраныя экзамены?

— Здам як-небудзь.

— І ўсё ж? Калі не дабярэш балаў?

— Пайду на філфак. У любым выпадку сюды не вярнуся.

У вачах у маці загарэлася надзея. Такой самастойнай, разважлівай яна дачку першы раз бачыла.

— А жыць дзе? — прытворна пачала бедаваць яна.— І, як назло, у людзей хоць хто, а тут нікога, нічога, ні блата, ні свата.

— Чаму? А Свянцецкія? У Мінску. Вось, піша мне, заве,— Лю паказала тэлефон.— Яна таксама будзе паступаць. Паеду да яе. Хоць бы ў разведку.

Гэта толькі што прыйшло Лю ў галаву, і яна сама падзівілася, як усё складна атрымліваецца. З Свянцецкай, той самай сяброўкай-аднакласніцай, што некалі забыла дома смартфон і наябеднічала на Лю, а потым пераехала з сям'ёй у Мінск, яны сапраўды зрэдку перапісваліся ў сацсетках. Але, канечне, не настолькі яны былі блізкія, каб сяброўка згадзілася прыняць няпрошаную кватарантку.

— У іх пажыву,— зноў махнула яна тэлефонам.— Я ўжо дамовілася, яны згодныя. Прынамсі, на час экзаменаў. Будзем рыхтавацца разам.

— Адна справа тэлефон, другая жывы чалавек.

— Не выганяць жа яны. Некалі была лепшая сяброўка. А выганяць — ну што за праблема, знайду кватэру.

— Паспрабуй, донечка, а раптам?

Гэтыя надзея і радасць, што засвяціліся на матчыным твары, вырашылі ўсё. Лю загарнула кончык старонкі,

адклала кнігу, выйшла на балкон. Вецер пах вясной. На ліпе набрыньвалі пупышкі. Уверсе ў кроне спрабаваў голас шпак, пасвістваў і замаўкаў, нібы сам да сябе прыслухоўваўся. Лю набрала сябра.

— Я згодная.

— Я не сумняваўся. Малайчынка. Правільна. Будзь смялейшаю — і ўсё ў нас атрымаецца!

XV

Сяк-так, цераз пень-калоду Лю скончыла школу, перажыла ўсю гэтую каламуць з апошнім званоком, выпускнымі; у чэрвені з горам папалам, на аўтапілоце, на інтуіцыі і начытанасці метадам тыка здала ЦТ, самым ніжнім балам зачапіўшыся за неабходны для паступлення мінімум. Пра бюджэт нельга было і марыць, асабліва ўлічваючы яшчэ і ўнутраныя журфакаўскія экзамены — сачыненне, вусны тэст, творчы конкурс. Але гэта было ўжо няважна. На самой справе яна не думала ні пра якія экзамены, ні пра знешнія, ні пра ўнутраныя, а думала, як яна будзе жыць у чужога чалавека, як будзе прыходзіць да іх вечарамі, а можа, днямі, сябар, і як яны будуць чакаць, пакуль натуральным чынам вызваліцца кватэра.

Яшчэ раней яна скантактавалася з Свянцецкай, і тая, хоць з вялікай неахвотай, але згадзіліся прыняць яе на адзін-два дні: «Ну... можна... не ведаю... калі не прыедуць госці...»

Сямнаццатага ліпеня быў набыты білет (акурат тады, калі на плошчы заглядзеўся на яе лысы дзядзька каля джыпа), пасля чаго яны з сябрам адправіліся на возера, купацца і загараць, і заадно абгаварыць яшчэ раз дэталі.

«Галоўнае, зачапіцца хоць на гэтыя пару дзён,— пераконваў сябар.— У панядзелак, максімум аўторак я прыеду, пазнаёмлю вас, і ўсё будзе цудоўна. Адразу ў лоб нельга, каб ён не насцярожыўся, трэба сказаць, што жыла ў сяброўкі, так і так, умовы невыносныя».

Калі вярталіся з возера, гадзін у пяць вечара, з пагорка ўбачылі, як унізе па насыпной дарозе марудна праехаў

знаёмы джып. Сябар задуменна правёў яго позіркам, выплюнуў травінку, якую жаваў, спыніўся, чакаючы, пакуль параўняецца з ім Лю.

— Багаценькі,— паўтарыў ён тое і з той самай інтанацыяй, што і ў абед на плошчы.— Тачка крутая. Эх, мне б такую! — зайздросцячы чалавеку ў джыпе, ён нават не падазраваў, што ў гэты самы момант чалавек у джыпе безнадзейна зайздросціць яму з яго веласіпедам.— Ну што ў ім такога? Нічога. Чым ён лепшы за мяне? Нічым. Жыве, відаць, таксама не ў панельным доме. Нябось, асабняк, віла. Эх, якія асабнякі я бачыў у Крыме! А за мяжой! Ды і ў нас ёсць.— Ён не першы раз расказваў пра крутыя «тачкі» і багатыя вілы, і заўсёды з яго аповедаў атрымлівалася, што іх уладальнікі горшыя за яго, а жывуць лепш.

Вузкая, закрытая травой сцежка вяла праз яшчэ не скошаны луг. Трава стракатала аб спіцы. Моцна, як перад дажджом, пахлі лугавыя кветкі. Ад зямлі патыхала цяплом не менш, чым зверху ад сонца. Сябар сцягнуў майку і накінуў на руль. У яго быў бронзавы ад загару торс, з белымі палоскамі шрамаў і чырвонымі плямкамі ад укусаў сляпнёў. Жывот упалы, у квадраціках мускулаў. На шырокай грудзіне крыжам кучаравіліся валасы.

— А някепска было б раскруціць яго. Ты заўважыла, як ён на цябе глядзеў? Ім усё можна. Надакучыла жонка — памяняў на дзяўчынку.

— Перастань.

— Абаяльная ты. Таму і здаешся яшчэ больш даступнаю, чым ты ёсць. Паехала б з ім?

— Лёгка... Глядзі!

У небе зніадкуль узнікла кропка, пачала павялічвацца, пакуль не ператварылася ў коршака. Распасцёршы крылы, ён закружыў над лугам, спускаючыся ўсё ніжэй і ніжэй. Птушкі імгненна заціхлі і прыбіліся да зямлі, да травы.

— Нядобры знак,— сцепанула Лю худзенькім плячом.

— Глупства. Містыка. Ну, не будзь такой. Можна падумаць, я цябе на Галгофу пасылаю.

— Горш. Я сама нясу іншым Галгофу. Нібы ты не ведаеш, што дзе я, там няшчасце.

— Зноў містыка,— паморшчыўся ён.— У мяне дык усё наадварот: колькі цябе ведаю, я з табой шчаслівы.— Ён хацеў пакласці руку ёй на плячо, яна вылузнулася.— Лю, мне не падабаецца твой настрой. Ці ты перадумала?

І на возеры, і цяпер сябар, выдатна ведаючы, што білет ужо куплены і ляжыць у кішэні, усё перапытваў: «не перадумала?», «не пабаішся?», чым толькі злаваў яе. Нібыта ў яе быў выбар.

Паказалася мястэчка з воданапорнай вежай, знаёмыя белыя двухпавярховыя катэджы са спадарожнікавымі антэнамі, з чырвонай і чорнай гонтай дахаў. Лю азірнулася, каб запомніць гэтую сцежачку ў лузе, захаваць у памяці луг з кветкамі, матылямі і пчоламі, неба з коршакам, заадно прабегла ў думках гэтай сцежачкай назад і нібы ўбачыла само возера, адчула цёплую, мяккую ваду, пагладзіла прыбярэжны пясок, шапаткі чарот, куст ракітніку — і ўсё гэта такое кранальнае, паслухмянае, безабароннае раптам злілося ў адзін невыказна мілы, пяшчотны малюнак і пацягнулася ёй услед, каб развітацца.

Неўзабаве ступілі на крайнюю вуліцу. Пачаўся вузкі, выкладзены пліткай тратуар, па якім тут так рэдка хадзілі, што са швоў паміж пліткамі лез малады трыпутнік. Лю заявіла, што хоча есці. Яны пайшлі да цэнтра. На плошчы, як заўсёды, стаялі фуры. Каля рэстарана пад вечар столікаў паболела. Мужчыны-дальнабойшчыкі гаварылі па-ўкраінску і па-руску. Лю з сябрам знайшлося месца каля невялікага дэкаратыўнага плеценага плоціка. Адразу за ім яшчэ адну невысокую агароджу стваралі падстрыжаныя кусцікі з белымі кветкамі, падобныя на язмін, толькі драбнейшыя, якія цвітуць з вясны па познюю восень, ледзь не да снегу, а потым і зімой стаяць абсыпаныя белымі клейкімі ягадамі; снежнаягаднік, ці як яны называюцца. Афіцыянт прынёс сябру порцыю тэкілы, а Лю — марожанае, сок, капучына ў пластыкоўцы, чызбургер — заціснуты паміж падрумяненых палавінак булачак жоўты сыр з дзіркамі.

— Я пакіну ў вас тут дзе веласіпед,— сказаў сябар афіцыянту.— Заеду аўтастопам.

— Без праблем. Лю, можна на хвілінку? — Яны адышлі да плоціка, за кусты гэтага снежнаягадніку. Афіцыянт мысам чаравіка пастукаў у плоцік.— Я выпадкова пачуў... Гэты лысы з тваім будучым айчымам пра цябе гаварылі. Паказваў тваё фота на планшэце.

— Уяўляю, што яны нагаварылі.

— Ты карыстаешся поспехам,— і, азірнуўшыся на сябра, які піў тэкілу, спытаў: — Лю, нам з табой зусім нічога... не можна?

— Усё можна ў межах чалавечага жыцця. Як кажа мой будучы айчым.

І раптам ёй так стала прыемна, радасна невядома ад чаго. Як бы адчуванне, што хутка павінна здарыцца нешта харошае. Калі чакаць і верыць, дык яно часам і харошае здараецца. Яна вярнулася за столік. Сябар насыпаў на палец солі, выпіў тэкілы, злізаў соль і пасмактаў лімонную дольку. Тады толькі заўважыў яе павесялеласць. Шкадаванне, ці пяшчота, ці пачуццё брата да сястры, ці што там у ім варухнулася. Ён паклаў сваю лапу на яе далоньку.

— Лю, скажы,— ён узяў нейкі задушэўны тон.— Як цябе адпускаюць адну, у вялікі горад, да чужых людзей?

— Лёгка.

— Ты так ні разу і не расказала, што ў цябе дома.

— Нічога добрага. Мяне па сутнасці выганяюць. А каб маглі, дык зжылі б са свету.

— Ты не перабольшваеш? — сябар адразу зразумеў, што яны гэта адзін Асавец.— На выгляд ён звычайны башкавіты нармальны дзядзька...

— Больш чым нармальны. Ён святы. Я ўпэўнена, што ён ні разу не парушыў ніводнага з дзесяці запаветаў. Калі-небудзь я думаю, хай бы ён быў лепш цынікам, як ты, чым святым апосталам з прынцыпамі. Прынцыпы ў яго. Горш няма за маралістаў і прынцыповых. Ён не жыве, а як бы выконвае працу, нарыхтоўвае не толькі бярвенні ў лесе, а і назапашвае добрыя справы. Нібыта ў яго не адно жыццё, а адзінаццаць, як класаў у школе, і для таго, каб перайсці ў наступны клас, яму трэба здаць характарыстыку і атэстат за папярэдні.

— А ты яго ўсур'ёз не любіш,— заўважыў сябар.

— За што мне яго любіць? Ён уварваўся ў нашае жыццё, усё перавярнуў дагары дном. Тое, што ён, гэты прынц на шэрым уазіку, да нельга вульгарны, гэтага толькі такая, як мая маці, можа не заўважаць. Але калі б толькі вульгарны! Ён хітры, з задняй думкай, і самае галоўнае — жорсткі. Я не магу пакуль гэтага даказаць, я проста адчуваю. Не ведаю, што ён задумаў, што яму ад нас трэба, што ён можа з гэтай сітуацыі вывудзіць, але здагадваюся, што тут нешта цёмнае!

— Лю,— сказаў сябар.— Ведаеш, мы з ім крыху знаёмыя. Ён не такі ўжо монстр. Вялікую справу падняў з нуля. І да цябе добра ставіцца — нічога кепскага не казаў. Ну, прынцыповы, ну, мараліст, дык на тое філосаф.

— Не ведаю, які з яго філосаф, я дапускаю нават, што ён здольны кахаць, па-свойму, канечне, і разам з тым дакладна ведаю, што ён няпросты, непрадказальны, нешта задумаў, штосьці вычэквае — і мне проста шкада маці. Яна такога не заслугоўвае.

— Можа, мне з ім па-мужчынску пагаварыць?

— Сядзі. Я ўжо ведаю, які ты памагаты. Я сама пастаўлю яго на месца,— сказала яна нядобра, помсліва.— Хоць бы дзеля таго, каб маці пабачыла, хто ён ёсць.

— Што ты прыдумала? — занепакоіўся сябар.— Лю, прашу, не рабі гэтага. У нас усё так добра складваецца.

— Не бойся. Я не зварухну нават пальцам, але з ім разбяруся. Не для сябе — дзеля маці. Пакуль яна пад яго ўплывам, як пад гіпнозам, ён для яе «ідэал мужчыны»... Вось, паглядзі, мне ехаць заўтра, а ніводнага званка...

Сонца хавалася за дахі. Цені ад столікаў выцягваліся. Пахла кавай і свежым разліўным півам. Над столікамі ляталі восы. Сябар, апусціўшы галаву, задумліва пазіраў на шчыльна сціснутыя дзявочыя ногі з белымі каленямі ніжэй чырвонай спаднічкі.

— Лю, ты ніколі не расказвала пра сваю маці. Можа, будучая мая цешча, а я нічога пра яе не ведаю.

— Ды што расказваць? Яна некалі прыехала сюды з Віцебшчыны...

Частка шостая

МІХАЙЛОЎСКАЯ

XVI

Лена Міхайлоўская некалі прыехала сюды са сваёй Віцебшчыны па размеркаванні пасля індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа, калі ёй ледзь споўнілася васямнаццаць, уладкавалася ў раённую газету тэхрэдам, папрацавала месяц і выйшла замуж за першага, хто прапанаваў,— за прыезджага ўкраінскага хлопца з не зусім украінскім прозвішчам Каралёў (потым ён прызнаўся, што саромеецца свайго «расійскага» прозвішча, раіўся з ёю, ці не памяняць яго на Караленка або ўзяць жончынае і пісацца Міхайлоўскі). Прыгожы, са смаляной чупрынай, з тонкімі, уніз апушчанымі вусікамі, падобны, як многія паўднёвыя славяне, да турка. Працаваў на іхняй чыгуначнай станцыі, а жыў у Оўручы, на Жытоміршчыне — тады яшчэ не было ніякіх межаў. Дабіраўся кожны дзень туды і назад электрычкай. Не сказаць, каб Лена яго так ужо кахала. Хутчэй гэта быў своеасаблівы шлюб па разліку. Ён быў сірата, гадаваўся ў бабулі, бацькоў не памятаў, сям'і не ведаў, мала ўяўляў, якой яна павінна быць, значыць, не будзе свякрухі, радні, ніхто не будзе камандаваць і ўпікаць і сам не будзе дужа пераборлівы.

Вяселле згулялі ў пачатку красавіка, а ўжо ў траўні яна ўбачыла, што за падарунак ёй дастаўся. Каралёву прырода ў адным месцы дала, у другім — адняла. Ён пакутаваў на рэўнасць так, як іншыя на запоі. Гэта была менавіта хвароба, паталогія, бо ўзнікала абсалютна на голым месцы, без аніякай прычыны. Галоўнае, ён катэгарычна не хацеў жонку слухаць, у прамым сэнсе затыкаў пальцамі вушы, калі бедная Лена спрабавала даказаць не даказаць, а хаця б уставіць слова апраўдання. «Назаві мне хоць адну жонку, якая б не здраджвала». Ён з такой безапеляцыйнасцю, з такой тупой упэўненасцю гэта сцвярджаў,

што ў Лены апускаліся рукі. Так, яна да замужжа не была феяю. Можа, таму і паспяшалася замуж. Але і тое, што ёй выпала, было ўжо занадта. Падазрэнні, бяссонныя ночы, бясконцыя сваркі, пагрозы кінуць яе, з'ехаць ва Украіну, у Оўруч, дзе ў яго, бачыце, застаўся надзейны сябар і адданая нявеста — першае каханне, якая чакае яго, «якая не роўня некаторым». Іншая скончыла б гэты кашмар за пяць хвілін — выгнала б такога, парвала б з ім, развялася. Але ў Лены быў адзін істотны недахоп — яна была добрая. Пакутуючы ад уласнай бязвольнасці, яна прасіла прабачэння, сама не ведаючы за што, і прасіла яго застацца, сама не ведаючы, навошта. Нічога не змянілася і тады, калі нарадзілася дачушка; наадварот, стала яшчэ горш, бо Каралёў не надта верыў, што гэта яго дзіця. Яна ўзіралася ў яго перакошаны ад пакуты, па-сапраўднаму няшчасны твар і бачыла, што нават ад той сімпатыі, якая некалі ў яе да яго была, нічога не засталося. У такія хвіліны яна ледзь стрымлівала шалёнае біццё сэрца. Яна ўяўляла, як помсціць яму адзіным даступным ёй спосабам, менавіта — здраджвае яму з кім папала. Калі чалавека па сто разоў на дні запэўніваць, што ён злодзей, і не даваць магчымасці апраўдацца, не выключана, што калі-небудзь яму сапраўды захочацца ўкрасці — хоць будзе за што цярпець. У такім разбэрсаным настроі, з такімі пачуццямі і думкамі яна паехала ў Мінск на чарговыя курсы падвышэння кваліфікацыі (Каралёў, прыціскаючы да сябе дачушку, казаў з'едліва: «Што нашай маме яшчэ падвышаць, яна даўно ў такіх справах прафесар») і патрапіла на літаратурную вечарыну, дзе выступаў Рак, якога яна ледзь не з дзяцінства ведала па зборніках паэзіі, нават школьніцай была завочна закаханая ў яго. Іншыя яго калегі-выступоўцы чыталі вершы-агіткі пра палітыку, мову, радзіму; калі б тое самае зрабіў Рак, яна і не заўважыла б. Але ён, вядома, быў арыгінальны; ціхім голасам прачытаў адзін-адзіны верш, затое які! Кожнае слова біла прама ў сэрца, і яно адгукалася салодкім рэхам і запамінала ўсё з першага разу.

«Палю чарнавікі. Навошта свету знаць, што закрэсліў я ў жыцці сваім. Гарaць чарнавікі. Душы сакрэты віюцца знічкамі, дымком сівым. Гарaць чарнавікі. І ў іх свячэнні і думкі, і трывогі — заадно. І рынуцца ў душу, глыбей, на дно абвугленыя прысвячэнні».

Яна стаяла ў чарзе і, гледзячы, як ён прыгожым почыркам падпісвае кнігі, як хутка і спрытна ходзіць яго рука, ёй хацелася пралезці пад гэтую руку і, выгінаючы спіну, мурлыкаць ад задавальнення. Потым, калі гулялі па горадзе, яна ўсё чакала, што зараз яны прыйдуць у шыкоўныя апартаменты, дом з камінам, вялізным кабінетам, кніжнымі паліцамі да столі, і як яна змяце пыл, накіне фартух і пазавіхаецца на кухні за плітою, а затым і ў ложку пакажа сябе,— але ён маўчаў. Яна была непрыемна ўражана, і толькі тады супакоілася, калі ён прызнаўся, што ў яго проста няма кватэры, а жыве ў сябра. І быў замест апартаментаў вечар, бэз, чаромха...

Калі яна вярнулася дамоў, убачыла абрыдлага мужа, пачула яго папрокі, яна зразумела, што больш не будзе апраўдвацца. Ды цяпер ужо і не было як. Яе маўчанне толькі падлівала вады на яго млын. Нейкі час яны яшчэ жылі разам, калі гэта можна назваць жыццём. Каралёў не супакоіўся, нават пачаў прыводзіць у выкананне свае пагрозы кінуць яе: з'язджаў некуды на тыдзень, на месяц, бывала, што і на тры месяцы — і неадменна вяртаўся, прывозіў грошы, прасіў прабачэння, «я адналюб», «не магу без цябе», і яна, кленучы сябе, прымала яго, ведаючы, што хутка паўторацца сцэны рэўнасці. Яны паўтараліся. Усё ішло як па зачараваным безнадзейным коле. Здавалася, ніколі не будзе гэтаму канца. Неяк пасля чарговай сцэны яна, сябе не помнячы, нагаварыла яму вельмі жорсткіх слоў; ён, як звычайна, моўчкі сабраў рэчы і з'ехаў. Праз нейкі час яна атрымала ад яго пісьмо з Украіны. «Ты дабілася свайго... праз твой невыносны характар... не шукай... прабач... некалі кахаў».

Яна была ўпэўненая, што дзе б ён ні быў і з кім бы ні быў, неўзабаве ён аб'явіцца, хаця б успомніўшы пра дачку,

і са страхам чакала гэтага. Але ён не з'явіўся ні праз месяц, ні праз год. Яна яшчэ доўга не верыла свайму шчасцю. Настолькі была радая таму, што цяпер вольная, так баялася, што ён вернецца, што ёй у галаву не прыйшло яго шукаць, каб, напрыклад, справіць аліменты. Ёй не трэба было ад яго нічога, абы не бачыць яго.

Неўзабаве яна ацаніла выгоды свайго новага становішча. На яе кінутую сталі звяртаць больш увагі, чым калі яна была незамужняй. Ёй было ўсяго дваццаць чатыры гады, і яна не збіралася рабіцца саламянай удавою. Проста цяпер яна стала вучоная, прынамсі, не збіралася мяняць быка на індыка, не кідалася замуж за першага, хто пазаве. Чакала, чакала — і дачакалася. Звалі яго Вадзім Асавец. Ён з'явіўся ў мястэчку некалькі гадоў назад. На голым, лічы, месцы стварыў дрэваапрацоўчы камбінат і хутка давёў яго да ладу. Аднойчы прынёс у газету экалагічную нататку — пра тое, як хутка і нерацыянальна высякаецца лес у раёне. Яны пазнаёміліся. Пачалі сустракацца. Ён быў на пятнаццаць гадоў старэйшы: ёй трыццаць два, яму — сорак сем. Але выглядаў ён маладзей. Можа, таму, што яна так доўга чакала, той, каго яна ўрэшце дачакалася, падаўся ёй эталонам мужчыны. Яна не бачыла ў ім недахопаў, а адны толькі вартасці. Тое, пра што яе дачка Лю казала свайму сябру іранічна,— пра «святасць» Асаўца, яна ўспрыняла б усур'ёз. Пры кожнай сустрэчы, кожнай размове яна пазнавала яго ўсё больш. Ён падабаўся ёй і знешнасцю — ваенная выпраўка, дужы, заўсёды паголены, і біяграфіяй — разведзены, у Мінску кватэра (на ўсялякі выпадак), і характарам — сур'ёзны, шчыры, прыстойны, і паводзінамі — па-старамоднаму шляхетны, з называннем яе на «вы» і з цалаваннем ручкі, і шчодрасцю — грошай не лічыць, кветкі, рэстаран, дарагія падарункі. Але самае галоўнае, яна з ціхай радасцю пераконвалася, што і яна яму падабаецца. Так яно прыйшло, позняе каханне, поўнае, узаемнае, аб якім мараць.

— Я ведаю,— сказаў ён аднойчы,— пра мяне кажуць, што я зануда, не разумею гумару.

— Не з гумарам жыць, а з добрым чалавекам,— хутка ўставіла Лена.

— Абсалютна правільна. Цалкам падтрымліваю такое ваша стаўленне да жыцця. А што да гумару — адзін, усяго адзін раз у жыцці я паспрабаваў пажартаваць.

Ён расказаў, як некалі іх адпраўлялі ў камандзіроўку ў Віцебск, па вядомай справе зніклай школьніцы; быў вечар, яшчэ чатыры гадзіны чакалі на мінскім вакзале, а ўночы далі адбой. Ён прыехаў дамоў і, не звяртаючы ўвагі на разбуджаную жонку, «з мэтай насмяшыць яе», пайшоў шнырыць па кватэры: шафы, балкон, ванны пакой. Перапалоханая жонка сачыла за ім. «Ты што?!» — «А раптам у цябе палюбоўнік?» Яна прастагнала і падняла ў столь вочы: «Якое ты палена! І дзе ён можа быць?»— «Вы, жанчыны, іх паўсюль хаваеце».— «Якое ты дрымучае бервяно! Табе не з людзьмі, а ў лесе з дрэвамі трэба жыць!»

— Пазней, калі мы па яе ініцыятыве развяліся — праўда, дзеці да таго часу выраслі, я зразумеў прычыну яе крыўды і гневу. У яе на гэтай ролі — палюбоўніка — быў не адзін і нават не два чалавекі. Вось так я няўдала, на сваю галаву пажартаваў.

— Бедны вы,— шчыра шкадавала яна, не бачачы ў гэтай гісторыі ні пошласці, ні анекдатычнасці, і легкадумна не праводзячы паралеляў з першым мужам.

— Затое мой крах на сямейным фронце і няўдачы на кар'ернай лесвіцы,— жаваў ён мачалку,— зрабілі з мяне філосафа. Мяне сапраўды пацягнула да адзіноты, да лесу, ці не так?

Ён пачаў бываць у яе ў гасцях. Абедаў, вячэраў. З'явіліся баршчы і адпрасаваныя і адбеленыя храбусткія кашулі. Часта затрымліваўся каля кніжнай паліцы, прачытваў адзін-два абзацы; загортваючы кнігу, казаў з уздыхам: «Усё гэта чыстая праўда. Так і ёсць у жыцці».

— Чытаю я, канечне, менш, чым наша прыўкрасная Лю, але стараюся не адстаць. Мне няма розніцы што чытаць, навуковую літаратуру, вершы, прозу, абы жыццё

героя ў кнізе было падобнае на маё. А аўтараў не запамінаю ніколі. Якая розніца, хто аўтар, праўда?

Яна была б зусім шчаслівая, каб не дзве праблемкі. Першая — што фармальна яна замужам. Гэта ўвесь час нявыцягнутай стрэмкай вярэдзіла душу. Яна не ведала, як пра такое сказаць, і ці трэба казаць. Першы муж так выматаў яе, што цяпер яна баялася наступіць на тыя самыя граблі. Яна разумела, што другога разу проста не вытрымае. Але і цягнуць да апошняга, да таго, напрыклад, моманту, калі Асавец зробіць прапанову, было і непрыгожа, і небяспечна. Атрымаецца, што яна проста паставіць каханага чалавека перад фактам. Трэба рабіць гэта раней. І яна адважылася. Стаяла бабіна лета. Цвілі па другім разе каштаны. З сумнай усмешкай, якая азначала: усё магло б быць цудоўна, каб не...— яна расказала пра Каралёва, паказала яго адзінае пісьмо.

— Не забывайце, хто я, дзе я працаваў,— выслухаўшы, не зводзячы з яе вачэй, сказаў Асавец.— Гэта такая драбяза, што і гаварыць не варта. У мяне ёсць знаёмы, акурат па гэтай лініі.— Адразу ж пры ёй дазваніўся, патлумачыў у трубку: — Жанчына хоча замуж за прыстойнага чалавека, а пячатка ў пашпарце гэтаму перашкаджае. Той? — той алкаголік знік кудысьці. Так-так, так-так.

Пагаварыўшы, з задаволенай усмешкай (мужчына ўзяўся за справу — мужчына выканаў) расклаў усё па пунктах. Першае — падаць у суд заяву аб разводзе, месцам пражывання адказчыка назваць свой адрас, туды ж суд будзе слаць павесткі, «распішацеся за яго ў павестках, а суд вынесе вердыкт у адсутнасць адказчыка».

— І ніякіх сведкаў, толькі вы і суддзя. Затым ідзеце ў ЗАГС і атрымліваеце пасведчанне аб разводзе.

— І ўсё? — спытала яна, не верачы, як за пяць хвілін можна вырашыць тое, што здавалася ёй невырашальным, на што яна не магла адважыцца трынаццаць гадоў.— А калі ён вернецца?

— Ён вернецца не да роднай жонкі, а да чужой. Ці не так?

Аднак для перастрахоўкі, каб нішто не нашкодзіла іх будучаму шчасцю, яшчэ параіўся з сябрам-юрыстам, мала таго, нават прывёз яго сюды, у мястэчка, і той, сумленны, уедлівы чалавек, грунтоўна ўваходзіў у курс справы, доўга, падрабязна распытваў Лену, калупаўся ў дакументах, усё ўдакладняючы, і нарэшце даў цвёрдую гарантыю, што непрыемных сюрпрызаў не будзе ні ў якім выпадку. Заставалася яшчэ праблемка: што рабіць з Лю? Дачка чамусьці адразу незалюбіла Асаўца. Як толькі ён заяўляўся, яна моўчкі апраналася і выходзіла. Акрамя таго Лю, сама таго не жадаючы, з'яўлялася перашкодай да афіцыйнага заключэння шлюбу. Пакуль яна тут, ні Лена да Асаўца не магла перайсці, ні Асавец да яе.

— Я ведаю, чым такое сумеснае жыццё канчаецца,— сказаў ён з уласцівай яму праматою, калі ў чарговы раз прыйшоў у госці.— Я прытрымліваюся той думкі, што не павінна дзяўчынка-падлетак жыць разам з дарослым мужчынам.

Лена сядзела за сталом, ён стаяў каля кніжных паліц. Дзверы ў даччын пакой былі расчынены; відзён быў засланы пледам край канапы з кінутымі на яе джынсамі, каля канапы стаялі, міла касалапячы (насы разам, пяты асобна), красоўкі, побач валялася на падлозе чамусьці толькі адна беленькая шкарпэтачка.

— Іншы прыхаваў бы, гэта факт. Але я не з такіх. У мяне прынцыпы. Калі яна такая, як вынікае з вашых слоў, з такімі звычкамі, схільнасцямі, паводзінамі (раней Лена неасцярожна расказала яму пра ельскага сябра і двухтыднёвыя прыгоды дачкі) — дык што, калі, дапусцім, яна ў мяне закахаецца? Я сябе ведаю, я не паддамся спакусе (казаў усё роўна наадварот, чым Літаву). А вось за яе... Калі яна пачне са мной фліртаваць — мне давядзецца расказаць вам. Вы наўрад ці адчуеце да яе прыхільнасць. Дык навошта выпрабоўваць лёс?

Яго шчырасць абяззбройвала. Лена, у думках з ім цалкам згаджаючыся, усё ж паспрабавала абараніць дачку,

пачала пераконваць, што то быў пераломны ўзрост, які яна даўно перарасла.

— Яна ўвогуле не такая, чым я ў яе гады, у яе няма сябровак, яна несучасная, не тырчыць у камп'ютары, нават у сацсетках не любіць калупацца, толькі старамодна чытае — так што ніякага флірту не будзе.

Але ён быў непахісны.

— Хай канчае школу, і — павінна пакінуць нас. Я нават вымушаны паставіць умову: або я, або яна. Так будзе лепш для ўсіх. Нічога не павінна азмрочыць будучага нашага шчасця.

— Але куды ёй?

— Хай паступае.

— Яна не паступіць з такімі баламі. У лепшым выпадку на платнае,— намякала Лена.

Ён скрупулёзна, па пунктах растлумачыў і гэта. Сказаў, што яму, канечне, няцяжка яе забяспечыць, у яго ёсць грошы, прычым уладкаваць яе нават не ў Беларусі, а ў Лондане, у Кембрыджы, напрыклад; але, па-першае, у яго прынцыпы, а «прынцыпы — самае галоўнае ў жыцці, ці не так?»,— па-другое, ён перакананы, што першыя крокі маладыя людзі абавязкова павінны рабіць самі, толькі тады ўзрасце цана іх. Сваім сынам ён таксама па першым часе не памагаў ні аднаму, ні другому, і цяпер яны яму бясконца ўдзячныя. Ён называў гэта «прышчэпкай ад жыцця».

— У Еўропе, у Амерыцы даўно так робяць, каб не псаваць дзяцей. Бо інакш у гэтае жыццё можна так і не ўліцца. Я сам рабіў першыя крокі ў невядомай дагэтуль справе, а ўявіце, калі б мой сваяк, які-небудзь багаты брат, памог мне набыць лесапільню, паднёс на сподачку — хіба б я цаніў свой поспех так, як цяпер, калі ўсё зроблена ўласнымі рукамі і ўласным розумам?

Ён памаўчаў, гледзячы ў адну кропку.

— Але ў нашым выпадку я згодзен зрабіць выключэнне з правілаў і адступіць ад прынцыпаў. Я дам грошы.

— Я ўжо гаварыла з ёю. Ад вас яна катэгарычна не возьме. Ганарыстая, не ведаю, адкуль гэты гонар.

— Тады я перадам праз вас.

— Яна спытае, адкуль яны ў мяне.

Было тое зімою, а ўвесну, акурат пасля аб'яўлення ў мястэчку ельскага сябра, раптам усё само сабой пачало зрушвацца з мёртвай кропкі. Лю ўзялася за розум, пачала варушыцца, рыхтавалася да іспытаў і ЦТ, збірала дакументы, спісалася з сяброўкай. Лена сачыла за гэтым і трымала Асаўца ў курсе. «Не веру, што з гэтага нешта атрымаецца. З такой вучобай яна на бюджэт не паступіць. Праз дзень, самае большае праз тыдзень зноў будзе тут». Тады Асавец сказаў:

— Вось што. Хай едзе. А каб не вярнулася, мы перастрахуемся. Калі вы не супраць. Ні ад вас, ні ад мяне яна грошы не возьме. А ад чужога чалавека? Калі ён гэта адпаведным чынам абставіць? Дапусцім, скажа, што ў яе талент, што ён згодны аплаціць авансам яе вучобу, з прыцэлам на тое, што ў будучым яе чакаюць кар'ера мадэлі, кастынг, кінапробы і ўся іншая таму падобная каламуць. І хай яна спакойна вучыцца, а ён нібыта яе апякае. Насамрэч плаціць буду я. Ад такога яна возьме?

Лена ў адказ толькі развяла рукамі.

— Але дзе такога знайсці? — спытала яна.

— Я тут на днях па лясных справах пазнаёміўся з адным, з Мінска. Так сабе чалавек — несур'ёзны, памешаны на творчасці, але, здаецца, не злы. Можна яго падключыць. Ён мне абавязаны. Я яму ўжо намякнуў. Калі ён захоча з вамі пагаварыць, вы не будзеце супраць? Усё ж такі я разумею пачуццё маці да роднай крывінкі...

— Што трэба рабіць?

— Проста скажыце, напрыклад, што самі шукаеце, у чые б добрыя рукі яе перадаць; скажыце нават, што не ведаеце, як ад яе пазбавіцца. І наша Лю будзе ўладкавана, і нам нішто не азмрочыць будучага шчасця. Ці не так?

Разумны, мілы, дальнабачны Асавец! Усё абдумаў, не пашкадаваў часу, нават сам падабраў для яе неабходныя словы. За такой спінаю Лена магла ні пра што не дбаць.

XVII

І вось сёння, пасля знаёмства і гутаркі з Літавым, і гэтая справа амаль вырашылася. Усё адно Лене было крыху не па сабе. Чужыя людзі ўмешваюцца, хай і блізкія сябры яе каханага, а яна, маці, як бы збоку.

Дома яна першай справаю пайшла ў залу да кніжных паліц. Вяртаючыся са зборнікам «Чаромхавага чаду» ў руцэ, у калідоры пакруцілася, як школьніца, перад люстрам. «Якая я яшчэ прыгожая!» Блізарука ўглядзеўшыся, заўважыла прышчык на носе — чырвоная, як уколатая іголкаю кропка з мікраскапічнай бела-жоўтай саспелай «дзюбкаю». Успомніла дзіцяча-падлеткавую прыкмету: закахаўся нехта. У пакоі ўключыла ноўтбук, пакуль ён загружаўся, выпіла каньяку, падняла нож, які выпаў з рукі, калі рэзала лімон, пастукала ім па краі драўлянага століка: «не хадзі сюды, не хадзі сюды, не хадзі сюды». Набрала ў інтэрнэце «Тэлефонны даведнік па прозвішчах Беларусі», выпісала нумар.

Сядзела, патроху піла каньяк, гартала чамусьці ззаду напярод «Чаромхавы чад», зноў выпівала для смеласці, бралася за тэлефон — і адкладвала трубку. Выходзіла на балкон. Іх вялізная ліпа, што расла каля пад'езда, закрывала сваім ценем увесь двухпавярховы дом; цяпер, пад вечар, дрэва гуло, у кроне шчыравала цэлая інтэрнацыянальная кампанія насякомых: пчолы, мухі, мошкі, мурашкі — усё зляталася, спаўзалася на мядовы пах кветак, а ўнізе пад ліпаю за столікам гудзела другая кампанія, мужчынская, віно-даміно; і суседка-татарка з акна першага паверха крычала мужу: «Супакой сваіх сяброў! Інакш я выйду і іх супакою!»

Час бег. Яна трохі прыбралася ў кватэры, збольшага нагатавала-нарыхтавала, зноў прысела, зноў піла па глытку каньяк і ўсё не адважвалася пазваніць.

У паўдзясятага вечара сябар правёў Лю да дома і пайшоў на трасу — аўтастопам дабірацца да Ельска. Перад тым, як зайсці ў пад'езд, яна пастаяла пад ліпай. Яшчэ не сцямнела, а раса ўжо ўпала, і моцна павастрэлі пахі:

не жнівеньскія, канечне, але блізка да таго. Пахла ліпа, раса, трава, нават пясок пах, як пахне ён пасля першых кропляў летняга дажджу. Лю зайшла ў кватэру, асцярожна зачыніўшы дзверы, убачыла на століку пачатую пляшку каньяку, разгорнутую кнігу вершаў, пачула з залы голас маці па тэлефоне. Маці стаяла — у адной руцэ тэлефон, другая з закасаным рукавом і сагнутая ў локці, нібы яна толькі што здавала кроў з вены. Лю пачула:

— ...Цяперашні свет... баюся за яе... прападзе, столькі спакусаў... яна думае, пакуль маладая... а маладосць праходзіць хутка... не атрымаецца — не трэба...

Маці прыціснула палец да вуснаў, маўляў, не перашкаджай, важная размова. Лю прайшла на кухню, наліла ў талерку халоднага баршчу са шчаўя, накрышыла зялёнай цыбулі, дадала палову варанага яйка, сталовую лыжку густой смятаны, размяшала і, не зважаючы, што халаднік быў крыху перасолены, са скібай чорнага хлеба выхлебтала ўсё за некалькі хвілін — здаровая галодная дзяўчынка. Маці ўвайшла з кніжкай у руцэ і са збянтэжаным выглядам.

— Ведаеш, донечка, мне тут нечакана пазванілі... Даўні знаёмы з Мінска. Паэт. Я табе расказвала. Уяўляеш, сам пазваніў! Якое супадзенне. Ён адзін жыве. Калі даведаўся, што ты паступаеш, пачаў напрошвацца, каб табе памагчы. Я падумала — адно другому не зашкодзіць.

— Мне не трэба нічыёй дапамогі. А што гэта тырчыць з кнігі?

Маці дастала візітоўку Літава:

— Цікавіліся табою. Адзін на джыпе. Як па мне — вельмі прыстойны чалавек...

— Такі лысы, стары, непрыгожы?

— Наадварот: элегантны, маладжавы, сімпатычны. Да таго ж ветлівы, нават сціплы. Ён бачыў цябе на плошчы, сказаў, што ты падобна на яго жонку ў маладосці. У яго да цябе важная прапанова. Нешта звязанае са здымкамі фільма, нібыта хоча запрасіць цябе на кастынг, прынамсі, я так зразумела. Уяўляеш, ён нават згодны аплаціць тваю

вучобу, калі ты не пройдзеш на бюджэт! Ды зараз ён сам прыйдзе, пазнаёміцеся, ён усё раскажа.

— Вось бачыш,— сказала Лю, выціраючы сурвэткай пунсовыя вусны.— А ты казала, чакаць — самае цяжкае. Чакаць — самае лёгкае і надзейнае. То не было нікога, а цяпер і паэт, і рэжысёр. Аднак дзе ж ён, твой Літаў?

XVIII

А Літаў у гэты час пад'язджаў да Мінска — і ўсё было наадварот, чым раніцай. Чым бліжэй ён пад'язджаў, тым часцей лавіў сябе на тым, што яму хочацца, каб машына ехала не так хутка (а шафёр гнаў яе), ці ўвогуле зламалася або патрапіла ў аварыю, невялічкую, канечне, так, «пацалавацца» злёгку, каб потым доўга стаяць, чакаць, даішнікі, разборкі.

Ён матляў галавой, каб далёка не заходзіць, глядзеў на мільгаючы за вакном лес, на загараджальныя сеткі, ад якіх стракацела ў вачах, і раптам адпусціў уяўленне, і пайшло яно працаваць, не пытаючы ў яго дазволу: вось ён ідзе следам па сцежцы ў бур'яне за жонкай, разам з ёй піхае незачыненыя дзверы ў бункер, з заміраннем сэрца, як малое дзіця адчыняе дзверы ў пакой, куды яго раней не пускалі, пераступае ганак, пачынае спускацца — і смачнае цмоканне за спінаю; уявіў усё гэта — і ўпершыню не сціснулася страхам сэрца, не адчуўся брыдкі холад у жываце і пустата пад нагамі; больш за тое — упершыню ўяўленне павяло яго далей за лесвіцу, якая вядзе ў бункер, і ён дабраўся да вянкоў з чорнымі стужкамі, курганка магільнай зямлі, жалобных прамоў, стукання-звякання лыжак і відэльцаў на памінках. І гэтая дзяўчынка, яе трывожныя, цнатлівыя сваёй белатой ногі, чырвоная спаднічка, акуляры. Яна нібы ўвесь час прысутнічала нябачна, і была нейкая сувязь паміж ёю і знікненнем жонкі.

— Ты не вельмі спяшаўся,— такімі словамі сустрэла яго Ірма, калі пад'ехалі, і ён бягом убег у дом. Яна сядзе-

ла жывая-здаровая, у халаце, на нагах хатнія пантофлі з кутасамі. Адставіўшы пальчык, яна проста сядзела і піла гарбату. Літаў апусціўся на нізкі шырокі падаконнік.

— Як табе не сорамна,— выдыхнуў ён з дакорам, тушачы агонь у вачах.— Я ўвесь перакалаціўся. Думаў, ты зайшла ў бункер. Як можна так палохаць? У мяне цяжкая была паездка, а тут яшчэ... А калі б сапраўды зайшла? Мала што магло здарыцца. Ад панікі, ад страху — разрыў сэрца, страта прытомнасці...

— Клапатлівы ты мой,— здзекліва-іранічна, непадобна на яе ранейшы тон, працягнула яна.

— Тым больш у нядзелю такі важны вечар, нам трэба быць гатовымі...

Яна выйшла. Літаў дапіў рэшткі гарбаты з яе кубка. Рукі ў яго падрыгвалі, калі ён набіраў Самусенку.

— Вось і настаў ваш час «ікс». Ідзіце да нашага паэта, запрашайце яго, скажыце, што яго чакае сюрпрыз... Як з'ездзіў? Незвычайна! Якую палескую кветку бачыў! І так падобная на маю Ірму ў маладосці... Чыстая, у вачах — бяздоннасць, вечнасць... Для чаго такія нараджаюцца? Мабыць, каб уратаваць свет...

— Ах, альтруіст мой,— пачулася за яго спінай з той жа іранічнай з'едлівасцю.— Вось так заўсёды, усё для іншых, нічога для сябе.

Ірма стаяла ў дзвярах. Яна паспела пераапрануцца. На ёй была чорная са стразамі сукенка, адно плячо голае, другое закрытае — як рымская тога; туфлікі, падфарбаваныя вусны, завушніцы.

— Я проста рады, што страхі мае не апраўдаліся... Куды ты?

— Ты запрашаеш сяброў на раўт без маёй згоды, у цябе ёсць справы, пра якія я не ведаю — чаму ў мяне не можа быць сваіх спраў? — павярнулася і выйшла.

Хвілін праз сорак яна пад'ехала да дванаццаціпавярховага дома. Вольнага месца не было, давялося заехаць на тратуар левай палавінай машыны. Выйшла, каб бачыць дзверы пад'езда, над якімі лямпачка асвятляла лупатае

вока відэакамеры, прымацаванай збоку, пад надпісам сінім па белым: «Вядзецца відэаздымка!» Яна не спяшалася. Дастала з сумачкі цыгарэты, некалькі разоў зацягнулася, кінула акурак у траву на газон. Нарэшце з пад'езда паказалася прыгорбленая постаць Самусенкі. Як толькі ён завярнуў за вугал, дастала тэлефон. Неўзабаве спусціўся Рак, у джынсах, у сланцах на босую нагу і ў кашулі, якую ён сцягваў на грудзях і на хаду зашпільваў, падыходзячы да машыны. Ірма ступіла з паўзмроку яму насустрач.

— Дзякую, што выйшлі. Будзем знаёмы, Ірма. Мы ніколі не сустракаліся, але я ведаю вас. Завочна, канечне. Апошнім часам многа чую пра вас, чытала вашыя вершы, акрамя таго ведаю, як вы перапалапачваеце рукапісы майго бяздарнага мужа. Ён лічыць мяне недалёкай, якая нават не цікавіцца інтэрнэтам, не разбіраецца ў літаратуры, але гэта не так. У літаратуры і ў камп'ютары я разбіраюся лепш за яго.

— Слухаю вас,— строгім, тым самым рэдакцыйным голасам, якім адказваў па тэлефоне, прамовіў Рак, хаця ўся сярэдзіна ў яго па-здрадніцку трымцела.

— Прабачце, што патурбавала ў позні час. Не магла раней, чакала, пакуль пойдзе ад вас гэты стары. Не верце яму. Мой муж аблытаў яго павуціннем, цалкам падпарадкаваў сваёй волі. Давайце сядзем у машыну.

Рак паслухмяна залез. У салоне пахла парфумай.

— Слухаю вас.

— Я тут зусім адна. Мне няма да каго прытуліцца — чужыя людзі, чужая краіна. Уся надзея толькі на вас. Абяцайце мне памагчы.

— Калі гэта ў маіх сілах.

— Я цярпела, колькі магла, але больш не магу, не магу! Мой муж... Не ведаю, што ён задумаў, але мне страшна. Мяне акружае нейкая нядобрая атмасфера, нада мной згушчаюцца хмары, і ўсяго толькі справа часу, калі адбудзецца непапраўнае.

— Слухаю вас,— заклініла Рака на гэтым слуханні.

— Мой муж — ненармальны, памешаны чалавек, маньяк. Ён не можа доўга быць з адной жанчынай. Я здагад-

ваюся, што ён мяне проста разлюбіў і хоча замяніць іншай, маладзейшай. У мяне ёсць усе падставы так думаць. Я была ўжо ў падобнай сітуацыі, толькі ў іншай ролі. У Латвіі. Там усё пачыналася цюцелька ў цюцельку, як і тут,— і там Літаў кінуўся вучыць мову, чытаў Яна Райніса, «убіраў у сябе,— як ён кажа,— чужую культуру», знаёміўся і ўваходзіў у давер мясцовай эліце, а насамрэч — падшукваў, падбіраў для нечага людзей. Мне было тады васямнаццаць, яго ранейшай жонцы, як і мне цяпер, каля дваццаці пяці. І ён мне казаў: «ах, як ты падобная на маю жонку ў маладосці!» Скончылася тым, што яго жонка знікла пры загадкавых абставінах, а я заняла яе месца.

— Усё гэта настолькі... неверагодна...

— Яшчэ як верагодна. Усё ідзе як пад капірку. Зноў на яго накатвае, як некалі ў Латвіі, зноў ён пасвістае, задумваецца, шукае для нечага людзей, гаворыць толькі на тэму забойстваў, смяротных пакаранняў, пра нейкі востраў... Ён вам казаў пра востраў? Няма сумнення: ён шукае паўтору, каб здзейсніць тое самае, што ў Латвіі. Я знікну, а маё месца зойме чарговая «Ірма». Перад тым, як ехаць сюды, я выпадкова падслухала яго размову па тэлефоне з вашым сябрам, гэтым старым Самусенкам. Ён ужо знайшоў мне замену, маладую дзяўчыну, і цяпер я павінна паўтарыць лёс ягонай жонкі.

— Чакайце — ёсць жа ўрэшце міліцыя, паліцыя...

— За прадчуванне не заводзяць крымінальную справу. Ды і ён абвядзе вакол пальца любую паліцыю. Вы не ўяўляеце, які ён хітры, як усё прадумвае.

Памаўчалі. У маўчанні Рак дыхаў шумна. Ён адчуваў, як праступае пад пахамі пот.

— Але нашто такія складанасці? Так адкрыта? Падрыхтоўка, збор людзей, усё навідавоку... Калі б я, дапусцім, выношваў злачынства, я рабіў бы гэта ў такой тайне, што...

— У тым і справа, што вы нармальны, а ён — не. Логіка яго перакручаная, казуістычная, ён адкрыта ўцягвае масу людзей — калі гэта спрацоўвала раней, і паспяхова спрацавала, дык нашто яму адмаўляцца ад праверанага

спосабу? Ён знарок робіць гэта пры максімальнай колькасці сведкаў, адданых яму сяброў, аўтарытэтных людзей, у тым ліку і вас.

— А сэнс?

— Калі са мной нешта здарыцца, не будзеце ж вы сведчыць супраць яго.

— Ну, дапусцім. Спланаваць — так. Але як гэта можна ажыццявіць?

— Куча варыянтаў. Любы няшчасны выпадак. Тое, што я не ўмею плаваць, баюся вышыні — у нас ёсць балкон, з якога падаў рабочы, тое, што я кепска ваджу машыну, што ў мяне клаўстрафобія. Чаго варты хоць бы гэты ідыёцкі бункер у закінутым садзе. Ён кажа, што рыхтуе яго пад музей. Але дасюль там няма ніводнага экспанату. А сёння з бункерам ужо была рэпетыцыя. Ён знарок пакінуў дзверы адчыненымі, а як іх адчыніць з сярэдзіны, ведае толькі ён. Уяўляеце, калі б я зайшла туды? То з вамі цяпер не размаўляла б.

— Прабачце, але ў мяне не ўкладваецца ў галаве. Я не магу ўявіць разумнага, інтэлігентнага, багатага, творчага чалавека ў якасці...

— Дык слухайце ж! Неяк ён адкрыўся мне, што ёсць у яго брат, вялікі чыноўнік, які яго прыцясняе, што нібыта мы жывем на яго грошы, выконваем яго капрызы, куды ён скажа, туды едзем. Літаў тады кінуў слова, што пара б ужо вырвацца з яго надта моцных абдымкаў. Потым той чалавек нібыта эміграваў ва Украіну — гэта было зімой, а ў пачатку вясны ў цэнтры Кіева — забойства важнага чыноўніка. Супадзенне дзіўнае, згадзіцеся. Канечне, цяпер Літаў усяляк адпіраецца, а з іншага боку — у яго развязаны рукі, нічога яго больш не стрымлівае... выйдзем, калі ласка, я курыць хачу.

Выйшлі з машыны ў цёплую лагодную знаёмую ноч.

— Скажыце... чаму б вам проста не развесціся?

— Вы наіўны чалавек. Няўжо вы думаеце, што ён так проста мяне адпусціць? Я — адзіная сведка. Калі-небудзь я магу і перастаць маўчаць. Ды і як жыць з чалавекам, які ведае тваю нядобрую тайну? Ён зробіць усё, каб як мага

хутчэй прыбраць мяне са сваёй дарогі і са свайго жыцця.

Рак набраў у грудзі паветра разам з чужым цыгарэтным дымам і пастараўся, каб прагучала як мага больш цвёрда:

— Але чаму вы выбралі мяне?

— Вы — чысты сумленны чалавек. Ні ў чым не замешаны. Да таго ж я не зусім латышка, я — латгалка, у мяне беларуская кроў, мы з вамі амаль радня. Калі са мной штосьці здарыцца...

— Дзякую за давер,— перабіў Рак,— але я — самы няўдалы выбар. Я ўсяго толькі слабы паэт, зусім непрактычны ў рэальным жыцці, некампанейскі, эгаістычны, некамунікабельны, цікаўлюся толькі літаратурай...

— Вы не проста паэт,— перабіла ўжо яна.— Вы — таленавіты паэт. У вас назіральнасць, вы ўмееце сплятаць словы ў сказы так, што вам верыш. Паслязаўтра вы будзеце на раўце. Дайце мне слова, што будзеце запамінаць усё-ўсё, кожную дэтальку, любую драбязу. Гэтым вы зможаце калі не папярэдзіць няшчасце, дык — нават калі са мной нешта здарыцца — вашы каштоўныя назіранні памогуць устанавіць ісціну і пакараць вінаватага. Абяцайце мне гэта!

Амаль супакоеная, перакінуўшы свае праблемы на чужога чалавека, яна села ў машыну і паехала, а бедны паэт стаяў, не ведаючы што і думаць. Свяціла поўня, гарэў ліхтар, і ашалелыя ад летняй ночы конікі трашчалі звонка, як цыкады на поўдні.

Частка сёмая

РАЎТ

XIX

У нядзелю ў сем вечара таксоўка прывезла Рака да сядзібы Літавых. Гаспадары сустракалі яго каля варот; Літаў быў у белым, Ірма ў чорным, якое пасавала ёй, як і большасці жанчын чамусьці да твару колер жалобы. Рак

прыехаў сюды поўны рашучасці, з цвёрдым намерам высветліць, што тут адбываецца. Пасля візіту Ірмы ён да паўночы не спаў, думаў і нарэшце вырашыў, што вінавата ва ўсім багацце, яно разбэшчвае, робячы людзей ненармальнымі. Ён чакаў, што на гэтым раўце і госці, і тым больш гаспадары будуць заціснутыя, напружаныя або наадварот — узвінчаныя; яму здавалася, само паветра тут будзе насычана падазрэннямі, недаказамі, што бледная напалоханая Ірма будзе падаваць яму знакі, а Літаў — хітрыць, адводзіць вочы, выкручвацца. Усё аказалася не так. Абсалютна натуральна яны паводзілі сябе; на твары Ірмы не было ні разгубленасці, ні страху — хутчэй цікавасць; што да Літава, той хоць і быў неяк падазрона мітуслівы, і ўсміхаўся крыху нацягнута і ад таго як бы цераз сілу, але гэта магло сысці за звычайнае хваляванне гаспадара, які прымае гасцей і хоча, каб усё прайшло як след.

— Вось госць жаданы, даўно, даўно чаканы! Я ў цябе, дарагая, украду яго на гадзінку.— Літаў падхапіў Рака пад руку.— Скажыце, вы ўжо чыталі новы нашумелы раман...

Так, трымаючы пад руку, ён павёў Рака дарожкай, на якую звісалі белыя і барвовыя ружы, да ганка. Ірма ішла следам. Падняліся па прыступках у дом, знаёмы Раку па расказах Самусенкі. Пакуль праходзілі па вялікай доўгай гасцёўні, Рак краем вока паспяваў ухапіць карціны на сценах; многа было мэблі: крэслы, пуфы, атаманкі, але ўсё размешчана так, каб не замінала свабодна рухацца. Насустрач ім з-за часопіснага століка, заваленага ілюстраванымі альбомамі, падняліся каржакаваты мажны мужчына з вяночкам сівых валасоў вакол лысіны, і поўная, невялічкага росту бялявая кабета: кучаравыя светлыя валасы, вочы сінія, вусны тонкія — немка не немка, а можа, полька.

— Пазнаёмцеся, Хрысціян Андрэевіч Шнэйдар, амаль наш сямейны доктар, лечыць маіх малых, працуе ў ваенным шпіталі. У дзевяностыя паехаў на гістарычную радзіму, у Германію, але хутка вярнуўся, незадаволены тамашняй сістэмай навучання. Жонка яго, Ванда Вацлаваўна, пашпартыстка...

— Аддзел рэгістрацыі віз,— весела дакончыла за Літава кабета. І ў яе незабудкава-сініх вачах, і на дабрадушным, але ўважлівым твары доктара Рак прачытаў тую самую, што і ў Ірмы, цікавасць да сябе — не цікавасць людзей, якія пабачылі жывога паэта (каго цяпер здзівіш паэтам?),— яны разглядалі яго, як нейкую рэдкую заморскую жывёлінку ў заапарку. Літаў тым часам дастаў з шафы прадаўгаватую вузкую кардонную скрыначку, падобную на стары школьны пенал, і працягнуў Раку. Той запытальна падняў вочы.

— А вы адчыніце. Маленькі сувенір, для паўнаты калекцыі.

У скрыначцы, шчыльна адзін да аднаго прыціснутыя, стаялі вертыкальна сем жэтонаў на метро. Рак высыпаў іх на далонь.

— Дзе вы дасталі?

— Даў абвесткі на «Куфры» і на «Ау».

— Навошта, гэта ж грошы, лішнія вам клопаты,— прамармытаў Рак, запіхваючы падарунак ў кішэню.

— Якая драбяза. Прашу за мною.

Ірма засталася з гасцямі, а Літаў з Ракам прайшлі навылет гасцёўню і выйшлі на тэрасу з другога боку. З-за пагорка, на якім стаяў дом, касыя промні сонца асвятлялі роўна палавіну двара і сада. Рак зноў падзівіўся, як дакладна стары ўсё апісваў: пагорак, дом, балкон, дворык. Ад дома ўніз разбягаліся дарожкі, высыпаныя аранжавым гравіем. На падстрыжаным ідэальна газоне каля сажалкі ў цяню вербаў бялелі столікі, каля якіх завіхаліся некалькі чалавек.

— Мы вырашылі арганізаваць наша маленькае свята на свежым паветры,— казаў, азіраючыся на госця, Літаў.— Думаю, так будзе зручна: барбекю, ды і проста прайсціся па садзе.

Спусціліся па драўляных, у зямлі, прыступках; калі праходзілі берагам сажалкі, Рак заўважыў на паверхні некалькі чырвоных і жоўтых галаватых дэкаратыўных рыбін.

— ...Не паверыце, але форма стала мае важнае значэнне,— штохвілінна азіраючыся, не сціхаў Літаў. Ён хваляваўся, цяпер Рак бачыў гэта.— Каб застолле атрымалася

прыемнай падзеяй, а не простай вячэрай, лепш адмовіцца ад ідэі прамавугольнага стала... лепшы стол не прамавугольны, які надта афіцыйна-строгі, і не круглы, нязручны для бяседы, а авальнай формы... Яшчэ папрашу звярнуць увагу на абслугу: для маленькіх кампаній трэба адзін кухар, адзін афіцыянт-адэпт — паводле правілаў невялікага раўта...

Спусціліся яшчэ ніжэй, у сад, паказаўся бункер, таксама знаёмы Раку з апісанняў Самусенкі. Не даходзячы, аднак, да яго, звярнулі да невялікай альтанкі ў зацішным кутку двара. Перад ёй была пляцоўка для барбекю з грылем, каменны агмень з паглыбленнем для вогнішча, стаялі дзве скураныя, пульхныя, бы надзьмутыя паветрам, канапкі.

— Прашу, сядайце — зручная мяккая мэбля памагае расслабіцца і дае цудоўны адпачынак,— не сціхаў Літаў.— Нават у прахалодны вечар тут цёпла ад жывога агню, а дах над галавой не толькі аб'яднае сяброў, але і ўратуе ад непагадзі і спёкі. Не ведаю, як вы, а я дык вельмі люблю гэтае месца!

Слухаючы яго балбатню, Рак спачатку адчуваў нейкае неўразуменне, потым здзіўленне, потым неспакой — як бы ён нешта забыў і ніяк не можа ўспомніць, і хочацца аглядаць сябе, лапаць па кішэнях, шукаць непарадак у адзенні. Апамятаўся ён, калі Літаў асцярожна крануў яго калена, патрабуючы ўвагі.

— ...Мястэчка, патрыярхальнае, ціхае, кот, сабака, пеўні... А людзі! Галоўнае, людзі! — Літаў памаўчаў крыху і прамовіў урачыста: — Дык вось — нават там у вас знайшліся чытачы! Лепш сказаць, чытачкі. На жаль, не ўдалося толкам пагаварыць, я толькі і паспеў пахваліцца сяброўствам з вамі, паказаў вашу кніжку...

— Ах, вунь як. Цяпер зразумела. А я падумаў...

— Што вы падумалі?

— Яна пазваніла мне адразу ў той вечар. Я падумаў, сама ўспомніла.

— Вы ведалі яе?

— Некалі даўно. Як яна жыве?

— А вось, паглядзіце.

У руцэ ў Літава з'явіўся планшэт, і ён пачаў гладзіць пальцам манітор, пракручваючы здымкі. Мільганула атуленая кустоўем рака, высокі рабы хлопец у майцы з «Пагоняю», дзяўчынка ў акулярах, у чырвонай спаднічцы, падобная на маладую Ірму. Літаў паказваў, а сам уважліва сачыў за тварам Рака.

— Што з вамі? Чаму вы такі бледны?

— Амаль не спаў ноч.

— Вось і мая Ірма. Поўня, а можа магнітыя буры.

— Мабыць, буры.

Літаў азірнуўся, памаўчаў і нарэшце загаварыў нармальным голасам, без свайго крыўляння:

— Я ведаю, вы сустракаліся з Ірмаю. Бедная жанчына! Мне не зусім прыемна такое казаць, у мяне разрываецца ад жалю сэрца, але я вымушаны быць з ёю строгім, нават жорсткім, каб не даць волю шкадаванню. Справа ў тым, што яна... не зусім здаровая. Ад рэўнасці ў чалавека часам могуць узнікнуць сур'ёзныя праблемы з псіхікай. Толькі ц-с-с! Між намі. Я проста збіраю матэрыялы, падбіраю людзей для сваёй новай мастацкай рэчы, а яна немавед што забрала сабе ў галаву. То — нібыта ў мяне нейкі высокапастаўлены брат і я нібыта вінаваты ў яго ліквідацыі, то — нібы я збіраюся яе мяняць на маладзейшую... Я знарок папрасіў вас раней прыехаць. Я вам раскажу ўсё, а вы ўжо самі зробіце выснову.

Рак аслабіў гальштук, расшпіліў верхні гузік у сарочкі, вызваліўшы востры кадык на худой шыі.

— Гэтай зімой мне давялося з'ездзіць у Варшаву — па лясных справах, наконт паточаных караедам дрэў, і заадно для вырашэння сваіх банкаўскіх замарочак. У банку сказалі, што калі разбяруцца — паведамяць. Мяне не ўзрадвала гэта, надта былі патрэбны грошы, таму вярнуўся з Варшавы з пустымі рукамі і не ў настроі, а тут яшчэ пад гарачую руку жонка. Я, каб яна адчапілася, экспромтам, на хаду выдумаў міфічнага брата — і сам не рад быў, бо потым колькі ні даказваў, што гэта выдумка, яна не верыла. А ў канцы сакавіка прыйшло з банка чаканае

паведамленне, я ўскрыкнуў ад радасці, Ірма пачула, супаставіла з тым ідыёцкім забойствам у Кіеве палітыка... Вось так як яно было насамрэч. Праўда, у той вечар, калі яна вярнулася ад вас, я, здаецца, змог пераканаць яе, што ніякага брата не існуе, як і ўсё астатняе — мае выдумкі, што я проста ўвесь у працэсе стварэння мастацкага твора... Яна паверыла, прынамсі, зрабіла выгляд, што паверыла. Але хто ведае, што ў гэтай хворай беднай галаве?

Пачуліся крокі. Ірма хутка падыходзіла да альтанкі.

— Мужчынам нягожа так доўга сакрэтнічаць. Нашаму паэту сумна з табой, яго трэба яшчэ пазнаёміць...

Сваімі худымі, нечакана моцнымі, як жалезнымі, пальцамі сціскаючы за локаць, яна павяла Рака да сталоў, дзе ўжо збіраліся людзі. Рак яшчэ здалёк пазнаў голас Самусенкі.

— Ну што, пераканаліся? — ціха спытала Ірма.— Не верце нікому. Слухайце і запамінайце. Вы абяцалі.

Рак на хаду зняў гальштук і запіхнуў у кішэню, у кампанію да пенала з жэтонамі. У гэты момант Літаў дагнаў іх, зноў падхапіў Рака пад руку і падвёў да высокага, як асвер, сухапарага, як піка, чалавека спартыўнага целаскладу, у чорных джынсах, у белай кашулі са стаячым каўнерыкам. Чалавек гэты, трымаючы ў руцэ фужэр з віном, упярыўся ў Рака немігаючымі вачыма. Калі Літаў пазнаёміў: «Віктар Рак — літаратар, Асавец — лесапрадпрымальнік»,— ён загаварыў бубнявым голасам, паказаўшы роўныя, але крышку падпсаваныя тытунём зубы:

— Літаратура — тое, без чаго не абысціся.

— Не думаю,— даволі непрыязна сказаў Рак. Усё жыццё ён ацэньваў іншых мужчын па адным няхітрым крытэрыі: могуць яны падабацца жанчынам, ці не, і калі бачыў, што не падабаюцца, адразу адчуваў сімпатыю да такога чалавека; калі ж разумеў (невядома якім чынам), што падабаюцца,— імгненна праводзіў віртуальную мяжу паміж ім і сабою, насцярожваўся, натапырваўся, зацінаўся — а насамрэч проста зайздросціў. Асавец быў з тых, што жанчынам падабаюцца.

— Не думаю,— паўтарыў Рак.— Літаратура перажывае не лепшыя часы.

— Колькі яна існуе, столькі ж пісьменнікі сцвярджаюць пра неспрыяльныя для яе часы. Я ж лічу так: калі б адны людзі не цікавіліся, напрыклад, паэзіяй і не гатовыя былі плаціць за кніжкі грошы — другія людзі іх бы проста не пісалі. Правільна?

Рак усё гэткім жа непрыязным тонам адказаў, што ён ведае практычна кожнага са сваіх чытачоў, можа пералічыць іх ледзь не па імёнах, напярод адгадвае іх рэакцыю — «Вось і атрымліваецца, што пішаш як бы на заказ».

— Гэта ў вас прамаўляе сціпласць. Нават у цяперашнія часы, нават сярэднім пісьменнікам быць так ганарова, так прыемна! Гэта доля абраных. Я ўжо не кажу, што кожны пісьменнік, вялікім ці малым ён сябе лічыць, не ведае сваіх магчымасцей і аднойчы, сам аб тым не здагадваючыся, можа такое напісаць!..

XX

Вербы сваімі вузкімі, як у аліўкавых дрэў, частымі лісткамі давалі прыемны цень. Лісткі ледзь варушыліся, і на зямлі, на траве, на стале, на тварах гасцей гулялі плямкі святла. Побач з вялікім агульным сталом прыткнуўся яшчэ адзін, меншы, з мяснымі закускамі і гароднінай, каб кожны мог бачыць і заказваць, што яму падабаецца. Гаспадар з гаспадыняй селі пасярэдзіне *tête à tête*, справа ад Ірмы — Рак, леваруч — доктар Шнэйдар з жонкаю, затым Асавец; паміж Ракам і Літавым — дзед Самусенка. Цэнтральнае месца стала займаў сервіз з шкла, срэбра і парцаляны, аформлены кветкамі, садавінай і ярка-зялёнай свежай лістотай.

«Сюрту дэ табль»,— шапнуў Раку Самусенка, які, пабываўшы ў Парыжы, лічыў сябе спецыялістам у французскім этыкеце.

Абрус і сурвэткі былі снежнай белаты (заўсёды баішся, каб што не капнула, не пралілося). Стаячыя сурвэткі нагадвалі востраверхую тыяру Папы Рымскага. Шкло і

крышталь блішчэлі; кожная дэталь на стале — з густам, нічога груваcткага, няўклюднага, што перашкаджала б гасцям бачыць адно аднаго ці замінала б вачам або бяседзе. Празрыстыя сподачкі з жэле, з сырам, шкляныя талерачкі з саленнямі, вазачкі з салатаю былі расстаўлены ў паўторнай чарговасці. Перад кожным — талерка, відэлец, нож, лыжка; чатыры фужэры рознага калібру і пяты — для вады; сальнічка з лыжачкай і талерка з французскай булкай.

На першае быў суп, не наварысты, каб не перабіць апетыт перад іншымі стравамі. Афіцыянт-адэпт у белых пальчатках з накінутай на руку сурвэткай падыходзіў па чарзе да кожнага і пачціва схіляўся, аб нечым пытаючы. Рак заўважыў (нібы выконваючы дадзенае Ірме слова нічога не прапускаць), якія чыстыя і мяккія ў яго туфлі. Калі ён дабраўся да Рака і ціха спытаў, якому віну, беламу ці чырвонаму, ён аддае перавагу, Рак папрасіў чырвонае, потым белае, а затым, асмялеўшы, сказаў: херас. Віно было пасля супу. Затым на талерцы з паловай варанага яйка і растопленым маслам падалі нарэзаную рыбу, за ёй — закускі ў выглядзе мясных і грыбных паштэтаў; кактэйль-салат з крэветкамі, свежай зелянінай і цытрусавымі, вяндліна з сырам, аліўкамі і арэхамі, канапкі з сёмгаю, салата з ананасамі, валаваны з чырвонай ікрой, рулецікі з цукіні і рызотаю, следам — смажанае мяса, гарнір для якога падавалі асобна на вялікім сподзе, каб госць змог выбраць колькі захоча. Пад стук нажоў і відэльцаў Рак сядзеў, не могучы ап'янець і расслабіцца нават пасля моцнага херасу. Побач Самусенка еў многа і ў ахвоту, да віна не дакранаўся, а піў залацістае віскі маленькімі, 1/3 *drink*, глыткамі. Заняты сваімі назіраннямі, Рак не адразу ўцяміў, што Літаў ужо нешта кажа, а ўсе, хоць і працягваюць адначасова выпіваць і закусваць, слухаюць.

— …Што такое феномен сацыяльных сетак? — гаварыў Літаў. Вочы ў яго і праўда свяціліся нейкім маніякальным бляскам.— Гэта магчымасць рэалізаваць творчы патэнцыял, закладзены ў кожным ад нараджэння. Паглядзіце,

колькі з’явілася ў адначас паэтаў, празаікаў, рэжысёраў, блогераў —яны ж адначасова гледачы, і чытачы, і слухачы; значыць, была такая цяга да творчасці і раней, проста не было магчымасці рэалізавацца. Адзін на тысячу, можа, прабіваўся. А цяпер плаціну прарвала, і аказалася, што кожны ў той ці іншай ступені творчы чалавек, асабліва ў нас у Беларусі...

У доктара Шнэйдара піскнуў мабільнік, і Літава аж перасмыкнула — яшчэ перад тым, як сесці за стол, ён мякка, але настойліва папрасіў адключыць гук у тэлефонах.

— Сябры мае. Я планаваў сабраць вас на прэзентацыю сваёй гістарычнай кнігі. Але, калі быць да канца шчырым, як мне тут некаторыя сказалі, яна не такая геніяльная, як мне здавалася. Я астыў да яе. Рэальнае кіно! Вось за чым будучыня. Дзеля гэтага я вас шукаў, падбіраў і нарэшце сабраў. Коратка для тых, хто не ведае... Зрэшты, каб не чытаць лекцый за нашым утульным сталом, папрашу раздаць тэкст.

Адэпт-афіцыянт імкліва і нячутна пранёсся і перад кожным паклаў аркушык паперы. Рак узяў свой і прачытаў:

«Рэальнае кіно (РК) — абсалютная адсутнасць сцэнарыя. Сцэнарый і рэальнасць несумяшчальныя. Прычым РК не копія рэальнасці. Да пачатку здымкаў выбіраецца толькі месца...

...ніякіх маральных абмежаванняў для аўтара ў працэсе здымак. Акрамя юрыдычных. Для аб’ектаў і герояў дапускаюцца ўсе, што толькі існуюць, тэхналагічныя метады: звычайная камера, кінаназіранне, прыхаваныя здымкі і інш. Этычныя пытанні вырашаюцца не на здымках, а ў працэсе мантажу фільма...

...якасць здымкаў не мае значэння: выява другасная — рэальнасць першасная. Кінастужку, студыйны гук і святло, ракурс і кампазіцыю можна ігнараваць дзеля магчымасці фіксацыі рэальных падзей...

...ніякай інсцэніроўкі і рэканструкцыі — аўтар можа правакаваць герояў на любыя дзеянні і сам можа быць актыўным удзельнікам...

...ніякіх абмежаванняў у працягласці фільма, ажно да бясконцай прамой трансляцыі...

...адмова ад паняцця тэрміна «канец фільма». Ніякі фільм не можа быць завершаным, бо рэальнасць бясконцая. У выніку аўтар у любы момант можа ствараць новыя версіі фільма і працягваць здымкі пасля публічнага паказу...»

— Усе азнаёмілся? Вось аб чым я даўно марыў — зняць такі фільм. У Латвіі не атрымалася, а тут атрымаецца. Гэта і ёсць мая ідэя-фікс. Беларусь — краіна творчых людзей, таму і наш фільм будзе пра творчасць. Фінансавае забеспячэнне бяру на сябе. Я хачу сабраць разам прадстаўнікоў беларускамоўнай інтэлігенцыі. Я спыніўся на вас, бо ў вас ва ўсіх натуральная жывая мова, выдатнае яе адчуванне. І вось беларускамоўныя людзі проста ходзяць, пішуць, спрачаюцца, ядуць, ходзяць у прыбіральню, прымаюць душ, сядзяць за камп’ютарам... Ім нічога не трэба будзе рабіць, проста жыць, як у рэальным жыцці.

— Баюся памыліцца,— сказаў Асавец,— аднак, па-мойму, у гэтым накірунку сёе-тое зроблена. Такіх фільмаў процьма. «Дом-2», напрыклад. Ці не так?

— Гледзячы як падаць. Прыкладны сцэнар мною ўжо распрацаваны. Героі — звычайныя людзі, выбраліся на пікнік, сядзяць каля ракі, натуральна — размаўляюць па-беларуску. Тут пачынае накрапваць спачатку дробны грыбны дождж, які не сціхае, а толькі ўзмацняецца, і вось ужо — стыхійнае бедства, патоп, людзі адрэзаныя вадой, на востраве, без сувязі, без усведамлення, што адбываецца. Тут чарада няшчасных выпадкаў... героі адзін за адным знікаюць, і становіцца зразумела, што гэта не няшчасныя выпадкі, а ўсё прадумана. Яны як павукі ў слоіку адзін аднога з’ядаюць... нарэшце застаецца адзін, самы хітры, але патоп змывае ўвесь востраў разам з уцалелым шчаслiўцам. Гэтым я хачу сказаць, што супраць прыроднай стыхіі бяссільныя ўсе хітрыкі чалавечага розуму,— патлумачыў Літаў.

— Баюся памыліцца,— зноў азваўся Асавец,— але нешта падобнае ўжо было, з дзесяццю негрыцянятамі, напрыклад.

— Я не настойваю. У мяне толькі ідэя, каб вас завесці. А сюжэт можам прыдумаць разам. Тым больш сярод нас сапраўдныя спецыялісты, людзі, абазнаныя ў творчасці.

— Што за тэма! — усклікнула Ірма.— Забойствы, злачынствы... Як пошла. Чаму нельга нешта лірычнае, светлае? Я ўвогуле не магу ўявіць абставін, пры якіх можна было б пазбавіць чалавека жыцця, нават у кіно.

— Ты камара не заб'еш,— усміхнуўся Літаў.

— А мне падабаецца,— сказаў доктар Шнэйдар.— Трэба злачынства. Мала таго — максімальна праўдападобнае. Раз ужо рэальнае кіно. Аднак я не зусім згодзен з падборам персаналу. Трэба хоць бы пачатковыя навыкі, інакш мы такога наламаем...

— Не, мілыя: менавіта прафесіяналізм, вопыт артыста будзе скоўваць. А трэба поўнае зліццё, каб ні цені сумнення: калі паэт — дык сапраўдны паэт, доктар падобны на доктара, а лесапрамысловік каб мог адрозніць асіну ад ліпы.

— А што, мога буты! — шаптаў Раку Самусенка, штурхаючы яго пад локаць.— Можа атрымацца. У нашых смеласці менш. Вунь Мулявін — прыйшоў збоку і зрабіў. Можа, і гэтаму ўдасца ўзняць нашае занядбанае кіно на належную вышыню,— і ад гэтых яго слоў у Рака чамусьці ўсплыло ў памяці, што Мулявін звычайнае беларускае слова «чырвоная» вымаўляў праз два, нават праз тры «н», і не паспеў ён гэта ўспомніць, як у яго само сабой зазвінела ў галаве: «Чырвон-н-ная ружа, не стой пры дарозе, чырвон-н-ная ружа, хто йдзе, той ламае-е!»

XXI

Каля дзесяці вечара, калі сонца зусім села за пагорак, вада ў сажалцы пацямнела і адтуль пацягнула свежасцю, а лісткі вербаў зашумелі без ветру, госці перайшлі ў веранду, дзе іх чакаў столік з дэсертам. Стаяла перадначное сутонне, амаль прыцемкі. У двары на пляцоўцы

перад уваходам цьмяна свяціліся круглымі шарамі ліхтары. Кусты і дрэвы за імі выглядалі фантастычнымі прывідамі. Веранда ўся, акрамя дзвярэй і вокан, спавіта была плюшчом, таму ўсярэдзіне было прахалодна і паўзмрочна. Ірма запаліла свечкі. Іх мяккае святло («карыснае для вачэй», патлумачыў Літаў) адразу ўтварыла нейкую ізаляваную ўтульнасць, нешта англійскае з'явілася ў гэтым — вось калі госці збіраюцца на загараднай віле ці ў старым замку, адрэзаныя бурай ці залевай ад свету, лорды, лэдзі, абслуга, незаконна народжаныя дзеці, атрута, таямнічае забойства, інтрыгі, стары дварэцкі, які ў пэўны момант нагадвае забойцу, маладому лорду, што ён — сведка, усё ведае, усё бачыў, але згодны маўчаць за пэўны ганарар, які спатрэбіцца яму на спакойную старасць, а ўнукам — на вучобу ў Кембрыджы.

Кава і лікёр у тонкіх высокіх кілішках падаваліся разам з дэсертам: кандытарская выпечка, марозіва, асвяжальныя сарбеты. Асавец папрасіў дазволу закурыць. Раку таксама нясцерпна хацелася, але ён цярпеў, бо намерыўся кінуць гэтую дрэнь. Ад авальнага стала пад вербамі разам з сабой сюды прынеслі і тэму: злачынствы, забойствы, няшчасныя выпадкі. Загаварылі пра вечнае: ці бываюць сітуацыі, пры якіх можна, нават патрэбна пазбавіць чалавека жыцця? І ці можна такое апраўдаць? Гэтая тэма пацягнула за сабой яшчэ адну, таксама як свет старую — ці магчыма ідэальнае забойства? Успомнілі Калоева — яго помсту швейцарскаму дыспетчару. Прыгадалі Троцкага і Кенэдзі. Перабралі ад Джахара Дудаева з Гамсахурдзіяй да беглых алігархаў у асабняках з аховаю ў Англіі. Вырашылі: пры жаданні забіць чалавека заўсёды было лягчэй лёгкага, у любой кропцы зямнога шара і ў любы час сутак, «ці не так?»

— Наша шчасце,— сціпла ўмяшалася Ванда Вацлаваўна,— што людзі калі і жадаюць зла бліжняму, дык часцей за ўсё ў думках. Інакш усе даўно проста перабілі б адно аднаго.

— І ўсё ж,— сказаў Літаў,— ці магчыма ідэальнае злачынства? У дадзеным выпадку ідэальнае забойства?

— Немагчыма,— сказаў Асавец.— Няма ідэальных. Чым больш яно нібыта ідэальнае, тым прасцей яго раскрыць. Правільна?

— Ідэальнае забойства магчыма,— сказаў доктар Шнэйдар, асцярожна лыжачкай зачэрпваючы марозіва з крэманкі,— калі ахвяра сама падстаўляе галаву пад абух. Або калі ўсё падагнана пад як мага больш праўдападобны няшчасны выпадак. Ідэальныя злачынствы таму так і называюцца, што застаюцца тайнай, мы пра іх проста не ведаем.

— Мяне заўсёды цікавіла,— не ўнімаўся Літаў,— ці мог бы чалавек забіць пры поўным алібі, пры абсалютнай гарантыі, што нічога яму за гэта не будзе?

Ірма пад сталом дакранулася туфлікам да нагі Рака.

— Поўнае беспакаранне! — гучна паўтарыў падпіты чырванатвары Самусенка.— Калі б надарылася такая магчымасць, не ведаю, асабіста я аднаго-двух прыкончыў бы! Але што потым? Смяротнае пакаранне або пажыццёвае зняволенне.

Ірма, грэбліва крывячы вусны, сказала:

— Фу, зноў забойствы, злачынствы!.. Такое варварства ў наш час. Доктар, хоць вы мяне падтрымайце.

— І рад бы — ды не магу,— развёў рукі Шнэйдар.— Я за смяротнае пакаранне.

— Ну-у. І неарыгінальна, і нечакана ад вас, гуманіста.

— Чаму — у смяротным пакаранні, я лічу, больш гуманізму, чым гнаіць няшчасных да канца жыцця. Іншая справа — выканаўца. Як гэта потым насіць у сабе?

— А між тым сярод нас жывуць людзі, якія прыводзяць у выкананне смяротныя прысуды...

Перакінуліся ўжо на гэтую таямнічую тэму. Як гэтыя выканаўцы ходзяць, ездзяць разам з людзьмі, як іх дзеці, жонкі? «А вы думаеце, жонкі ў курсе?» — «Упэўнены, што не; думаюць — так, у нейкай установе паперкі перабіраюць, у камп'ютарах пасьянс раскладваюць, у танчыкі рэжуцца, крыптавалютамі цікавяцца і ўвогуле яны вегетарыянцы, любяць класічную музыку, сабак і дзяцей».—

«Менавіта! я чуў, яны сентыментальныя, лірычныя, нават умеюць чырванець і плакаць».

— А вы заўважылі,— усклікнуў Літаў, якога надзвычай натхняла гэтая тэма,— заўважылі, што мы ў гэты вось момант ужо калектыўна ствараем наш будучы сцэнарый! Цяпер яго можна толькі падмацаваць крымінальнымі гісторыямі, і мы прыйдзем да таго, аб чым я здагадваўся. Прапаную кожнаму расказаць якую-небудзь сваю гісторыю. Хто першы?

Літаў звяртаўся да ўсіх, але Раку падалося, што найбольш да яго аднаго. Ён сядзеў, не падымаючы галавы, толькі перасыпаў з далоні ў далонь жэтоны (ён і сам не заўважыў, калі дастаў іх з кішэні) з выглядам гульца ў казіно, якому толькі што замест чырвонага, на які былі пастаўлены ўсе грошы, выпала зэро.

— Тады хто? Доктар? Калі ласка.

— Усё маё свядомае, можна сказаць, жыццё,— пачаў Шнэйдар,— я меў заклятага сябра, свайго калегу-доктара. Прозвішча называць не буду, яно даволі вядомае. Гэты чалавек паскудзіў мне чым толькі мог. Са студэнцкіх гадоў — мы разам вучыліся — падстаўляў падножкі, пісаў кляўзы; пазней, калі лёс звёў нас на адной кафедры і мы практыкавалі ў адной бальніцы, калі — усё бывае! — пад маім скальпелем паміраў чалавек, я не ведаў, куды дзецца ад праверак, мяне вымучвалі разборкамі аж да пракуратуры ўключна. Неяк на Новы год мне выпала дзяжурства. І вось у аддзяленне чэрапна-мазгавых траўмаў паступае пасля аварыі...

— Аварыі,— паўтарыў, гледзячы перад сабой у сцяну, па якой кідаліся язычкі ад свечак, Самусенка.

— Разбіўся на машыне. Ён не мог гаварыць, але і не маўчаў, і што сама больш мяне ўразіла, гэта гукі, якія ён выдаваў: ён гучна, па-авечы мэкаў і бляяў на ўсё аддзяленне. Хацелася заціснуць вушы і ўцякаць. І вось калі я ў аперацыйнай калупаўся ў яго галаве, выбіраў з мозга асколкі чэрапа, і ён ляжаў перада мною, такі безабаронны, распластаны, а ў вушах стаяла яго авечае мэканне, я раптам так пашкадаваў яго, як нікога ў жыцці не шкадаваў.

— І ў вас зусім не ўзнікла думкі?.. Адзін рух скальпелем...

— Ну што вы. Помсціць і караць — не наша прэрагатыва, на гэта ёсць вышнія сілы, людзям яны такога не даручаюць. Я іншае хацеў сказаць. Я б арганізоўваў рэгулярныя экскурсіі ў бальніцы, каб людзі разумнелі і цанілі жыццё. Бо людзі часта лічаць сябе няшчаснымі толькі таму, што не ведаюць, якія яны шчаслівыя.

— Дзякую, цудоўна. Гэтую гісторыю можна выкарыстаць. А зараз хто — паэт? Не? Тады чалавек, які больш за нас усіх, разам узятых, у гэтым плавае, прафесіянал... Прашу.

— У нашых мясцінах,— занудным, крыху ў нос галасам пачаў Асавец, не міргаючы вачыма,— гэта каля Ельска,— для тых, хто не ведае, мы з шаноўным Анатолем Фядосавічам Самусенкам, як высветлілася, землякі, вельмі, вельмі прыемна! — гадоў дзесяць назад адбыўся незвычайны выпадак. Многа пра яго пісалі, калі хто не верыць — і цяпер можна адшукаць у інтэрнэце. Бацька з сынам, зацятыя браканьеры, на паляванні забілі лесніка. Не куляй, а жорстка, дзіка — прыкладамі, «затаўклі», як кажуць мясцовыя. І прыдумалі вось што — вывезці ў прыцемках цела на шашу, падалей, і кінуць, нібыта збіла яго машына. Дачакаліся вечара, паклалі цела ў багажнік, павезлі ў бок Нароўлі, яснымі дарогамі. І тут на выездзе на шашу, на ўзлеску — даішнік з матацыклам...

— Матацыклам,— адгукнуўся зусім прыгнечаны Самусенка.

— Як ён адзін заехаў у лес, чаму спыніў незнаёмую машыну ў прыцемках, сярод дрэў і кустоў — нічым іншым нельга вытлумачыць, як тым, што лёс у яго быў такі. Бацька з сынам пераглянуліся, зноў-такі прыкладамі, як ім падалося, забілі, няшчаснага даішніка, выцягнулі з багажніка цела лесніка, з кабуры даішніка пісталет, сын стрэліў у леснікоў труп, а бацька ўклаў пісталет у нерухомую мёртвую руку даішніка. І пакінулі на ўзлессі бездыханныя целы. Разбірайцеся, як яно было, хто на каго напаў і хто ў каго страляў. Даішніка неўзабаве свае знайшлі, ён выжыў,

толькі калі апрытомнеў, нічога не мог сказаць — страціў памяць. У руцэ пісталет, побач труп. Мала хто сумняваўся, што ён забойца. Была цэлая гісторыя. Разблыталі ўсё з дапамогай балістычнай экспертызы, якая паказала, што стрэл быў у мёртвае цела, да таго ж страляў ляўша — з левай рукі ўваход кулі іншы. Заставалася толькі праверыць усіх леварукіх браканьераў — ці не так? Я гэтым хачу сказаць,— закончыў Асавец,— што забіць кожны можа, а вось дзе схаваць цела? Вялікая зямля, а не схаваеш.

— Ну, вы пад усё падводзіце філасофскую аснову,— сказаў Літаў.

Тут усе, акрамя Рака, захваляваліся, ажывіліся, пачалі даваць уяўным забойцам парады, як трэба было б лепш зрабіць. «Прыпяць блізка...» — «Так, спіхнуць у раку, і хай бы несла ва Украіну, а там шукайце. Ідэальна атрымалася б».

— Хто далей? Можа, нарэшце, наш шаноўны паэт?

Рак адчуў, як сціскаецца нешта ў грудзях, не хапае паветра, хоць не было на ім гальштука, збіваецца дыханне, кружыцца галава. «Што гэта?! Дзе я?! Што ім трэба?!» — стукала ў яго скронях. «Нашто яны сабраліся тут? Чаму яны так пазіраюць на мяне?!»

— Мая чарга,— заявіла Ірма.— Пра ідэальнае забойства.

— Лепш не трэба,— крыва ўсміхнуўся Літаў.— Ты не зможаш. Не думаю, каб было камусьці цікава.

— Цяпер модна ўцякаць у Кіеў і там прасіць палітычнага прытулку. І вось, дапусцім, якогась важнага чыноўніка, дзяржаўнага мужа камусьці кроў з носу закарцела прыбраць. Што робіцца? Напрыклад, знаходзіцца кілер — чалавек з Беларусі. Ён спакойна пераходзіць украінскую мяжу, на машыне з украінскімі нумарамі за гадзіну заязджае ў Кіеў, у цэнтры горада робіць сваю справу, за гадзіну вяртаецца назад, у другую краіну — шукайце. Тым больш нікому і ў галаву не прыходзіць, што тут звычайныя сямейныя разборкі, бо ўсе разглядаюць палітычныя матывы, шукаюць фанатыка-нацыяналіста... Ды і такія рэчы цяпер хутка забываюцца, сенсацыя толькі да абеду, у лепшым выпадку дні на тры, а далей перабіваецца іншай сенсацыяй.

— Не, тут палітыка,— замармытаў Літаў.— Я рашуча бракую гэта!

— Хіба не можа такога быць? У кагосьці жалезнае алібі.

— Не, з гэтага нічога не возьмеш... Так, фантазіі, выдумкі, мары... Хто далей? Ніхто? Тады я з вашага дазволу. Таксама вядомы выпадак. На тэму падмены. Жонка з мужам паехалі на міжземнаморскі курорт, а там яго чакала маладзейшая, загрыміраваная пад жонку. Яна за мяжу патрапіла праз Украіну пад чужым прозвішчам, нідзе не засвяціўшыся. Неўзабаве паплылі на катамаране з жонкаю да блізкіх астраўкоў, вярнуліся назад, і ніхто не звярнуў увагі, што жонка за пару гадзін памаладзела на пару дзясяткаў гадоў. А дома, пасля адпачынку, муж коратка аб'явіў сябрам-знаёмым, што яна зрабіла пластыку. Пагубіла, як часта бывае, драбяза, тое, што ён падазрона часта на людзях збіваўся і называў жонку новым іменем... А тут яшчэ знайшлі аб'едзеную крабамі тапеліцу, супаставілі...

— Не сумняваюся — табе такія гісторыі павінны падабацца,— заўважыла Ірма.

Усталявалася маўчанне. Усе сціхлі, уперыліся вачыма ў Рака, нібыта іх расказы былі толькі падрыхтоўкай да таго, што ён скажа. Рак упарта маўчаў.

— Хто наступны? Вы, Ванда Вацлаваўна?

Жонка доктара, міла, самую крышку шапялявячы, сказала:

— Са мной нічога такога не здаралася. Руцінная праца, пашпартны стол. Але ў студэнцкія часы ўсё ж быў адзін выпадак. Тым больш калі гаворка ідзе пра востраў — можа, згадзіцца? Неяк выехалі мы вялікай кампаніяй, дзяўчаты і хлопцы, у вандроўку на Браслаўшчыну. Там, калі хто не ведае, цэлы ланцужок вялікіх і малых астравоў і астраўкоў, некаторыя бязлюдныя, некаторыя з рыбакамі. І вось я з адным маладым чалавекам, дарэчы, тым самым Хрысціянавым сябрам-зайздроснікам,— а трэба сказаць, мой Хрысціян неверагодна раўнівы,— вось з ім мы паплылі на байдарцы, і тут, як часта бывае ў азёрнай старане, за хвіліну з маленькай хмаркі ўтварылася на паўнеба чарноцце, падняўся

вецер, паляцелі маланкі, забухаў гром, усчалася залева. На наша шчасце байдарка перакулілася каля астраўка, на які мы выплылі, а там недалёка ад берага паміж дрэў закінуты будан. Канец света, цемра, трашчаць і гнуцца дрэвы, маланкі, з неба сцяной вада! — а нам цёпла і суха, і нават утульна. Мы ні аб чым не гаварылі, проста сядзелі і радаваліся, што жывыя. Як усё раптоўна пачалося, так і скончылася. Праз гадзіну ўжо свяціла сонца. Мы выбраліся на свет белы і ўбачылі, што да вострава нясецца Хрысціян на маторнай лодцы. Каля берага саскочыў у ваду, зачапіўся за нейкія донкі, пачаў выдзіраць з нагі кручкі, кроў сочыцца... Што тут пачалося! Хрысціян быў упэўнены, што мы знарок спланавалі, каб пабыць гадзінку адным. Мы даказваем, мы апраўдваемся, ён ужо амаль верыць... І тут з будана паказваецца ўскудлачаны рыбак. Ён увесь час быў з намі, толькі баяўся абзывацца, сядзеў цішком у цёмным кутку.

Доктар Шнэйдар прыўзняўся і пацалаваў жонцы руку:

— Твае гісторыі заўсёды нічым не канчаюцца. А дзе абяцаны крымінал?

— А калі б рыбак пачаў шантажыраваць? — збянтэжана апраўдвалася Ванда Вацлаваўна.— Напрыклад, захацеў бы грошай, бо інакш раскажа майму жаніху, што ў шалашы сёе-тое адбылося?

— Вельмі павучальная гісторыя,— падвёў рысу Літаў.— Усё тайнае рана ці позна стане яўным, а калі душа чыстая, няма чаго баяцца.

— То быў першы і, на шчасце, адзіны «крымінальны» выпадак у маім жыцці.

Галасы даносіліся да Рака як праз шкло. Ён быў бледны і зусім цвярозы. Ён ужо ўсё разумеў. Ён цвёрда ведаў, што ўсе гэтыя людзі заадно і тут змова, што ніхто ніякага кіно здымаць не збіраецца, што ўсё спектакль, хлусня. Ён ужо не сумняваўся, што нездарма паўгода назад пачаў хадзіць да яго Самусенка, не проста так узнік Літаў з сваёй рэдактурай, зусім не выпадковы быў званок Лены Міхайлоўскай, і пазаўчарашні прыход Ірмы, і сённяшні раўт, і гэтыя гісторыі — усё было некім загадзя праду-

мана, спланавана, адрэжысіравана, і самае галоўнае — усё гэта дзеля яго аднаго, беднага Рака. З неверагоднай, выпуклай яснасцю яму раптам убачылася падабенства гэтых людзей да шахматных фігур: белы Літаў і чорная Ірма — кароль з каралевай, прыземістая квадратная ладдзя — Самусенка, сутулы конь — доктар Шнэйдар, яго жонка — актыўная крайняя пешка, сухапары даўгалыгі Асавец — баявы афіцэр; і ўсе яны наступаюць, заганяюць яго — адзінокага, без войска караля — у кут, абступаюць, заціскаюць, аблытваюць хітраспляценнем прыхаваных хадоў, пешачных выпадаў, перамяшчэннямі коней, дыяганалямі афіцэраў-сланоў,— а таму, калі ў верандзе з'явіўся рабы кірпаты хлопец у шортах і ў белай майцы з «Пагоняй» (як высветлілася, сын Шнэйдараў) і пачаў паказваць з фотаапарата здымкі — чамусьці толькі аднаму Раку: мільганула рака, паром, тая самая дзяўчынка, што і ў Літава на планшэце,— у Рака памуцілася ў вачах. Не магло быць сумнення, што гэта працяг разбуральнай атакі на яго, што ішло нарошчванне сіл, іх узмацненне, падрыхтоўка да стадыі эндшпіля, і не хапала толькі двух-трох апошніх хадоў, каб змясці яго з дошкі на падлогу, знішчыць, пагубіць.

Аднаго ён толькі не разумеў — навошта? Якая ў іх мэта? Што можна з яго узяць? Каму ён мог перайсці дарогу — слабы, бяскрыўдны, беларускамоўны паэт?!

XXII

У той жа дзень, пасля абеду, Лю выехала маршруткаю з мястэчка. Ужо ў Мазыры пачаліся прыгоды. Нейкая бабуля даручыла ёй дзяцей, хлопчыка і дзяўчынку, каб яна прыглядала за імі да Парычаў, дзе іх сустрэнуць. Яна нават крыху заганарылася. У маршрутцы поўна дарослых, а такую справу даручаюць ёй. Значыць, яе абаяльнасць па-ранейшаму выклікае давер. Дзеці памясціліся абое на адно сядзенне побач з ёю і адразу ж прыліплі тварамі да вакна, плюшчылі аб шыбку насы; іх цікавіла сіняе неба, белыя аблокі на ім, зялёныя купкі дрэў уздоўж шашы,

жоўтае поле, якое пачалі жаць, і камбайны пакідалі за сабой салому ў вялізных скрутках-цюках; да таго ж яшчэ і кіроўца патрапіўся аматар прыроды — калі дагналі бусла, які спакойна ішоў па ўзбочыне, ён прыпыніўся і паехаў марудна побач, каб даць пасажырам магчымасць паглядзець і сфоткаць яго. У Парычах дзяцей забралі маладыя маці з бацькам, дзякавалі ёй, далі груш. На вызваленае месца сеў высокі хлопец з кірпатым носам, з рабаціннем на твары, у чорнай майцы з «Пагоняю». Яна, як і ўсім мужчынам, машынальна ўсміхнулася яму, а ён пачырванеў, калі ногі іх выпадкова судакрануліся. Лю бачыла, як ён збіраецца з духам, хоча і не можа вымучыць тыя некалькі патрэбных для знаёмства слоў. Але не спяшалася яму памагаць. Справа была ў «Пагоні». Яна нічога не мела супраць гэтага гістарычнага сімвалу, але яе заўсёды не тое што насцярожвала, а проста адштурхоўвала любая рэч, якая робіцца ў вузкім коле абраных, амаль падпольна, непазбежна ператвараючыся ў секту. Для таго, каб любіць родную мову, зусім неабавязкова збірацца разам. Яна дастала і ўсунула ў вушы навушнікі. У Бабруйску дзед з палачкай з задняга сядзення папрасіў: «Унучка, купі мне чыпсаў і піва». Яна крыху збянтэжылася і перапытала: «Чыпсаў і піва?» — і адразу ж дзве думкі: першая — ёй не дадуць, а другая — гэты дзед нагадаў ёй мэту яе паездкі. Не паспела яна разабрацца ў гэтым, як хлопец прыйшоў на дапамогу. «Давайце я куплю». Яна выйшла разам з ім.

— Табе без пашпарта могуць не даць,— прыхільна сказаў ён.

— Так, мне не даюць ні піва, ні цыгарэт. А адкуль вы ведаеце?

— Я пра цябе многа чаго ведаю.

— Адкуль?

Ён паказаў смартфон.

— У мяне стаіць *FindFace*. Можна знайсці любога чалавека па фотцы. Пры той умове, канечне, што ён зарэгістраваны ў сацсетках.

— І гэта законна? А калі чалавек не хоча, каб яго такім чынам знаходзілі? Не думаю, што гэтая праграма доўга праіснуе. Хутчэй за ўсё яе забароняць.

— Ты да каго едзеш? — змяніў ён тэму.

Гэтае простае пытанне паставіла яе ў тупік. Упершыню яна зразумела, у якія ўмовы патрапляе ад самага пачатку свайго дарослага жыцця. Да яе раптам дайшло, што ў свеце няма ніводнага чалавека, якому яна магла б вось так адразу, не схлусіўшы, шчыра сказаць, куды менавіта едзе.

— Вучыцца?

— Не, не вучыцца,— гледзячы праз акуляры яму ў вочы, сказала яна.— Бачыце, тут такая справа. Мая маці сабралася замуж. За майго будучага айчыма. А я блытаюся ў іх пад нагамі. Яны не ведаюць, куды мяне сплавіць. І вось мой сябар, старэйшы, ці то бандыт, ці то кілер, ва Украіне ваяваў, ён прыдумаў такую штуку. У Мінску жыве дзед, у чатырох пакоях, вось я да яго і еду. Потым з сябрам будзем чакаць, калі ён натуральным чынам вызваліць кватэру. А не атрымаецца — ёсць яшчэ адзін, вельмі багаты чалавек, праўда, жанаты, але кажа, што я падобная на яго жонку, дык вось я яе яму замяню пры выпадку.

Ён нічога не зразумеў.

— Жартую,— сказала яна.— Я еду да знаёмых, сапраўды буду вучыцца на журфаку. Акрамя таго ў мяне ёсць бацька, праўда, жыве асобна, але гэта нічога не значыць, я спадзяюся, што калі-небудзь ён вернецца.

У маршрутцы, калі хлопец панёс дзеду піва, яна хутка глянула ў смартфоне, хто заходзіў на яе старонку, і калі ён вярнуўся, спытала:

— Вы немец?

— Беларускі.

— Не казахстанскі? Не хочаце павучыць мяне нямецкай мове?

І замоўкла. Ён яшчэ паспрабаваў зацікавіць яе расповедамі пра паромы, але ёй стала невыносна сумна з ім, і яна адгарадзілася ад яго навушнікамі. У Мінск прыехалі

каля сямі вечара. Нешта не тое пачалося адразу на вакзале. Тэлефон Свянцецкай не адказваў. Яна тралейбусам паехала да іх. Добра, сумка на калёсіках не замінала, была лёгкая і зручная. Пастаяла каля дзвярэй, націскаючы на званок. Нікога не было дома, ці проста не хацелі адчыняць. А калі яна выйшла з пад'езда і пайшла па сцежцы дворыка, коцячы за сабой сумку, і азірнулася, ёй падалося, што ў вакне, побач з вазонамі на падаконніку, тырчаць два жаночыя твары — як тыя дзеці ў маршрутцы, прыліплі насамі да шыбіны. Ёй стала сорамна за іх і адразу за тым — чамусьці весела. Яна ўявіла, як праз год яна пад'едзе да гэтага дома ў машыне Літава, разадзетая мінская лэдзі, і сяброўка сама выбежыць з пад'езда і будзе ўпрошваць, ледзь не на каленях стоячы, каб яна зайшла хоць на хвілінку і тым ашчаслівіла іх. А пакуль прысела на лаўку каля дзіцячай пляцоўкі.

Дворык быў пусты. Дзве бярозы, рабіна. Арэлі. Пясочніца з чырвоным вядзерцам. Заваёва правінцыялкаю Мінска. Куды падацца? Крыўда была яшчэ і ў тым, што яна па-сапраўднаму любіла Мінск, не за хвалёную чысціню — не такі ўжо ён і чысты, а за тое, што тут у людзей добрыя твары. Адчуванне, нібы зноў патрапіла за мяжу. Няўжо такія добрыя людзі не пацiснуцца ўсяго на аднаго чалавечка? — кожны раз думала яна.

Трэба было нешта рабіць. Яна перабрала спіс кантактаў у смартфоне. Хацела пазваніць маці, успомніла радасць на яе твары і перадумала. Набраць сябра і даведацца адрас дзеда? Ці пазваніць... Літаву? — усміхнуўшыся, падумала яна. Яна дастала з заплечніка кнігу «Чаромхавы чад», дзе ляжала візітоўка Літава. Паглядзела на партрэт аўтара. А можа?..

Калі позна, за дванаццаць ночы, да дома пад'ехала таксоўка і з яе выбраўся Рак, у святле фараў ён убачыў на лаўцы каля пад'езда дзяўчынку, якая неяк уладкавалася паміж заплечнікам і сумкай і, відаць, драмала. Яна закрыла далонню вочы. Пазяхнуўшы, устала з лавачкі — і Рак пазнаў тую самую дзяўчынку, якую ўвесь вечар паказвалі яму.

— А я вас чакаю,— паўсонна, мякка прамурлыкала яна.— Я вас ведаю. Вы — той самы славуты паэт,— махнула перад яго носам кніжкаю.— Я зусім выпадкова апынулася ў вашым двары і падумала, што гэта знак... я набірала вас і ў кватэру званіла таксама...

Самусенка, які ехаў разам з Ракам, бо ім было па дарозе, і які стаў міжвольным сведкам, таксама вылез з машыны, прыгледзеўся і сказаў не так Раку, як самому сабе:

— Дык ты не маніў пра дачку? Рэспект і павага!

Лю кінула на яго хуткі пагляд. «Яшчэ адзін»,— падумала яна.

— Эх, мне б такую кватарантку!

Рак між тым стаяў ні жывы, ні мёртвы. Ён не сумняваўся, што з'яўленне дзяўчынкі — працяг атакі на яго, чарговы ход, можа быць, адзін з апошніх — калі прахадная пешка вось-вось дасягне апошняй клеткі і ператворыцца ў каралеву.

— Мне няма куды ісці,— сказала яна, звяртаючыся да іх абодвух.— Не, мне ёсць дзе спыніцца, ёсць сваякі, знаёмыя... Мне ўсяго на адну ноч...

— Дык да мяне! — сказаў стары.— Сто метраў адсюль. Вунь цераз вуліцу!

Але тут Рак апамятаўся. Такі шанц ён не павінен выпускаць. Рашуча ўзяў яе за руку:

— У мяне ёсць месца.

У адказ яна зусім па-свойску пацягнулася, абхапіла мяккімі рукамі і пацалавала яго цёплымі вуснамі.

— А то б да мяне,— сказаў Самусенка з надзеяй.— У любы час дня і ночы. Ласкаво просымо.

У светлым ліфце Рак разгледзеў яе як след. Яму падалося, што час перанёсся назад і перад ім Лена Міхайлоўская, толькі яшчэ больш памаладзелая. Яны зайшлі ў кватэру. Ён зашчоўкнуў верхні замок, зачыніў на тры павароты ніжні, паклаў у кішэню ключ і павярнуўся да нязванай госці.

Частка восьмая

ГРЫНЕВІЧ

XXIII

Роўна праз тыдзень каля цаглянага дванаццаціпавярховага дома спынілася машына. З яе выйшаў чалавек — сярэдняга веку, сярэдняга росту, звычайнай знешнасці, у джынсах, кашулі, красоўках. Сівыя, жорсткія з адлівам кароткія валасы. Белыя сухія вусы. Вочы — вадзяністыя, жалудовага колеру, прыгожыя і разам з тым непрыемна пільныя: у такія доўга не паглядзіш, калі сумленне нячыстае. Ён закінуў на плячо лямку рукзака і, ледзь накульгваючы, падаўся да пад'езда. Было каля васьмі вечара. Каля дзвярэй стаяў грузавік-фургон. Дзверы былі адчынены і падпёрты цаглінаю. Нехта пераязджаў ці ўсяляўся. Грузчыкі культурна занялі толькі грузавы ліфт, пасажырскі быў вольны. Чалавек падняўся на шосты паверх, дзверы ліфта расчыніліся, і ён нос у нос сутыкнуўся з мужчынам у шортах, у белай сарочцы навыпуск. Каржакаваты, медзведзяваты. Твар непаголены, пакамечаны.

— А я вас бачыў з лоджыі,— сказаў ён, стараючыся ўсміхацца ўсмешкай прыветнага гаспадара, але вочы — пукатыя, як у рака, змучаныя бяссонніцай, выдавалі яго трывогу.— Цёмна-сіняе пежо, так? Будзем знаёмы. Віктар Рак — псеўданім.

Рука ў яго нечакана аказалася моцнай, учэпістай. Чалавек з рукзаком на плячы рассунуў ва ўсмешцы свае белыя вусы.

— Раман Грыневіч, сапраўднае прозвішча. Дык вось вы які. Я вас інакшым уяўляў. А вы проста мацак.— Грыневіч працягваў уважліва яго разглядаць.— Акрамя таго, у вас моцныя нервы і жалезная вытрымка. Патрапіць у такую сітуацыю! Любы на вашым месцы Мінск перавярнуў бы.

— Гэта здаецца, паверце! Каб не званок ад вас... Не перадаць, як я ўдзячны, што вы пазванілі і прыехалі. Я быў у адчаі.

— Не хвалюйцеся. Я ўпэўнены — нічога страшнага пакуль не здарылася.

— Веру. Вы адным выглядам унушаеце супакой. Дарэчы, а вось вас я прыблізна такім і ўяўляў. Нават здагадваўся, што вы накульгваеце.

— Чаму?

— Вы, калі мне пазванілі, спыталі, ці працуе ліфт. З нагой гэта, выбачаюся, па службе?

— Не, на паляванні. Спатыкнуўся. Аднак — мы так і будзем стаяць каля ліфта?

— Ой, што ж я... ад радасці зусім... праходзьце! Вы мой збавіцель, выратавальнік,— па дарозе ад ліфта да кватэры ўзбуджана казаў Рак.— Проста гара з плеч... А я месца сабе не знаходжу, галава кругам, упершыню з такім сутыкаюся,— усё гаварыў, прапускаючы госця ў кватэру і заходзячы следам.— Сюды, калі ласка... у мяне вялікая лоджыя, у цёплую пару года лішні пакой...

У кватэры, калі прайшлі на і праўда шырокую лоджыю і селі: госць у крэсла, гаспадар — у другое насупраць, перад столікам, на якім была падрыхтаваная закуска: вяндліна, лустачкі белага хлеба, чорная ікра ў сярэбранай вазачцы, белы і жоўты сыр, бутэлька віна і сярод гэтай сервіроўкі даволі нечакана — звычайная вясковая на дзвесці пяцьдзясят грамаў гранёная шклянка.

— У знак падзякі, што прыехалі...

Грыневіч з цікавасцю агледзеўся.

— Гарбата, кава? — спытаў Рак.— Мацнейшае не прапаноўваю, вы за рулём.

Грыневіч дастаў з заплечніка тэрмас.

— У мяне ўсё маё з сабой — зёлкі, адвар.

— Тады, з вашага дазволу,— Рак хутка наліў паўшклянкі віна, выпіў і разваліўся ў крэсле.— Прашу прабачэння,— сказаў ён, выдыхнуўшы,— што так разглядаю вас — ні разу ў жыцці не бачыў жывога прыватнага дэтэктыва.

— Ну, які я прыватны дэтэктыў. Хутчэй — сямейны псіхолаг. У нас у Беларусі і тэрміну такога няма. У сваіх аб'явах мы даем расплывістыя фармулёўкі кшталту: спецыяліст па

выяўленні і вывучэнні прычын і ўмоў узнікнення канфліктных сітуацый... Дарэчы, вось дакумент, каб не...

Рак узяў паперчыну з вадзянымі знакамі і з пячаткай унізе, прачытаў: «Пасведчанне дзяржаўнай рэгістрацыі на правядзенне расследванняў і забеспячэнне бяспекі, аказанне інфармацыйных паслуг сацыяльнай скіраванасці».

— Сапраўды, сухавата,— сказаў ён, вяртаючы паперу.— А вось мне, як і большасці звычайных людзей, пры слове «дэтэктыў» уяўляецца суб'ект у доўгім плашчы, у капелюшы, цёмных акулярах, з люлькай ці з цыгарэтай у зубах, пісталетам за поясам, з пашпартамі ўсіх краін свету ў кішэні — і абавязкова з якой-небудзь дзіўнай звычкай.

— І цяпер вы расчараваліся? — дагаварыў з усмешкай Грыневіч.— Так, літаратурна-кінематаграфічны вобраз дэтэктыва далёкі ад арыгінала. Часы Мэгрэ, Каломба, Холмса і Пуаро ў адным флаконе, на жаль, даўно прайшлі.

— Аднак я проста ўпэўнены, што нават і без арэолу кніжнай рамантыкі вашая праца цікавая і захапляльная.

— Я б не сказаў. Звычайная. Усё празаічна.

І Грыневіч цярпліва патлумачыў, што займаюцца яны выяўленнем фактаў здрады мужа жонцы і наадварот, правяраюць алібі, шукаюць украдзеныя аўто, аказваюць садзеянне ў праверцы біяграфічных і пашпартных дадзеных; хто ў пошуках інфармацыі маніторыць сацыяльныя сеткі і інтэрнэт, хто пасылае афіцыйныя запыты ў дзяржорганы, а львіная доля працы — «у полі», банальна сачыць за аб'ектам і фіксаваць яго сустрэчы — прычым яны абмежаваныя ў выбары сродкаў, ніякіх там «жучкоў» і маячкоў, ніякіх узломаў сацыяльных сетак і паштовых скрынак. Яны не могуць праслухоўваць тэлефонныя размовы па сотавай сувязі — на гэта трэба адпаведныя санкцыі. І права на нашэнне зброі ў іх няма.

— Наша зброя — фотаапарат і дыктафон. Ды і то: здымаць і запісваць можна толькі са згоды «аб'екта».

Рак спытаў, ці праўда, што да іх на працу бяруць толькі былых супрацоўнікаў праваахоўчых органаў. Грыневіч адказаў, што асабіста ён — былы следчы, падпалкоўнік, але з

ім у камандзе працуюць і юрысты, і эканамісты, і псіхолагі; так што каб быць добрым дэтэктывам, неабавязкова мець паношаны кіцель у гардэробе, галоўнае быць лёгкім на пад'ём, ведаць законы, хутка арыентавацца ў сітуацыі, быць прыемным суразмоўцам і валодаць акторскім талентам.

— Нават так?

Грыневіч ветліва пачакаў, ці будуць яшчэ пытанні, і калі яны не прагучалі, зрабіўся сур'ёзным.

— Аднак да справы. Вы сказалі па тэлефоне, што патрапілі ў неверагодную сітуацыю...

— Горш не прыдумаеш! Усе зніклі, хто быў са мной. Раптоўна, у адзін міг, з суботы па сёння. Усе тэлефоны маўчаць. Я проста апынуўся ў нейкай дурной пустаце; адчуваю, што адзін не змагу разабрацца, і калі тэрмінова не падзялюся з кім-небудзь, у мяне проста здадуць нервы, разнясе галаву... Але з кім? не з міліцыяй жа!

— Вам не пазайздросціш. Зрэшты, як і мне. Я ведаю пра гэта яшчэ менш, чым вы. Тыдзень назад да мяне звярнулася Ірма Айгараўна. Была надта ўстрывожаная, напалоханая, гаварыла загадкамі, блытана; папярэдзіла, што яны з мужам пакуль не грамадзяне Беларусі, яна не можа звярнуцца ў афіцыйныя органы, да таго ж усё ў яе на ўзроўні здагадак, прадчуванняў; сказала, што яе муж замешаны ў нейкім палітычным забойстве, ледзь не міжнародным, што яе жыццю пагражае небяспека; расказвала пра нейкага выкладчыка, нейкага доктара, пра нейкі бункер, пра тое, што нібыта муж хоча памяняць яе на маладзейшую. Наказала, калі з ёю што здарыцца, мець сувязь толькі з вамі, верыць толькі вам і звязвацца з вамі, і што вы ўсё растлумачыце. Калі яе тэлефон перастаў адказваць, я і набраў вас.

— Мы абодва ведаем няшмат.

— Тут яшчэ такая справа... Я меў неасцярожнасць узяць задатак, даволі значную па тутэйшых мерках суму. Цяпер справа гонару давесці ўсё да канца. З вашай дапамогай, канечне. Дзве галавы лепш чым адна, удвух мы гэты рэбус разгадаем.

— Я да вашых паслуг. Што вас цікавіць?

— Усё.— Грыневіч дастаў дыктафон.— Я хачу, каб вы расказалі мне ўсё, што здарылася перад гэтым масавым знікненнем. Як вы выйшлі на Літавых, колькі было людзей, пра што гаварылі... І як мага больш падрабязна.

Тут Рак пасміхнуўся неяк урачыста, задаволены, што можа памагчы чалавеку.

— Можна спрасціць задачу,— сказаў ён.— Хачу прапанаваць вам нешта больш грунтоўнае. Наша будучая гутарка ўжо запісана. Вось тут, у ноўтбуку.

Жалудовыя вочы Грыневіча бліснулі прагнай радасцю.

— Вы жартуеце?

— Ніколькі.

— Неверагодна! Я так і ведаў, што будзе нешта незвычайнае! Як прыемна мець з вамі справу! Цяпер разумею, чаму яна звярнулася менавіта да вас. Можна глянуць?

— Для таго пісалася.

Рак уключыў ноўтбук, адкрыў файл. Грыневіч упіўся вачамі ў манітор.

— Як мне пашанцавала з вамі! Прызнаюся, не чакаў, нават падумаць пра такое не мог!

— Не расчаруйцеся.

Грыневіч хутка гартаў тэкст мышшу.

— Ды многа, ды падрабязна, ды з апісаннямі, дыялогамі... Калі ж вы паспелі?

— А я пачаў рабіць запісы яшчэ зімой, як толькі пачаў хадзіць да мяне Самусенка. А за апошні тыдзень проста звёў у адно. Крышку не скончыў...

— Я маю на ўвазе, як вам увогуле гэта прыйшло ў галаву?

— Прадчуванне. Здагадваўся, што рана ці позна знойдзецца чалавек, якога гэта можа зацікавіць. І вось, спадзяюся, мая сціплая спроба паможа...

— Як спроба? — адарваўся ад манітора Грыневіч.— Наколькі я ведаю, вы і без таго творчы чалавек, даволі вядомы паэт.

— Менавіта паэт! Але ў прозе дэбютант. Даўно збіраўся паспрабаваць сілы ў гэтым жанры. Бачыце, мы, паэты, мала запатрабаваны — ну, падумаеш, напісаў пра траўку-кветачкі, у лепшым выпадку гэта можа паўплываць на настрой. А тут такая нагода — жывы рэальны сюжэт! Грэх было не пакарыстацца. Да таго ж веданне, што цябе будуць чытаць не на канапе, не ў метро па рыдэры, не крытыкі, якія па службе чытаць абавязаны, а людзі, якія не прапусцяць ніводнай дэталькі!

— Аднак як вы пісалі?

— З натуры. Амаль усіх герояў я ведаю, бачыў, размаўляў з імі, так што з партрэтамі, характарыстыкамі, рэплікамі праблем не было. Прозвішчы сапраўдныя, выпадкі ўзяты з іх уласных расказаў. Да ўсяго астатняга дапаў інтуіцыяй.

— Дык інтуіцыя і ёсць самае галоўнае! Але ж гэта неверагодна цяжка.

— Не паверыце — лягчэй, чым пратакол. Я спрабаваў пісаць суха, дакументальна — нічога не атрымалася. Давялося ажыўляць герояў у меру сваіх здольнасцей...

Грыневіч адначасова слухаў і чытаў. Колца мышы так і бегала пад яго ўказальным пальцам.

— Гэта што ж, атрымліваецца як бы... дэтэктыў?

— Не думаю. Хаця ў цэлым вы маеце рацыю. У следчага і ў аўтара дэтэктываў адна задача — з дэталяў сабраць агульнае. Але, па-першае, у маім тэксце невядомы не толькі злачынца, а і ахвяра, па-другое — я многа думаў і прыйшоў да высновы, што дэтэктыў — стары добры традыцыйны класічны дэтэктыў, дзе ўсё пабудавана на хітрым злачынстве і непазбежным пакаранні, немагчымы ў нашых цяперашніх варунках. У лепшым выпадку ён будзе ўспрыняты як парадокс, у горшым — як нацягнутасць.

— Патлумачце, калі ласка.

— У нас настолькі малаверагодны — не крыўдуйце! — справядлівы следчы, яшчэ менш — непадкупны незалежны суд, што чытач міжволі будзе на баку злачынцы.

Уменне выкруціцца, выслізнуць, абысці закон у нас хутчэй будзе лічыцца подзвігам, чым злачынствам.

Грыневіч тым часам паспеў прагартаць тэкст да канца і вярнуцца ў пачатак.

— А ведаеце,— сказаў ён задумліва,— вы падказалі мне адну цікавую рэч. Вось не магу зразумець — можа вы растлумачыце? — як, калі, чаму так атрымалася, што ў нас пісьменнікі з самых паважаных у грамадстве людзей ператварыліся ў ледзь не самых пагарджаных? Чаму іх так шпыняе ўласная дзяржава?

Рак паціснуў плячамі.

— Не думаю, каб пісьменнікі надта з-за гэтага перажывалі.

— Не скажыце. Быць запатрабаваным сваёй дзяржавай, сваім народам— што можа быць лепш?

— Нешта не разумею я вас.

— Калі б мая воля, я паставіў бы таленавітых пісьменнікаў на афіцыйную службу дзяржаве. Я б даручаў ім самыя заблытаныя, даўнія, глухія справы, даваў бы ў іх распараджэнні ўсе матэрыялы — і хай бы яны пісалі на аснове гэтага мастацкі твор! І такім чынам, ажыўляючы людзей, абставіны, сітуацыю, праз дэталі выводзілі б на разгадку. Не атрымаецца — нічога страшнага, затое калі атрымаецца!..

— У вашай задумцы ёсць істотны мінус,— заўважыў Рак — Дзе такіх знайсці? Далёка не кожны захоча пісаць на замову.

— А вось я ўпэўнены, што кожны творца аб такім можа толькі марыць. Увесьчасная запатрабаванасць, імгненны плён, практычная аддача; у яго не будзе балець галава пра грошы, перад ім больш не стане пытанне: для каго я пішу? — бо кожнае яго слова будзе разглядацца ўдзячнымі чытачамі пад лупу.

— Ды яшчэ на такія тэмы...

— Добра. Тады як вам такая тэма? Вы ведаеце, колькі людзей знікае штогод у адной толькі Беларусі?

— Паняцця не маю.

— Каля дванаццаці тысяч чалавек! Афіцыйна. Уяўляеце, колькі неафіцыйна?

— І дзе яны дзяюцца?

— Па-рознаму. Часцей за ўсё з'язджаюць у іншы горад, парваўшы ўсе кантакты са сваякамі і знаёмымі. Бывае, выкрадаюць у рабства і ўтрымліваюць сілаю, бывае, што робяцца ахвярамі злачынства, бывае, хтосьці проста пайшоў у лес і загінуў там. Нярэдка чалавека, напрыклад, збівае машына, і ён страчвае памяць.

— І што?

— А тое, што на сёння ў Беларусі ў вышуку каля двух з паловай тысяч чалавек. Некаторыя зніклі пяць, дзесяць і нават дваццаць гадоў назад. Хутчэй за ўсё многія з гэтага спісу ўжо нежывыя. Але пакуль цела не знойдзена, справу закрываць нельга, і іх шукаюць. Самымі рознымі спосабамі. У тым ліку пры дапамозе тэлепатаў, парапсіхолагаў, экстрасенсаў. Вам даводзілася бачыць па тэлевізары, як цэлы штат прафесіяналаў, сівыя следчыя ў мундзірах, пакорліва прызнаюцца ва ўласным бяссіллі і аддаюцца на волю стопрацэнтных шарлатанаў? Я дык не магу без сораму глядзець, як розныя прайдзісветы водзяць рукамі над свечкаю ці над люстраным шарам, а ў саміх вочы скошаныя ад страху, што іх вось-вось выкрыюць,— але чаму разумныя людзі цягнуцца да іх, выдатна ведаючы, што гэта нахабы, клікушы і бессаромнікі? Бо яны абяцаюць! І такой драбязы, аказваецца, дастаткова. Цяперашняму чалавеку многа не трэба: добрае слова, падтрымка, абяцанне на хэпіэнд. Асабіста я ўсё жыццё стаўлюся да эзатэрыкі з агідаю, ніколі ні ў якую замагільную, незямную звышсілу катэгарычна не веру — а вось у творчасць веру. Толькі яна бачыцца мне самай вышняй праявай неспазнанага. Дык вось, вяртаючыся да ідэі — я б заказваў пісьменнікам творы, якія давалі б сваякам зніклых надзею! І яны за адно гэта будуць плаціць любыя грошы. Гэта ж залатое дно!

— Дно — так, але ці залатое? — пасміхнуўся Рак.

— Вы мне паверце. Я ўжо бачу, што ў вас атрымалася б. Вы проста чытаеце чужыя думкі, у прыватнасці мае.

Менавіта такімі словамі я і хацеў, каб пачыналася: «У пятніцу ўвечары сямнаццатага ліпеня...»

—Не-не! — усклікнуў Рак.— Калі ласка, не трэба пры мне! Я не змагу... З гадамі так і не прывык... Давайце я выйду, а вы маякніце мне на тэлефон, калі дачытаеце.

— Дзякую за давер.

— Каму ж давяраць, як не вам?

XXIV

Чародка маладых ясеняў, на адных гірлянды сямян, якія аж гнуць галінкі, на другіх — ніводнага. Манчжурскі арэх — перыстыя, як у рабіны, лісткі, толькі разоў у пяць большыя. Нагрэтая за дзень драўляная нефарбаваная лавачка. Верхавы вецер варушыць лісце бяроз і вербаў. Але асабліва рытмічны шум у асін. Калі заплюшчыць вочы — ілюзія шуму мора. Лес, дрэвы і ёсць кампенсацыя нам за адсутнасць мора.

Неба выпуклае, як кропля, усярэдзіне сіняя, па баках светлая. Некалі трэба было даказваць, што зямля круглая, гэта ж так відавочна. Аблокі марудна плывуць па небе, як ільдзіны па блакітнай вадзе. Дзве жаўтлявыя івалгі ў кроне асіны над галавой спяваюць адна адной, ці то спаборнічаюць, якая лепш.

Жыць ахвота! Вось і будзеш жыць — кветкаю, коранем бярозы, травой, пяском, воблакам. Калі пашэнціць, івалгай. А вось жыць адным днём — сумніўная сентэнцыя. Ніколі не разумеў, чаму людзі ўладкоўваюцца ў жыцці так усур'ёз і надоўга, калі не назаўсёды, а цяпер разумею: правільна робяць. Паўнату жыцця толькі тады і пачынаеш адчуваць, калі ззаду вечнасць і наперадзе вечнасць. Па вялікім рахунку чалавеку ўвогуле нічога не пагражае, яму абсалютна няма чаго баяцца. Некалі так страшна было пакідаць матчына ўлонне — і што? Набыў новае, зямное ўлонне, куды большы свет, дзе аказалася так добра, што ўжо ў сваю чаргу не хочацца пакідаць яго.

Дзіўна, што нас палохае будучая смерць, але не палохае мінулая. Нас жа не было раней, да нараджэння, мы ўжо як мінімум адзін раз былі мёртвыя. Колькі часу? Столькі, колькі нас не будзе — вечнасць. Цэлую вечнасць мы былі мёртвыя. Значыць, мы ўжо адзін раз прайшлі бясконцасць і ўваскрэслі з яе.

Я не вельмі перажываў, калі мяне не было, я нават не магу сказаць, колькі мяне не было, і гэта наўрад ці ад таго, што чалавечы розум не ў сілах ахапіць бясконцасць; хутчэй ад таго, што бясконцасць — круглая.

Акрамя часу (а смерць усяго толькі адсутнасць часу), які існуе рэальна і з'яўляецца ўласна жыццём, ёсць яшчэ цыкл; толькі гэтыя дзве несумненныя ісціны мы можам назіраць і адчуваць — цыкл і час. Вечар, ноч, раніца, дзень; восень, зіма, вясна, лета — і так па крузе. Мы ведаем, што ўвосень усё засынае, а вясной абуджаецца. І толькі ў чалавечага жыцця чамусьці тры часткі, яно абрываецца на зіме, што само па сабе абсурд, бо цыкл не з трох, а з чатырох частак. Мы пакорліва развітваемся з гэтым светам зімой, без надзеі абудзіцца ўвесну — чаму? Калі ўсё цыклічна? Бо з таго свету ніхто не вяртаўся? Дык, можа, рана яшчэ? Можа — *пакуль* не вяртаўся?

У якой мы, цяперашняе чалавецтва, фазе? На якой стадыі? Хутчэй за ўсё ў самым зародку, у стадыі немаўляці, якое ледзь навучылася лепятаць — у фазе ранняй раніцы, самага пачатку вясны, а наперадзе яшчэ цэлы дзень-лета, вечар-восень, ноч-зіма — а там, глядзіш, памалу пачнуць вяртацца. Так — памяць будзе сцёртая, але ж хоць нешта застанецца, хоць у снах; і ў якім-небудзь сто квадрыльёнаў дзве тысячы сямнаццатым годзе будзе не разумець чалавек, што за дзіўны сон яму прысніўся: нейкая старадаўняя лаўка, нейкі шум над галавой, падобны да марскога,— што б гэта значыла?

Я несумненна ведаю, што ўва мне, як і ў кожным чалавеку, ёсць нешта незалежнае ад часу і матэрыі. Яно нерухомае, статычнае — субстанцыя. Мне ўвогуле здаецца,

што ад свайго стварэння на зямлі жывуць адныя і тыя ж людзі, якія толькі мяняюць целы, як змяіныя скуркі, ды яшчэ ў іх сціраецца памяць пра ранейшыя жыцці. Цела нараджаецца, расце, як грыб з зямлі, дасягае субстанцыі жыцця, параўноўваецца з ёю, старэе, знікае, зноў нараджаецца і зноў дарастае да гэтай субстанцыі, а яна так і застаецца непарушнай, непадуладнай часу і прасторы, і вось ужо бачыш, што толькі адна яна і ёсць, і яна «ўжо ява, не здань, што сном несмяротнасці мучыць стагоддзі»...

— Прачыталі?

У лоджыі сінела вечаровае сутонне. Грыневіч стаяў каля стала, на якім свяціўся манітор ноўтбука. Рак сядзеў у кутку ў крэсле перад столікам з закускамі.

— Ну... Ну... У мяне няма слоў. Дайце пацiснуць руку!

— Што вы...

— Цудоўна! Я ў захапленні. Калі б быў у капелюшы, я б зняў яго перад вамі...

— Лішняе...

— Праўда — як фільм паглядзеў! І па часе столькі ж.

— Дзякую, канечне, але...

— Выдатна. Я проста ўражаны. Дазвольце зрабіць вам камплімент. Вы ўвесь час пішаце, што вы слабы, тонкі, ранімы, пяшчотны, аднак у рэальнасці выглядаеце малада, падцягнута, гэтакім мацаком.

— Не, тут памылка, паверце! Знешнасць заўсёды падманлівая, асабліва ў творчых людзей. Часта бывае — хадзіў такі чырванашчокі здаровы дуб, залазіш раніцаю ў інтэрнэт, а ён ужо на чорным фоне...

— Ну што вы так адразу. Да гэтага, спадзяюся, яшчэ не хутка. А ў цэлым я ў захапленні... Як я зайздросціў заўсёды творчым людзям. Мне заўсёды здавалася, што ў іх улада над людзьмі і над часам...

— Не трэба, я гэтага не люблю... Я сціплы пісьменнік, задаволены тым, што маю...

Яшчэ нейкі час працягваўся гэты абмен кампліментамі з аднаго боку і какецтвам — з другога; Грыневіч непамерна хваліў, Рак чырванеў ад задавальнення і разам з тым

прагна лавіў кожнае слова. Нарэшце пахвальба і какецтва дасягнулі, ідучы па ўзрастаючай, свайго піку, захапленне Грыневіча пайшло на спад і пакрысе перацякло ў практычнае рэчышча. У голасе з'явіліся хоць і яшчэ пачцівыя, але ўжо прафесійныя, следчыцкія ноткі.

— Што ж. Вам удалося дзе лепш, дзе горш з кавалачкаў мазаікі, з чужых расказаў і ўласных домыслаў стварыць даволі выразную карціну. Аднак сёмы раздзел абрываецца...

— Так. Не паспеў дапісаць,— і Рак сцісла паўтарыў тое, што расказаў Грыневічу па тэлефоне. Калі гэтая дзяўчынка, Лю, апынулася ў яго, выпіла кавы, яму ўдалося разгаварыць яе, ды яна і сама, на шчасце, была не з маўклівых і распавяла яму ўсё: пра свой «вядзьмарскі» дар, пра сябра, пра адзінокага прафесара, пра маці і зніклага бацьку, пра тое, як яна выпадкова падслухала кавалачак яго, Рака, тэлефоннай размовы з маці, пра маршрутку і пра Свянцецкіх. Дзяўчынка пераначавала ў яго, а раніцай у панядзелак, пакуль ён спаў, ціха выслізнула, пакінуўшы пасля сябе толькі незасланы ложак, нявымыты посуд, кубак з-пад кавы на кухні ды запацелае люстра ў ванным пакоі.

— Далей вы ведаеце. Не толькі яна — усе зніклі! Я хадзіў да Самусенкі, на таксоўцы ездзіў да Літава, набіраў Міхайлоўскую — усё з тым жа вынікам, нікога, нічога.

— Зразумела. І што вы думаеце наконт гэтага?

Рак адказаў: «Чаго я толькі не думаў!» Яшчэ адразу, пачынаючы з візітаў Самусенкі, яго насцярожыла гэтая загадкавасць, таямнічасць, нейкая гульня вакол яго; потым ён быў збіты з толку Літавымі, асабліва Ірмай, паверыў, што ёй пагражае небяспека — і хто б не паверыў? З вясны Літаў змяніўся, а што адбылося вясной? — забойства высокага чыноўніка ў Кіеве. Цяпер нішто не перашкаджала яму пазбавіцца ад жонкі — і як ад непажаданай сведкі, і заадно сапраўды памяняць яе на маладзейшую. У Ірмы з шафёрам у сваю чаргу магла быць нейкая свая змова супраць Літава, каб апярэдзіць яго: брата ў яго больш няма, ніхто не заступіцца. Калі ўзнікла Лю з ельскім сябрам, можна было падумаць, што небяспека пагражае ўжо Самусенку...

— А далей у мяне адзін варыянт пачаў змяняцца другім. А што, калі Літаў ведаў Лю раней? З Латвіі? Памятаеце эпізод яе двухтыднёвай адсутнасці? Тады ён павінен ведаць і яе сябра. Яны маглі дамовіцца, Літаў мог чакаць, пакуль яна вырасце, і тады з яе падабенствам яны маглі прыдумаць што заўгодна. Акрамя таго, разважаў я, сябар цалкам верагодна мог аказацца тым самым кілерам, які лёгка перасякае мяжу, робіць сваю справу ў Кіеве і вяртаецца назад. Памятаеце паездкі Літава ў мястэчка і пошукі патрэбных людзей?

Грыневіч моўчкі ківаў са спагадай і разуменнем.

— І толькі на раўце да мяне дайшло! Я зразумеў, што яны ўсе заадно, што яны ўсе знаёмыя між сабой, я ўбачыў, што апынуўся ў цэнтры, усё круціцца вакол мяне, што мяне аблытваюць, уцягваюць некуды... Але куды і нашто?! Адзінае тлумачэнне, аб чым і папярэджвала Ірма: мяне трымаюць у якасці сведкі. Калі сапраўды рыхтуецца нешта— злачынства, забойства — дык каб падпусціць паболей туману і тым самым яшчэ больш заблытаць. А цяпер я адмаўляюся хоць што разумець, у мяне галава кругам...

За ўвесь час Грыневіч не вымавіў ні слова і невядома аб чым думаў. А калі Рак скончыў і развёў рукі, усім выглядам паказваючы, што нічога не разумее, Грыневіч закрактаў, паварушыўся так, што крэсла зарыпела пад ім, падняўся, хруснуў пальцамі і павёў такую размову:

— Адразу хачу вас супакоіць. Нічога не здарылася. Пакуль не здарылася. Усе жывыя-здаровыя. Літаў з жонкаю ў Латвіі, у Юрмале, як і кожны год яны туды ездзяць, Лю дома, гуляе па палях са сваім сябрам, Лена Міхайлоўская з Асаўцом рыхтуюцца да вяселля; Самусенка — у Ельску на малой радзіме, Шнэйдары, як і планавалі, адбылі ў Германію ў адпачынак...

— Як? Але чаму ніхто не адказвае?!

— Я папрасіў.

— Вы?!

— Думаю, хопіць нам, дарослым людзям, марочыць адзін аднаго. Давайце адкрываць карты. Цяпер, пасля вашай бліскучай аповесці, можна. Я і ёсць той рэжысёр, пра якога вы

здагадваліся. Я гатовы каяцца перад вамі, сто разоў, а то і больш, прасіць прабачэння за свой эксперымент, за тое, што вас у нейкім сэнсе выкарысталі... Але той бліскучы вынік, які гэты эксперымент прынёс, хоць крыху змякчае як маю віну, так і ўсіх дзейсных асоб. Хай кампенсацыяй вам будзе тое захапленне, якое я перад вамі адчуваю. Я проста ўражаны! У нас таксама ёсць пераапрананні, розныя падсадныя-падстаўныя, фальсіфікацыі, містыфікацыі, але гэта адзіны вядомы мне ў крыміналістыцы выпадак, калі мастацкі твор можа памагчы раскрыць даўняе, заблытанае, «глухое» злачынства! Ірацыянальным шляхам дабіцца рацыянальнага!

— Нічога ён не раскрывае,— перабіў панура Рак.

— Неверагодна! — не слухаў Грыневіч.— Не разумею, як чалавек практычна на пустым месцы, можна сказаць, з завязанымі вачыма, ідзе навобмацак — і не памыляецца!

Грыневіч сам нібы намацаў нейкую патаемную кнопку пад назвай «самалюбства» і ў патрэбны момант, як толькі Рак пачынаў крыўдаваць, націскаў на яе — пачынаў яго хваліць. І Рак астываў.

— Усё ж я патрабую тлумачэння,— прымірэнча сказаў ён.— Які сэнс у гэтым?

— Сэнс у тым, што мяне мала цікавяць сямейныя праблемы бяскрыўднага графамана Літава, у якога, дарэчы, з гэтым усё ў парадку — ён без памяці закаханы ў сваю Ірму, у сваіх дзяцей; не цікавяць ні яго браты — як сапраўдныя, так і выдуманыя, ні самотны інтэлігент Самусенка, ні Лю з сябрам, які, дарэчы, сціплы, ціхі, у акулярах студэнт-завочнік, не цікавіць Асавец з яго нібыта праблемамі наконт будучай падчаркі... Усё гэта пусканне пылу ў вочы, дымавая завеса.

— Тады што вас цікавіць?

— Больш рэальны выпадак,— Грыневіч вытрымаў паўзу.— Першы муж нашай агульнай знаёмай Лены Міхайлоўскай, Каралёў Віктар.

— Вы хочаце сказаць...

— Хачу сказаць, што ёсць падазрэнне, а пасля вашай аповесці — можна яе так называць? — ужо і ўпэўненасць,

што Каралёў не знік, не з'ехаў, ён загінуў. І не ад няшчаснага выпадку, а гвалтоўнай смерцю.

— Пры чым тут я?

— Вы унікум, творчы чалавек. Я вырашыў заінтрыгаваць вас, зацікавіць, паспрабаваць стварыць вакол вас атмасферу тайнаў, інтрыг, загадак, крыміналу, разыграць заблытаную сітуацыю, у якой часцей мільгалі б словы: злачынства, знікненне, забойства, каб прымусіць вас прыняць у гэтым удзел, вобразна кажучы, увесці вас у транс — ведаеце, вось як медыумаў уводзяць... І спадзявацца на вашу творчую інтуіцыю, на тое, што вы — не, не напішаце, пра гэта і марыць нельга было, а хаця б зацікавіцеся і, магчыма, інтуіцыяй выведзеце на падказку. Што і адбылося.

— Чаму вы не звярнуліся да мяне адразу?

— У тым і рэч! Не можна было адразу. Трэба было, каб вы самі не ведалі. Зададзенасць магла б сапсаваць вам нос, збіць чуццё...

— І потым, тут яўная несуразмернасць. Ці варта скура вырабу? Вы разыгралі цэлы спекталь, уцягнулі масу людзей... Навошта такія складанасці? Каб прыкурыць цыгарэту, вы падпалілі АЗС!

— Гэта так здаецца. Насамрэч было зусім няцяжка. Я ўсяго толькі папрасіў Літава праз Самусенку выйсці на вас, Лену Міхайлоўскую — пазваніць вам, Ірму Айгараўну — разыграць увечары драматычную сцэнку, а потым даў наказ сабрацца ўсім на раўце і расказаць кожнаму па гісторыі. Самае цяжкае было ўгаварыць Лю прыехаць да вас на ноч, але я так расхваліў вас, так доказна растлумачыў, што вы — каштоўны медыум, які паможа ў важнейшай справе, што яна перш зацікавілася, а потым і згадзілася; плюс у яе быў свой інтарэс — яна спадзявалася, што вы сапраўды паможаце ёй з творчым конкурсам. Вось і ўсё. А вы ўжо самі нафантазіравалі, разгарнулі цэлае палатно... І зрабілі гэта на ўзроўні,— хутка дадаў Грыневіч.— Так дасканала апісалі падзеі, рэчы, людзей!

Кнопка пад назвай «самалюбства» надзейна працавала.

— Ну што ж,— і на гэты раз астыў Рак.— Мне, канечне, не зусім прыемна, што мяне выкарысталі ў нейкіх сваіх мэтах, без майго ж дазволу... Але ўсё ж з вашага боку гэта творчы падыход, а я нічога ў свеце так высока не стаўлю, як творчасць. У гэтым я ваш аднадумца. Дзеля справы чаму б не паслужыць. Але мне ўсё адно здаецца, што вы дарэмна трацілі час. У чым вынік? Дзе плён?

— Тут.— Грыневіч паказаў на ноўтбук.— Тут ёсць і ахвяра, і злачынца. Калі я ехаў да вас, я не ведаў амаль нічога. Цяпер я ведаю амаль усё.

— Вось як. Зрэшты, пачакаце. Давайце адразу высветлім — можа, вы мяне падазраеце?

— Якія падазрэнні! — усклікнуў Грыневіч, нават прыклаў да грудзей рукі.

— Дзякаваць богу. А то было б надта прымітыўна, банальна, заезджана — калі аўтар, пішучы, сам сябе выкрывае. Тым больш у наш час, час фэйкаў, фоташопаў-фотажабаў, калі дастаткова толькі захацець, толькі паказаць пальцам — і самаму святому чалавеку цяжка адмыцца. Я гатовы вас слухаць. Вечар цёплы, лагодны, мяккі. Тут утульна, камароў мала. Я не за рулём, у мяне і правоў няма, затое херас ёсць — крымскі. Ведаеце, можа, гэта не патрыятычна пасля Украіны, але люблю крымскі больш нават за іспанскі.

— Дзе вы дастаеце?

— То сябры прывозяць, а то ёсць крама «Крымскія віны». І так — я ўважліва слухаю. Што ж я такога напісаў? Што менавіта раскрыў, сам аб тым не здагадваючыся?

Частка дзявятая

ЖЭТОН НА МЕТРО

XXV

За вакном сцямнела. Рак пстрыкнуў выключальнікам, загарэлася лямпачка пад абшытай вагонкаю столлю. Круг святла падаў на стол, а куток, дзе сядзеў Рак, быў у паў-

змроку. Аднекуль узяўся камар і зазвінеў у цішыні, пакуль Рак не прыбіў яго. Грыневіч адпіў адвар зёлак з тэрмашклянкі, асцярожна пакашляў, прачышчаючы горла, і пачаў, то ў ноўтбук, то з-пад ілба на Рака пазіраючы:

— Забыў сказаць, зусім вылецела з галавы, што наш паўлегальны прыватны вышук, акрамя ўсяго іншага, спецыялізуецца на пошуках зніклых людзей. Больш за тое — гэта наша асноўная сфера дзейнасці. Таму калі да мяне звярнуўся былы калега і сябар, крыштальнай душы чалавек Асавец, маўляў, так і так, муж з'ехаў трынаццаць гадоў назад, кінуў жонку і дачку і не аб'яўляецца, я навучыў яго, як вырашыць справу з разводам і дзяжурна спытаў, ці падавала яна ў вышук? Не, аказваецца. Ёй хапіла пісьма. А на аліменты? Не. У тым не было нічога дзіўнага. Скандалы, рэўнасць, сцэны, папрокі, адсутнасць месяцамі — тут вы дакладна апісалі: Міхайлоўская не любіла Каралёва і была шчаслівая, калі ад яго пазбавілася. Не гэта мяне насцярожыла, і нават не тое, што за столькі часу чалавек прыслаў адно-адзінае пісьмо, а тое, як мог бацька за трынаццаць гадоў ні разу не адведаць родную дачку? Следчая інтуіцыя, вопыт, прадчуванне, нюх паляўнічага — словам, усё падказвала: нешта тут не так. Я з дзяцінства люблю розныя тайны, загадкі, недаказанасці...

— Гэта я заўважыў,— уставіў Рак, які слухаў і маленькімі глыткамі піў херас.

— ...адсюль і такая прафесія. Я адчуваў, што натрапіў на след. Тут, ведаеце, нічога не зробіш — калі што ўлезе ў галаву, пакуль не разблытаю, не будзе жыцця. І я пачаў цікавіцца гэтай гісторыяй. Прыехаў у мястэчка — дарэчы, дзякую, што займеў гонар быць у двух радках згаданы ў вашым творы! — папрасіў тое нямногае, што засталося пасля Каралёва: дакументы, фотакарткі, пасведчанне аб шлюбе. Пісьмо ў канверце. Пісьмо як пісьмо: «Ты дабілася свайго... праз твой невыносны характар... не шукай... прабач... некалі кахаў». Усё б нічога, каб яно не ляжала ў кнізе, вось гэтай.

Грыневіч разгарнуў «Чаромхавы чад».

— Кніга як кніга, падпісана, як звычайна аўтары падпісваюць іх на сваіх вечарынах і прэзентацыях. Аднак я — не ведаю чаму, не змог не звярнуць увагу, што ў вас з Каралёвым падобныя почыркі. Почыркі падобныя, а атрамант — розны. І тут яшчэ нічога такога: звычайнае супадзенне. Я па службе крыху знаёмы з графалогіяй,— хачу вам прызнацца, вельмі недакладная навука: у мяне ў самога ў залежнасці ад настрою ў адным слове бываюць абсалютна розныя напісанні адной і той жа літары,— і тым не менш, не крыўдуйце, я аддаваў пісьмо і кнігу на экспертызу, якая заключыла: почыркі розныя.

— Інакш і быць не магло,— азваўся з кутка Рак.

— Аднак гэта навяло мяне на думку, а што, калі ўсё ж пісьмо напісана не Каралёвым, а іншым чалавекам? Што, калі няшчасны раўнівец Каралёў паехаў, ды так нікуды і не даехаў? А можа, увогуле нікуды не ездзіў, ні ў якую Украіну? Ускладнялася справа тым, што напачатку Лена Міхайлоўская зусім не гарэла жаданнем памагаць мне. Яно і зразумела: нашто ёй узбуджаць рэўнасць яшчэ ў адным? Яна хацела забыць, вытравіць, выкрасліць гэта з біяграфіі. Не раз я даваў сабе слова кінуць усё. Але гісторыя ўжо захапіла мяне, не адпускала, зноў і зноў я да яе вяртаўся. Да таго ж афіцыйна ніхто ёю не цікавіўся, значыць, я мог займацца гэтым у сваё задавальненне, у вольны час. Зноў і зноў пачыналіся роздумы, прыкідкі. Калі ўсё так, як я мяркую, калі Каралёў не з’ехаў, а стаў чыёйсьці ахвярай — дык чыёй? Сабутэльнікі ці рабаўнікі не падрабляюць почыркі, ды не так ужо Каралёў і піў. Хутчэй за ўсё гэта чалавек неардынарны, хітры, разумны, з фантазіяй, з выдумкай...

— Добра, што я вас адразу перапытаў. І што была экспертыза. А то можна было падумаць, што вы мяне падазраеце.

— ...гэткі свайго роду «творца». А чым можна ўзяць творчага чалавека? Правільна — таксама творчасцю. Выбіць клін клінам. Трэба было знайсці іншага творчага чалавека. Так я спыніў свой выбар на вас, адзіным вядомым мне, ды і то завочна, пісьменніку. Я стаў самым адданым вашым прыхіль-

нікам. Я прачытаў пра вас усё, што толькі мог знайсці ў інтэрнэце і ў бібліятэцы, спрабуючы пазнаць ваш характар, хоць збольшага разабрацца, што вы за чалавек. А тут, на маё шчасце, як знарок — яго вялікасць выпадак: Асавец расказаў, што пазнаёміўся з штатным супрацоўнікам «Руслесу» Літавым, які жыве ў Беларусі два ці тры гады, памешаны на творчасці; а затым надзвычай дарэчы падвярнуўся Самусенка. Я зразумеў, што вось ён — знак, вось ён — шанц. Далей усё неяк само сабой пачало складвацца так, што лепш не прыдумаеш: з Ірмаю, з Літавым, з яго нібыта ўсемагутным братам, нібыта шматлікімі жонкамі, шафёрам, доктарам... Самае цікавае, што мне нікога не давялося асабліва ўгаворваць — усе, у тым ліку і Міхайлоўская, і Лю, ахвотна згадзіліся паўдзельнічаць у гэтай задумцы. Яны ўсе паверылі... і ахвотна з энтузіязмам згадзіліся прыняць удзел у гэтым.

Рак маўчаў і піў херас.

— Як толькі Літаў пабываў у вас, а потым расказаў пра сустрэчу — вось тут мяне і асяніла! Я зразумеў, што на правільным шляху. Я іншымі вачыма на ўсё зірнуў. Мне стала лягчэй. Усё ў галаве пачало пераварочвацца і наноў укладвацца. Астатняе вы ведаеце: Ірма, раўт, Лю... Пасля раўта я счакаў тыдзень, потым набраў вас. І тут такі падарунак — ваша аповесць...

— Я столькі чую пра гэтую аповесць! — нецярпліва ўсклікнуў Рак.— Скажыце нарэшце, што вы там вычыталі?

— Канечне, гэта ўсяго толькі версія, лёгкі эскіз, пунктір... Я магу памыляцца ў дэталях... Але ў цэлым вось што мы маем. Міхайлоўская часта ездзіла ў Мінск. Як вы далікатна заўважылі, яна не была феяю. Дапусцім, у Мінску яна, акрамя вас, яшчэ з кімсьці сустракалася. Пра гэта стала вядома Каралёву. Хутчэй за ўсё ён нават даведаўся, хто яго шчаслівы супернік — назавем яго так — і дзе ён жыве: сама Міхайлоўская ў запале магла сказаць. І вось пасля чарговага скандалу, у пачатку верасня 2004 года, Каралёў, як неаднойчы да гэтага рабіў, купляе білет ва Украіну да Оўруча. Але ў апошні момант раздумвае і перасаджваецца ў дызель, які вязе яго на Калінкавічы,

адкуль лёгка патрапіць у Мінск. Я раздабыў і вывучыў тагачасны расклад руху цягнікоў: дызель Славечна — Калінкавічы і пасажырскі цягнік Баранавічы — Жытомір праязджалі мястэчка ў адзін час. Не будзем забываць, Каралёў — чыгуначнік, таму ведаў гэтыя расклады як свае пяць пальцаў. Аднак галоўнае тут, што ў яго кішэні ляжыць білет ва Украіну, а ён як ні ў чым не бывала выходзіць на мінскім вакзале. Дапусцім, з вакзала ён едзе да шчаслівага суперніка і застае яго дома. Каралёў чалавек гарачы, неўтаймаваны, як усе раўніўцы, на ўзводзе, можа і выпіўшы. Адбываецца размова на падвышаных танах, з якой можа высвятліцца, што пра яго візіт сюды ніхто не ведае. Пакрысе размова перарастае ў пагрозы, пагрозы — у дзеянне. Цалкам можа быць, што шчаслівы супернік, абараняючыся, не разлічыў сілы, стукнуў ці штурхнуў Каралёва, але, як часта бывае пры такіх няшчасных выпадках, дастаткова чалавеку няўдала ўпасці, каб пацэліць скроняй у край стала ці патыліцай аб падлогу, каб усё закончылася трагічна. Само сабою афект, шок. Разам з тым у такія хвіліны мозг пачынае працаваць як ніколі востра. Ліхаманкава абчышчаюцца кішэні. Там пісьмо, там блакнот, там пашпарт з прапіскаю, а галоўнае — білет! Цяпер было вядома, куды ён накіроўваўся. План саспеў імгненна. Ніхто не ведае, што Каралёў у Мінску. Калі ў яго білет у Оўруч, дык туды яго і трэба даставіць; чалавек збіраўся ва Украіну — і заехаў ва Украіну, а калі там знік, можа і загінуў, дык і шукайце яго там! Не забудзем, што тады мяжа з Украінай была вельмі ўмоўная. Дапусцім, пад акном машына. Але аднаму, як ні круці, не справіцца, ды яшчэ калі, напрыклад, шосты паверх. Тут дарэчы падварочваецца сусед, які-небудзь наркаман-байкер. Памагае ў ліфце, памагае ў машыне. Вечар, хутчэй за ўсё нават ноч. Шанцавала ім неверагодна. Ніхто іх не спыніў. Даехалі да да Жалоні, а там развілка, а там — крыж пад ручнікамі. Гэта была бліскучая ідэя — схаваць цела на тэрыторыі іншай дзяржавы, ды яшчэ ў такім месцы, якое лічыцца сакральным! На другі дзень заставалася пазбавіцца ад ма-

шыны — на ёй маглі быць сляды, яшчэ праз тыдзень — ад адзінага сведкі, які вельмі падазрона разбіваецца на байку ад нібыта перадазіроўкі, а яшчэ праз тыдзень з Украіны прыходзіць Міхайлоўскай пісьмо, напісанае падобным да яе мужа почыркам...

На Рака страшна было глядзець. Вочы запаленыя, твар белы ад сашчэпленых моцна зубоў. З-пад расшпіленай да грудзей сарочкі выбіваліся курчавыя валасы.

— Хвілінку,— выціснуў ён.— Хто ж ён, гэты... супернік?

— Як хто?! — аж адкінуўся ў крэсле ад здзіўлення Грыневіч.— Вы! Вы, і ніхто больш.

Рак устаў, хутка падышоў да століка і грукнуў кулаком так, што ноўтбук падскочыў і дзынкнула лыжачка ад кавы аб сподак.

— Я папрашу! — крыкнуў ён здушана, затым вярнуўся назад і зноў сеў у крэсла.— Прабачце, у мяне слабыя нервы... Я не спаў, перажываў, многа думаў. Можа быць я няправільна вас зразумеў ці не дачуў: вы перад гэтым сказалі, што не падазраеце мяне...

— Я не дагаварыў. Гэта калі я ішоў да вас, былі падазрэнні. Цяпер гэта факт, аксіёма, стопрацэнтная ўпэўненасць. Сядзіце, калі ласка! Я не люблю, калі перада мною стаяць.

Гэты выкід энергіі, выпусканне пары, груканне па стале памаглі Раку — нібы нейкі нарыў прарваўся. Ён узяў сябе ў рукі.

— Я з самага пачатку западозрыў, што вы ненармальны,— сказаў ён.— Кідацца такімі абвінавачваннямі мне, заслужанаму, не самаму апошняму... Гэта ўжо, ведаеце, пераходзіць усе... Не падумайце, што я спалохаўся або разгубіўся. Выгнаць вас ці выклікаць міліцыю я паспею. У мяне толькі адно пытанне: нашто вы цягнулі столькі часу? Трэба было адразу мяне арыштоўваць, і ўсё.

— Ды ў тым і справа! Я, калі збіраўся да вас, сам амаль нічога не ведаў! Ні ў чым не быў упэўнены, ні на што не разлічваў, сумняваўся да апошняга. Самае большае, на што спадзяваўся,— на вусную гутарку. Скажу больш— я

ішоў сюды з надзеяй, хоць і слабай, што ўсё высветліцца і вы будзеце невінаваты. Я прагнуў апраўдаць вас.

— Што вам ад мяне трэба?

— Прызнання. Я хачу, каб вы прызналіся ў забойстве ўкраінца Каралёва Віктара. Прызнання вуснага, бо пісьмовае ўжо ёсць. Ваша аповесць практычна яўка з павіннай.

— Ніякая не яўка,— агрызнуўся Рак.

— Ну як жа. З першага абзаца, нават сказа, тут пакінута столькі слядоў, знакаў, расстаўлена столькі маякоў! Трэба толькі ісці па іх ад аднаго да другога...

— Лухта! Нічога падобнага. Тут выверана кожнае слова.

— Глядзіце самі. Першы абзац, нават першы сказ. Шосты паверх — значыць, выплывае ліфт. Стаяў *Volkswagen Passat* — але я, калі прыпаркоўваўся, ніякай старой машыны не бачыў, значыць, яна ў вас некалі была. Радня ва Украіне ў Енакіева — значыць, вы маглі паслаць адтуль пісьмо нібыта ад Каралёва. Кніга санетаў «Рушнікі на крыжах» — значыць, вы цікавіліся гэтым пытаннем і выдатна ведаеце, што крыжы — святое для палешукоў, ніхто ніколі не стане яго чапаць, бурыць, капаць пад ім...

Грыневіч зазірнуў у паперку:

— Сусед-наркаман, сын Самусенкі, падазрона разбіваецца, як вы пішаеце, на Галавасека, а гэта — адзінаццатага верасня, значыць, роўна праз тыдзень пасля знікнення Каралёва. Далей — вы выдатна апісваеце мястэчка, але дзесяцігадовай даўнасці! Пішаце пра вяз, а ад яго даўно толькі пень, згадваеце помнік Леніну, а яго гадоў дзесяць назад як забралі на рэстаўрацыю, так і не вярнулі. Вы апісваеце будынкі, якіх ужо няма, павароткі, якія даўно спрамленыя, апісваеце крыж, дзе мадзяры ў вайну пастралялі людзей, але цяпер, пасля дэмаркацыі, ён на ўкраінскай тэрыторыі!

— І што?

— Значыць, вы былі там роўна дзесяць гадоў назад, менавіта тады, калі загадкава знік Каралёў.

— З такім жа поспехам можна забіць у Гугл ключавыя словы, табе і выскачыць усё на гэтую тэму. Вы проста ведалі, што шукаць, таму і знаходзілі...

— Я ўжо маўчу пра мноства іншых дэталяў, якія вы шчодра рассыпалі на кожнай старонцы. Іх, праўда, да справы не падшыеш...

— Напрыклад?

— Напрыклад, чаму вы ўпадаеце ў ступар ад Кейстутаў, Ягайлаў, Вазаў, Сфорцаў? Ці не таму, што некаторыя з іх былі каралямі? І гэта нагадвала вам іншага Караля-Каралёва? Я ўжо маўчу, што гістарычная назва Ельска, бліз якога ўсё адбываецца,— Каралін...

— Выдатна. Апладзірую. Так можна ўзяць любы рэкламны буклет і даказаць, што яго складальнік — маньяк. Як дэтэктыў вы мяне расчаравалі. Але як чытач вы сапраўды ідэальны.

— Дзякую.

— А вы не дапускаеце, што Каралёў, ну, не ведаю, жывы і здаровы? А калі ў мяне і машыны ніколі не было? А калі ў Самусенкі адна дачка, і тая ў Парыжы?

— Я ж таксама не сядзеў склаўшы рукі. Я пасылаў запыты ў Оўруч і Жытомір, я нават ездзіў туды — у мяне там поўна знаёмых. Паднялі дакументы — так, жыў Каралёў, паехаў у Беларусь, ажаніўся з беларускаю, а назад не вярнуўся. Канцы губляюцца тут. Так што з бедным Каралёвым усё зразумела: і жыў грэшна, і памёр смешна, як кажуць у нашым мудрым народзе. Тое самае з машынай — не склала цяжкасці даведацца, што была яна ў вас, і згарэла ў пачатку верасня, роўна на другі дзень пасля знікнення Каралёва; як сказана ў вашай заяве, «хуліганы спалілі».

Праўда — я нічога не ведаў пра Юру Самусенку, і мне наўрад ці ўдасца даказаць вашую прамую віну ў яго смерці. Думаю, ён пачаў вас шантажыраваць, вы накачалі яго наркотыкамі, ён сеў на байк і загінуў. Я ўжо навучыўся разблытваць вашыя сляды, разумець вашае мысленне, чытаць між радкоў і адгадваць падтэкст. Нездарма на першых старонках вы згадваеце, што былі хворыя ў вас бацькі. Можна дапусціць, што вы набывалі для іх у аптэцы лекі, у тым ліку і наркатычныя. Пры дапамозе нашага добрага знаёмага доктара Шнэйдара я паспрабую разабрацца і з гэтым.

— Вашай упартасці можна пазайздросціць,— з крывой усмешкай прамовіў Рак.— Пакуль я гуляў, вы, канечне, скапіравалі тэкст — і што? Вы з ім збіраецеся ісці ў суд? Калі адкінуць пахвальны намер дабіцца справядлівасці, што ў вас ёсць? Мастацкі твор! Ды любы, нават наш суд падыме на смех чалавека, які прынясе яму ў якасці доказу аповесць, ды яшчэ па-беларуску!

— Памыляецеся. Не мастацкі твор, а высновы, зробленыя з мастацкага твора. І ў суд я прыду не з тэкстам. Я ўжо казаў, што ў мяне паўсюль сябры, а ва Украіне больш чым дзе. З іх дапамогай я даб'юся дазволу на эксгумацыю. І калі я пачну капаць, у пераносным і ў прамым сэнсе, і пад крыжам з ручніком знайду цела, пры ім абавязкова знойдуцца ўлікі, якія пакажуць, што ахвяра была ў Мінску...

— Жэтончык на мінскае метро? — падказаў Рак.

— Ну, жэтона пры ім дакладна не будзе. Вось гэтага,— сказаў Грыневіч, выцягваючы з кішэні жэтон за шаўковую нітку,— з выявай плошчы Якуба Коласа на рэверсе. Прашу прабачэння, што ўзяў без дазволу... З жэтона ўсё і пачалося. Ён мяне і вывеў. Вы сказалі Літаву, што гэта калекцыйны жэтон, такіх толькі восем і выпускаліся яны толькі адзін раз, да дваццацігоддзя мінскага метро, і адразу ж — што трымаеце яго як памяць пра дзяўчыну. Але ў аповесці вы сустракаліся з Міхайлоўскай у двухтысячным годзе, а дваццацігоддзе метро было ў дзве тысячы чацвёртым! Акурат у год знікнення Каралёва! Так у мяне адкрыліся вочы. Я зразумеў, што ён быў у Мінску, быў у вас, і шукаць яго сляды трэба тут. Тое, што ніякі вы не калекцыянер, даказвае і тое, што вы пасля раўта нават не забралі — пакінулі на стале падораныя вам сем жэтонаў. Значыць, вам важны толькі гэты адзін. Які дастаўся вам, калі вы абчышчалі кішэні Каралёва.

Рак хацеў усміхацца, але дрыготкія вусны выдавалі яго.

— Нашто б я трымаў такую небяспечную ўліку... Я б даўно пазбавіўся ад яе...

— У крыміналістыцы ёсць тэрмін — сентыментальнасць злачынцы. Пакінуць сабе якуюсьці рэч, своеасаблівы амулет, які б вярэдзіў памяць і адначова надаваў

змрочнага гонару: ах, які я спрытны, хітры, разумны! — здзейсніў злачынства, падчысціў сляды, а вось напамін пра яго — перад усіхнімі вачамі!

XXVI

Раптам шчоўкнула нешта, трэснула, настаў змрок, толькі бляклае святло з двара ды ад манітора ноўтбука.

— Што такое?— усклікнуў, усхапіўшыся Грыневіч.— Што гэта?!

— Лямпачка перагарэла.

— Не падыходзьце!

— Тады самі ўключыце настольную.

Грыневіч уключыў — і ўсё памянялася. Калі гарэла вялікае святло, ён, блізарука прыгорблены за столікам перад ноўтбукам, здаваўся меншым, а Рак у кутку ў крэсле — большым; цяпер, калі ўключылася настольная лямпа, Грыневіч як бы падрос, а Рак наадварот — скурчыўся і паменшаў. Ён яўна пачынаў здавацца. Чырвоны твар, пот, беганне вачамі. У дрыготкіх пальцах ён нервова круціў карабок запалак. Ад яго бравады нічога не засталося.

— Вы так і не спыталі,— сказаў Грыневіч,— як я мог, падазраючы вас, дапусціць да вас Лю?

— Дык цяпер пытаю,— сіпла азваўся Рак.

— Па-першае, я быў усю ноч побач. Потым — трывожная кнопка, аўтадазвон, усё такое... Ад чаго мне цяпер сорамна.

— Чаму? — з цікавасцю падняў галаву Рак.

— Вядома, я і раней здагадваўся, што вы з Міхайлоўскай не проста выпадковыя знаёмыя. Акрамя таго падазрона было, што Лю так лёгка згадзілася. Усе сумненні зніклі, як толькі я пачаў чытаць аповесць. Я разумею ваша жаданне вывесці сябе гэткім мачо, суперменам... Але пры ўсёй павазе да вашых мінулых заслуг, не ў крыўду сказана,— каб так, у першы ж вечар, на лавачцы... Я не ўпэўнены, што гэтая рамантычная лавачка ўвогуле існавала. Як не магу паверыць, што ў вас не было кватэры, а нават калі і не было, дык у Мінску з вашымі сябрамі не праблема яе

знайсці. Вы былі знаёмыя з Міхайлоўскай раней. І хутчэй за ўсё яна ездзіла ў Мінск ні на якія курсы, а да вас.

— І што з таго?

— А тое, што пад вершам «Чаромхавы чад» указана не дата вашай нібыта першай і апошняй сустрэчы, як вы запэўніваеце ў аповесці, а дата напісання верша! Які напісаны пазней, значна пазней за цвіценне чаромхі — скажам, месяцаў на дзевяць пазней. Як вы ні блыталіся ў аповесці з гадамі Лю, не цяжка падлічыць, што ёй не сямнаццаць, а васямнаццаць, а калі яшчэ мець на ўвазе, што яна Віктараўна, а вы з Каралёвым цёзкі... Няма ніякага сумнення — вы, і ніхто больш, бацька Лю!

— Гэта сакрэт Полішынеля,— Рак паспрабаваў вымучыць з сябе нейкае падабенства ўсмешкі.— Я асабліва і не хаваў...

— Як не хавалі? — строга падняў на яго вочы Грыневіч.— А тэлефонны званок у самым пачатку? Праўда, далей вы далі маху: калі Лю падслухоўвае кавалачак тэлефоннай размовы ў шостай частцы, там крыху іншыя словы, чым у вашай перадачы напачатку, там праскоквае: «не атрымаецца — нічога страшнага». Думаю, Міхайлоўская званіла вам з мэтай папярэдзіць, сказаць, што вамі зацікавіліся, ну і акрамя таго сапраўды папрасіць дапамогі пры здачы творчага конкурсу, бо рэдактарская справа — ваша прамая спецыяльнасць.

— Я думаў, гэта само сабой зразумела...

— Тады зусім іншая карціна, тады ўсё выцягваецца ў лагічны ланцуг, тады зразумела, з-за чаго былі паміж Міхайлоўскай і Каралёвым праблемы, скандалы, сваркі і рэўнасць; зразумела таксама, што менавіта магла сказаць Лена ў запале Каралёву. Калі ён даведаўся, што дачка не яго, ды даведаўся, чыя яна — больш яго нічога не трымала, і ён выправіўся на разборкі з шчаслівым супернікам.

— Вы многа ведаеце.

— Многа, але не ўсё. Пра некаторыя рэчы я магу толькі здагадвацца. Напрыклад, чаму вы не ажаніліся з Міхайлоўскай, якая да гэтага часу кахае вас — бо, як пафасна вы

пішаце, літаратура, творчая незалежнасць для вас важней за ўсё на свеце. Магу здагадвацца, адкуль абыякавасць Лены да Каралёва, не спагнанне з яго аліментаў — бо вы, сапраўдны бацька, памагалі ёй матэрыяльна. Здагадваюся, што вы, і ніхто іншы, ездзіў з дачкой у Прыбалтыку, калі ёй было трынаццаць, гэта вы выслухоўвалі яе замежныя прыгоды і фантазіі (уся ў бацьку!) — у вас ёсць цыкл вершаў «Вентспілскія рыбакі», «Аб чым маўчыш, Яніс Яўнсудрабінь»... Здагадваюся таксама,— Грыневіч кінуў хуткі позірк, Рак механічна сцягнуў на грудзях сарочку, з-пад якой курчавіліся валасы,— што гэта вы, а ніякі не сябар, вярталіся з Лю полем з возера ў мястэчка...

— Ад вас нічога не схаваеш.

— Парадокс у тым, што і Міхайлоўская, і Лю, і ўсе, хто прымаў у гэтым удзел, уключаючы Асаўца, і цяпер у шчаслівым няведанні адносна вас. Яны шчыра вераць, што вы добры маг, чарадзей, які паможа адшукаць сапраўднага злачынцу. Я не жорсткі, і прызнаюся: самая непрыемная мая місія будзе аб'явіць ім, хто вы на самой справе.

Рак падняў галаву. Ноткі, ці, лепш сказаць, рэшткі гонару прарэзаліся ў яго голасе:

— І ў чым тады ваша заслуга? Калі я сам сабе выкапаў яму сваёй аповесцю? Вы толькі вывудзілі ўсё гатовае. Гэтак любы б змог.

— Нашто ж вы пісалі? — лагічна заўважыў Грыневіч.— Не трэба было пісаць.

— Менавіта! — ухапіўся Рак за саламіну.— Калі чалавек вінаваты, хіба ён так будзе падстаўляцца? Ён зашпіліцца на ўсе гузікі, залезе ў ракавіну і ніхто за кіламетр да яго не наблізіцца!

— Не абавязкова. Злодзей часта гучней за ўсіх крычыць «лаві злодзея».

Калі ён разумны і хітры, ён, наадварот, пастараецца скарыстацца магчымасцю самому прыняць удзел у расследаванні, каб ведаць, на якой яно стадыі, звядзе ўсё да балбатні, несур'ёзнасці, буфанады — каб заблытаць сляды.

— Толькі не я. Я напісаў бы інакш, знайшоў бы іншую тэму...

— Самаўпэўненасць вас і пагубіла. Вы не сумняваліся ў сваёй сіле, пісалі, будучы ўпэўненым, што ніхто не разблытае, што як бы супраць вас ні гулялі, вы ўсё адно пераможаце.

Рак ламаў у пальцах адну за адной запалкі.

— Што вы мне параіце? — спытаў ён ціха.

— Тое, што і заўсёды раіцца ў такіх выпадках — прызнанне. Яно ў вас у прынцыпе ёсць, застаецца аформіць яго афіцыйна. І тады вам усе прэферэнцыі: супрацоўніцтва са следствам, даўнасць тэрміну, афект, той важнейшы факт, што без вас не раскрылася б (пра аповесць я згодны прамаўчаць). Тым больш які вы забойца — так, няшчасны выпадак, неабходная абарона. Мажа, я старамодны, але я нават у наш час веру, што злачынства і талент несумяшчальныя; я проста ўпэўнены, што вы рана ці позна самі прызналіся б, і без мяне.

— А другі варыянт?

— Ваша ўпартасць і маўчанне. Тады я вымушаны буду даць гэтай гісторыі самую шырокую агалоску. Вы не ўлічылі, што я — не з дзяржаўных органаў, мне зусім неабавязкова трымаць дэталі следства ў тайне. А значыць, я магу выкласці ўсё ў адкрыты доступ, ды намякнуць, хто падазраваны, ды са сваімі каментарамі... І калі пойдзе грамадскі розгалас, калі вашай гісторыяй зацікавіцца сапраўднае афіцыйнае следства, калі на маім месцы апынецца і, закасаўшы рукавы, возьмецца за справу тупы выканаўца — вам не пазайздросціш. Вы, канечне, наўрад ці ведаеце, што генетычная экспертыза чалавечых парэшткаў ніколі не дае стопрацэнтовай гарантыі. А гэта значыць, што пры жаданні практычна любое цела, знойдзенае пад любым крыжам, можна павесіць на любога чалавека, і даказаць нешта пасля такой аповесці будзе ой як нялёгка. Але нават калі дакажацца, вашае жыццё за гэты час ператворыцца ў пекла. Я ўжо маўчу пра рэпутацыю, кар’еру, добрае імя! Усё будзе выпэцкана, паламана, знішчана.

— Нашто вам гэта?

— Дзіўнае пытанне! Спытайце ў доктара Шнэйдара, нашто ён выразае ракавыя пухліны. Бо я сумленны чалавек, афіцэр, грамадзянін. Бо гэта мой доўг. Бо злачынца павінен сядзець у турме, а не атрымліваць асалоду ад жыцця. Бо я абсалютна не згодзен з вашай тырадай пра несумленнага следчага і несправядлівы суд, я лічу, што ўсё роўна наадварот — следчыя ў нас сумленныя, а суд незалежны і непадкупны.

— Што ж... Я не чакаў, што вы справіцеся. Я вас недаацаніў. Аддаю вам належнае. Вы годны супернік...

Рак падняўся.

— Не падыходзьце! — усклікнуў Грыневіч, апусціў руку ў заплечнік і назад не выцягнуў.— Не трэба набліжацца! Дарэчы, ледзь не забыў — можа, вы хочаце мяне заваліць, як няшчаснага Каралёва, і вывезці на маёй машыне да якога-небудзь крыжа ці проста скінуць у раку? Адразу папярэджваю — я супраць. Дзясятак чалавек у гэты момант ведаюць, дзе я і з кім.

— Чакайце!..

— Не трэба мяне праводзіць, я ведаю дарогу. Да сустрэчы, спадзяюся, да хуткай.

— Ды паслухайце, упарты вы чалавек!..

Але гэты дзівак не стаў нават слухаць: ці то быў настолькі ўпэўнены ў непарушнасці сваёй версіі, ці сапраўды проста спалохаўся — уночы, адзін на адзін з забойцам; заспяшаўся, замітусіўся і, нягледзячы на хворую нагу, так хутка выскачыў з кватэры, што нават дзверы за ім не стукнулі,— знік, растаў у паветры, як і не было яго. Рак не паспеў нічога сказаць. А ў яго на канец была падрыхтавана цэлая прамова, у якой ён збіраўся і прызнацца, і пакаяцца. Калі паўгода назад яму патэлефанавала Лю і папярэдзіла, што ім пачалі цікавіцца, ён уразіўся, як гэта супала з яго намерам паспрабаваць свае сілы ў прозе.

«Уяўляеш: гэты мамін новы, гэты Асавец, здагадваецца, што маці не забыла цябе, кахае па-ранейшаму, і месца не знаходзіць ад рэўнасці. Мала ёй было аднаго такога.

Ён яшчэ горшы за бяспутнага Каралёва. Як яна будзе з ім жыць? Ён яе даканае сваім занудствам, падазронасцю, упіканнямі — кшталту ашчасліviў яе. А яшчэ, здаецца, ён усур'ёз забраў сабе ў галаву, што шалапутны Каралёў не з'ехаў, а з ім здарылася няшчасце, яго забілі; ды яшчэ падключыў свайго сябра з Мінска, такога ж, як сам, які ўсё вынюхвае, выпытвае — як на допыце або на дэтэктары хлусні. Са мной таксама паспрабаваў, але ты ж ведаеш, на мне дзе сядзеш, там і злезеш. Ён цябе падазрае, гэта проста дзіка! Ён бачыў падпісаную табой кніжку, у якой ляжала пісьмо. Вакол гэтай кніжкі ўсё і круціцца. Так што будзь асцярожны».

«Цяпер разумею,— усміхнуўся ён,— чаму ўсе так вакол мяне забегалі, пачалі абходжваць, апрацоўваць з усіх бакоў. Дарэчы, а дзе бяспутны Каралёў?»

«Якая розніца? Маці ён не піша, а мне было пару вестак, апошняя па і-мэйле, на Новы год. Хваліўся, што ваяваў на баку ДНР, потым на баку ЗСУ, цяпер жыве ў Мадрыдзе, кветкамі гандлюе, возіць з Эквадора на самалёце. А — яшчэ падзяліўся радасцю, што збылася яго мара: нарэшце памяняў рускі канчатак прозвішча на ўкраінскі. Нібы мне гэта так важна ведаць!»

«І ты не сказала ім пра пісьмо?»

«Я яго адразу ж выдаліла».

«І маці не ведае?»

«Нашто мне яе лішні раз расстройваць. Дык што, паможаш? Прыдумай што-небудзь, ты ж пісьменнік. Ты можаш паставіць на месца гэтага надзьмутага зануду, каб ён прыцішэў? Каб маці пабачыла яго сапраўднае аблічча?»

«Трэба падумаць»,— сказаў ён.

Тым жа вечарам ён пакалупаўся ў камп'ютары, шукаючы, што важнага адбывалася ў Мінску за апошнія 10—15 гадоў; прапусціў палітыку, усе гэтыя нейкія некуды выбары, нейкія рэферэндумы пра нейкае пажыццёвае кіраванне — усё было да моташнасці нецікавае, а самае галоўнае — да імгнення часовае. Зацікавіла яго толькі такая інфармацыя: «На заўвагу калекцыянерам! У продаж паступілі сто тысяч юбілейных жэтонаў... ад

звычайных адрозніваюцца выявай адной з васьмі станцый метро, уведзеных у эксплуатацыю ў 1984 годзе... каштуюць юбілейныя жэтоны столькі ж, колькі звычайныя...» Вось гэта было ўжо нешта. Жэтон на метро мог аказацца больш даўгавечным за любую ўладу. Ужо разумеючы, што знайшоў, што хацеў, адчуваючы прыемны сверб творчасці, у той жа вечар даў на «Куфры» абвестку, а ў абед наступнага дня сустрэўся з сухенькім мінскім дзядком-інтэлігентам, канечне ж, з бародкай і ў акулярах, змоўніцкі выгляд якога надаваў гэтай аперацыі куплі-продажу звычайнага жэтона амаль крымінальную таямнічасць.

Прыманка была знойдзена. Ён пазваніў Лю і папрасіў прывезці яго падпісаную кнігу і пісьмо Каралёва, пажадана з канвертам.

«Што ты прыдумаў?»

«Адну гісторыю».

«І яна паможа табе даказаць сваю невінаватасць?»

«Наадварот,— усміхнуўшыся, адказаў ён.— Я не збіраюся нічога даказваць і ні ў чым апраўдвацца. Я сам працягну рукі, каб іх звязалі».

«Як гэта?»

«Часта на паляванні звер, ліса ці кабан, не кажучы пра зайца, уцякаючы ад сабакі, з усіх сіл ляціць уперад, каб адарвацца як мага далей, затым рэзка разварочваецца і бяжыць па сваім следзе насустрач сабаку, пасля чаго робіць саскок. Зразумела, сабака ідзе па тым следзе, які мацней пахне, пасля, канечне, вяртаецца і знаходзіць развілку, але час страчаны. Я паспрабую здвоіць след, сам пабягу насустрач».

«Глядзі не пападзіся».

Ён узяў з запасу чысты экзэмпляр зборніка «Чаромхавы чад», зрабіў такі самы, як і на старой кнізе, надпіс — больш-менш почыркам Каралёва, не надта пільнуючыся дакладнасці, і аддаў Лю. Атрымалася, што пісьмо было сапраўднае, а яго ўласная кніга з подпісам — падробка.

«Цяпер пастаў кніжку з пісьмом на паліцу».

«І ўсё?» — недаверліва спытала яна.

«Усё. Калі гэты Пінкертон сапраўды такі настырны і ўедлівы, як ты расказваеш, калі ён не ведае пра і-мэйл, калі ў ім ёсць сапраўдная творчая жылка — ён заўважыць падабенства почыркаў, супаставіць даты і пападзецца».

«А калі не?»

«Тады ён не варты, каб яму давалі ўвагу».

«Скажы, а на маці ніяк гэта не адаб’ецца, такія махінацыі?» — спытала яна.

Ён насупіўся:

«Маці другім разам хай лепш выбірае сваіх мужчын».

«Нічога гэтага не было б, калі б ты жыў з намі. Як можна жыць адной літаратурай? Памяняць родных людзей на асадку, ноўтбук і кавалак сшытай паперы — кнігу?»

«Ну-ну,— яшчэ больш насупіўся ён.— Мы неаднойчы на гэтую тэму гаварылі, яна не абмяркоўваецца».

Вось што прыблізна падрыхтаваў на канец Рак, у гэтым хацеў прызнацца і за гэта збіраўся папрасіць прабачэння, бо мэта ў Грыневіча пры ўсім пры тым была высакародная — устанаўленне справядлівасці, у той час як у яго, Рака, сумніўная — розыгрыш, гульня, падман.

Напісаць аповесць яму было няцяжка. Пікантнасць сітуацыі была яшчэ і ў тым, што Грыневіч, сам паляўнічы, папаўся, пабег па тым следзе, які мацней пахне. Шкада яго, канечне, але раз такі гарачы, нецярплівы — хай, будзе навука: не ўсяму ж сказанаму і напісанаму трэба верыць. Ды і не гэта было галоўнае. Справа не ў педантычным, уедлівым, упартым і ўпёртым, але наіўным і па-міліцэйску праставатым Грыневічы, які, плетучы павуцінне, растаўляючы сілкі, сам у іх ублытаўся — зразумела, што з гэтым хутка разбяруцца, як высветляць і тое, што юбілейныя жэтоны выпускаліся не да дваццацігоддзя, а да трыццацігоддзя метро, а не разбяруцца, тым лепш: сваёй няўрымслівай дзейнасцю Грыневіч толькі створыць вакол гісторыі ажыятаж, а аповесць атрымае бясплатную рэкламу, прычым скандальную, а значыць, самую надзейную.

Цяпер гэта было няважна. А важна, што ён выканаў абяцанне, дадзенае дачцэ. Яго дэбют, яго першы блін не

атрымаўся комам. Яму паверылі. Ён дабіўся свайго (і цяпер з усмешкай падумаў, што ў свеце толькі дзве сапраўдныя непрыемнасці: першая — не дабіцца чаго хацеў, другая — дабіцца чаго хацеў).

Тэма жэтона была выкарыстана. Больш яна яго не цікавіла. Ён развітваўся са сваімі героямі, але ведаў, што нікуды яны ад яго не дзенуцца. Ён ужо адчуваў поўную сваю ўладу над імі. Пішучы, забаўляючыся, гуляючы сам з сабою ў шахматы, ён навучыўся ажыўляць людзей, мог па першым жаданні адпраўляць іх у нябыт і гэтак сама лёгка вяртаць назад. Гэта было так нова, цікава, незвычайна, захапляльна — улада творцы над сваімі героямі! Больш за тое — нешта падказвала яму, што гэта і ёсць адзіная ў свеце сапраўдная ўлада, хаця б таму, што яна самадастатковая, ёй нічога не пагражае: ні выбары, ні рэферэндумы, ні путчы з рэвалюцыямі, яе ніхто ніколі ні пры якіх абставінах не адбярэ, ды і прэтэндаваць на яе наўрад ці будзе.

Спаць не хацелася. Ён зграб са стала жэтон на шнурку, падышоў да акна, шырэй расчыніў створкі. Ноч — цёплая, летняя, ліпеньская ўлілася разам з пахамі і гукамі. Знізу ліхтар падсвечваў ярка-зялёную, аж да салатавай, лістоту дрэваў. Зверху зоры сеялі сваё падманнае святло. Ён размахнуўся, зашпурнуў у цемру жэтон, дачакаўся, пакуль ён прашамаціць у лістоце і ціха шпокне, затым стаяў, поўны адчування гэтай раней няведамай улады, прагна дыхаў, глядзеў угору — і яму здавалася, што дом разам з лоджыяй і з ім плыве, як касмічны карабель, падымаючыся ўсё вышэй, усё далей у гэтае глыбокае, мяккае, засланае зорамі аксамітна-чорнае неба.

2019 г.

ЗМЕСТ

Літаратурна-мастацкае выданне

ФЕДАРЭНКА Андрэй Міхайлавіч

ЖЭТОН НА МЕТРО

Раман

Рэдактар *В. А. Шніп*
Мастацкі рэдактар *М. Ю. Дайлідаў*
Тэхнічны рэдактар *В. Ю. Серчанка*
Стылістычны рэдактар *Н. В. Філіповіч*

16+

Падпісана да друку 17.02.2020. Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Умоўн. друк. арк. 11,0. Улік.-выд. арк. 9,14.
Тыраж 1000 экз. Заказ

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр-т Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня “Перамога”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.